Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

26 ВЕРАСНЯ 2007 г.
СЕРАДА
№ 183 (26048)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Б'ЕЦЦА СЭРЦА

Увага: «прамая лінія»

Званіце, калі ласка, нашаму чарговаму госцю — галоўнаму кардыёлагу Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, доктару медыцынскіх навук, прафесару 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Наталлі Паўлаўне МІЦЬКОЎСКАЙ. «Прамая лінія» адбудзецца ў пятніцу, 28 верасня, з 15.00 да 16.30 па нумарах: 8 (017) 292-38-21 і 292-38-92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287-18-29 (Святлане Барысенка) і 287-18-36 (Вользе Шаўко).

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ НЕ БУДЗЕ ДАПУШЧАНА НІЯКІХ АБВАЛАЎ»

Аб гэтым заявіў 25 верасня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з дэпутатам Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Генадзем Селязнёвым.

На сустрэчы абмеркаваны шырокі спектр пытанняў беларуска-расійскіх адносінаў. Размова ішла, у прыватнасці, аб эканамічным развіцці Беларусі ва ўмовах выдзялення дадатковых сродкаў на аплату энергарэсурсаў. У сувязі з гэтым Прэзідэнт адзначыў: «Сітуацыя ў рэспубліцы нармальная, ідзе актыўны пошук шляхоў зніжэння энергазатрат у эканоміцы». Пры гэтым апора робіцца на ўласныя сілы. Аляксандр Лукашэнка чарговы раз падкрэсліў зацікаўленасць Беларусі ў пабудове Саюзнай дзяржавы. Існуючыя цяпер пэўныя складанасці ва ўзаемаадносінах дзвюх краін кіраўнік дзяржавы лічыць праблемамі часовага характару. Пакуль не ўзгоднены тэрміны правядзення пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы. Паводле слоў Генадзя Селязнёва, яны вызначацца толькі пасля папярэдняга абмеркавання прэзідэнтамі дзвюх краін пераліку тэм, якія могуць увайсці ў парадак дня ВДС.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Да 2010 года плануецца стварыць 124 новыя прадпрыемствы

Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 24 верасня далажыў прэм'ер-міністр Сяргей СІДОРСКІ.

Аляксандр Лукашэнка быў праінфармаваны аб інвестыцыйнай, інавацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы. Размова, у прыватнасці, ішла аб тэхнічным пераазнашчэнні беларускіх прадпрыемстваў. Усяго праграмай інавацыйнага развіцця Беларусі да 2010 года прадугледжваецца рэалізацыя 600 праектаў па мадэрнізацыі прадпрыемстваў на аснове сучасных тэхналогій, будаўніцтва 124 новых прадпрыемстваў (яшчэ 3 месяцы таму планавалася стварэнне 100).

У студзені—жніўні 2007 года ў народнай гаспадарцы Беларусі захавана станоўчая дынаміка вытворчай і інвестыцыйнай дзейнасці ў ключавых галінах эканомікі. Забяспечана дасягненне 14 з 19 важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2007 год. У прамысловасці за 8 месяцаў выпушчана прадукцыі на 7,7 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд 2006 года. У параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года ўвод у дзеянне жылля павялічыўся на 283 тыс. кв.м, або на 11,6 працэнта.

Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва за 8 месяцаў гэтага года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2006 года павялічыліся на 16,4 працэнта пры прагнозе росту на год на 7,5—8,5 працэнта.

Аляксандр Лукашэнка асабліва цікавіўся развіццём прадпрыемстваў у малых і сярэдніх гарадах рэспублікі. Так, прэм'ер-міністр паведаміў, што ў Бярозе праз месяц будзе пачата вытворчасць лакіраванай бляхі. Сяргей Сідорскі таксама паведаміў кіраўніку дзяржавы аб ходзе будаўніцтва завода па вытворчасці газетнай паперы ў Шклове.

Абмяркоўвалася таксама праграма энергетычнай бяспекі краіны. Кіраўніку дзяржавы даложана аб будаўніцтве новых ЦЭЦ, якія працуюць на мясцовых відах паліва, у малых і сярэдніх гарадах. Такія станцыі ўжо створаны ў Бабруйску, Асіповічах, Вілейцы. У прыватнасці, Вілейская ЦЭЦ працуе на драўнянай шчэпцы, у выніку спальвання якой атрымліваюць танную энергію. У бліжэйшы час плануецца пачаць будаўніцтва ЦЭЦ на мясцовых відах паліва ў Пружанах. Усяго да 2010 года ў краіне прадугледжваецца пабудаваць 10 такіх станцый. Акрамя таго, Сяргей Сідорскі адзначыў, што ў гэтым годзе ў шэрагу дзяржаў не хапае збожжа ў сувязі з дрэнным ураджаем. «Да мяне звярнуўся прэм'ер-міністр Малдовы з просьбай аказаць падтрымку ў сувязі з невысокім ураджаем», — сказаў ён. Прэзідэнт даў даручэнне ўраду аказаць дапамогу Малдове бульбай і збожжам.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Датэрміноўшчыкі ў «звязцы» са стажам?

У Беларусі плануецца павялічваць колькасць малых аддаленых вёсак, дзе існуе магчымасць атрымлівць сацыяльныя паслугі дома. Як заўважыла падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА, пакуль сацыяльныя работнікі рэальна могуць наведваць 51 працэнт такіх населеных пунктаў.

Сёння ў Беларусі пражывае 2,5 млн пенсіянераў, пры гэтым у нас налічваецца 691 доўгажыхар — асобаў, якія дасягнулі 100-гадовага ўзросту. Апроч таго, узрост ад 90 да 99 гадоў маюць 18 661 грамадзянін краіны, і, дарэчы, восем чалавек з іх яшчэ працягваюць працаваць.

Доля састарэлых грамадзян Беларусі павялічваецца больш хутка, чым доля асобаў у працаздольным узросце. Як паведаміла Марыяна Шчоткіна, ужо зараз узрост ад 60 гадоў і вышэй маюць амаль 14 працэнтаў грамадзян нашай краіны, прычым гэты паказчык будзе ўзрастаць і надалей. Тым часам павелічэнне ўдзельнай вагі асобаў у паважным узросце вядзе да павышэння дзяржаўных выдаткаў на сацыяльную падтрымку. Калі пры долі пажылога насельніцтва ў 10 працэнтаў выдаткі толькі на пенсійнае забеспячэнне складаюць тры працэнты валавога ўнутранага прадукту, то пры долі састарэлых да 20 працэнтаў гэтыя выдаткі ўзрастаюць у прагрэсіі — да 11 працэнтаў ВУП.

Менавіта гэтая акалічнасць, адзначыла Марыяна Шчоткіна, становіцца прычынай пошуку новых і больш танных відаў дапамогі. Некалькі апошніх гадоў стаўка тут робіцца на тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе на ўліку зараз знаходзіцца больш за 1,5 млн чалавек і ў тым ліку 152 тыс. цалкам адзінокіх пенсіянераў, 590 тыс. пенсіянераў, якія пражываюць асобна ад працаздольных сваякоў, а таксама 63 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Пры гэтым спіс відаў дапамогі ім працягвае пашырацца. Пры цэнтрах ідзе актыўнае стварэнне аддзяленняў дзённага знаходжання, тут з'яўляюцца «сацыяльныя таксі», гаспадарліковыя брыгады. Да канца 2010 года колькасць аддзяленняў кругласутачнага знаходжання пажылых людзей павінна павялічыцца з 37 да 70. Працягваецца стварэнне службы сядзелак — на сёння такія службы працуюць у 60 раёнах.

Адначасова, па-сапраўднаму запатрабаваний формай падтрымкі пажылых людзей застаецца абслугоўванне дома. Колькасць пенсіянераў і інвалідаў, якіх наведваюць сацыяльныя работнікі, працягвае ўзрастаць — у пачатку года яна складала амаль 77 тыс. чалавек. Выдаткі на абслугоўванне аднаго чалавека ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання тэрытарыяльнага цэнтра атрымліваюцца ў два разы, а пры абслугоўванні дома — практычна ў 10 разоў меншыя, чым выдаткі пры пражыванні ў доме-інтэрнаце. Дзейнасць цэнтраў дазваляе састарэлым як мага больш знаходзіцца дома, а ў сваю чаргу гэта павялічвае працягласць іх жыцця.

Ці не самай папулярнай тэмай гэтага года стала рэформа сацыяльных ільгот. Найбольшая колькасць заўваг тут паступае ад ветэранаў працы, якія з 17 снежня пазбавяцца магчымасці карыстацца 50-працэнтнай скідкай на праезд у грамадскім транспарце. Разам з тым, заўважыла Марыяна Шчоткіна, у асноўным падобныя звароты прыходзяць з гарадоў, дзе традыцыйна адзначаецца больш высокі ўзровень даходаў. Дарэчы, у будучыні падчас прадастаўлення той ці іншай дапамогі стане асноўным менавіта паказчык даходаў, і ў тым ліку на гэта скіраваны распрацаваны і накіраваны на разгляд урада праект указа «Аб адрасной сацыяльнай падтрымцы». Перш-наперш такая падтрымка будзе аказвацца малазабяспечаным. Плюс да таго, у рамках указа міністэрства павялічыць «планку даплат» па адрасной сацыяльнай дапамозе. Варта нагадаць, што зараз падобная планка вызначана ў 60 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму.

Паводле звестак міністэрства, у выніку апошняга перагляду з 1 верасня сярэдняя пенсія па ўзросту ў краіне складае 315,9 тыс. рублёў. І адказ на пытанне, ці варта чакаць яшчэ адной «прыбаўкі» да працоўных пенсій сёлета, галоўным чынам залежыць ад паказчыкаў росту заробкаў.

Да слова, нагадала Марыяна Шчоткіна, плануецца, што з 2006 па 2010 год памер намінальнай пенсіі ў краіне ўзрасце ўдвая, а рэальная, з улікам змянення цэн на тавары і паслугі, пенсія павялічыцца менш чым у 1,5 раза. Для выканання такіх задач спатрэбіцца пошук пэўных рэзерваў «унутры» самой пенсійнай сістэмы. Як падкрэсліла намеснік міністра, гаворкі аб павышэнні пенсійнага ўзросту сёння не ідзе. Аднак адным з такіх рэзерваў можа стаць Закон «Аб прафесійным пенсійным страхаванні», які мае на мэце перакласці аплату датэрміновых пенсій непасрэдна на прадпрыемствы і арганізацыі са шкоднымі ўмовамі працы.

Тым часам адным з найбольш спрэчных момантаў новага закона — намер увесці своеасаблівы мараторый на атрыманне датэрміновых пенсій для работнікаў, якія занятыя на шкодных умовах. Прынамсі, такую норму ўтрымлівае праект, што ўжо прайшоў першае чытанне ў парламенце.

Праўда, гэта норма можа быць зменена. Як зазначыла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валянціна Каралёва, хутчэй за ўсё, першапачатковы варыянт будзе датычыцца толькі датэрміноўшчыкаў, якія на момант прыняцця дакумента яшчэ не выпрацуюць палову спецыяльнага стажу. У той жа час датэрміноўшчыкі, якія ўжо маюць больш за 50 працэнтаў неабходнага стажу, захаваюць магчымасць атрымліваць разам з зарплатай «ільготную» пенсію. У прыватнасці, такая прапанова выносіцца зараз перад разглядам законапраекта ў другім чытанні.

Сяргей ГРЫБ.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Працяг тэмы чытайце на 6-й стар. у дадатку «Краіна здароўя».

Зусім нядаўна на Камароўскім рынку з'явілася гандлёвае месца, якое сваім афармленнем прыкметна адрозніваецца ад астатніх: упрыгожана загародкай, якая сплецена з пруткоў і галінак — пляцёнм, якім у далёкім мінулым у вёсцы былі домікі агароджаны. За прылаўкам моцны ружовашчокі мужчына з дагледжанай барадой прапануе венікі для лазні. Венікі вісяць і ляжаць на прылаўках — акуратна звязаныя — адзін у адзін, пахнуць знаёмымі бяроза-дубовымі водарамі.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ АДЛЮСТРОЎВАЕ КОШТ

1 кВт/г электраэнергіі «пацягне» ў 2010-м каля 10 цэнтаў...

У параўнанні з 2006 годам на працягу 5 наступных гадоў кошт электраэнергіі павялічвацца не павінен, адзначыў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім разглядаўся праект Дзяржаўнай комплекснай праграмы мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў Беларускай энергетычнай сістэмы, энергазберажэння і павелічэння долі выкарыстання ў рэспубліцы ўласных паліўна-энергетычных рэсурсаў да 2010 года, прэм'-ер-міністр Сяргей СІДОРСКІ.

Кіраўнік урада, у прыватнасці, паставіў задачу, каб у 2010 годзе кошт 1 кВт/г электраэнергіі не перавышаў 10 цэнтаў. І патлумачыў, што такія параметры кошту электраэнергіі павінны адлюстроўваць рэальную эфектыўнасць мерапрыемстваў, што прадугледжваюцца праграмай, кошт якой прапануецца павялічыць на 5 млрд долараў ЗША — да 9,9 млрд.

Новая рэдакцыя дзеючай праграмы распрацавана, паводле слоў міністра энергетыкі Аляксандра Азярца, у мэтах рэалізацыі палажэнняў Канцэпцыі энергабяспекі і Дырэктывы № 3.

Праект удакладненай праграмы прадугледжвае выкананне да 2010 года мерапрыемстваў, рэалізацыя якіх дазволіць павысіць узровень энергетычнай бяспекі краіны. Дасягнуць гэтага плануецца ў тым ліку за кошт мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў беларускай энергасістэмы і зніжэння іх зносу не менш чым на 14,9 працэнтнага пункта ў параўнанні з узроўнем 2005 года. Дарэчы, паводле слоў першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі, сёння знос асноўных фондаў беларускай энергасістэмы складае каля 64 працэнтаў. «Згодна з суседнімі класіфікацыяй, — удакладніў ён, — гэты паказчык — закрытычны ўзровень». За кошт жа рэалізацыі праграмы яго ўдасца істотна знізіць — да 40 працэнтаў. Першы віцэ-прэм'ер таксама заўважыў, што калі гэтага не рабіць, то кошт 1 кВт/г электраэнергіі да 2011 года можа скласці 15—16 цэнтаў замест тарыфу не больш як 10 цэнтаў. Акрамя таго, праектам праграмы прадугледжваецца, што энергаёмістасць ВУП да 2010 года ў параўнанні з 2005-м павінна знізіцца не менш як на 31 працэнт. А выкарыстанне мясцовых, нетрадыцыйных і ўзнаўляльных крыніц энергіі плануецца павялічыць да 20,5 працэнта ад агульных патрэб рэспублікі ў кацельна-пячным паліве.

Што датычыцца эканоміі, то, у прыватнасці, у беларускай энергасістэме да 2010 года плануецца зэканоміць 1,15 млн тон умоўнага паліва, у іншых галінах эканомікі — 6,4 млн тон. Як паведаміў Аляксандр Азярэц, у мадэрнізацыю асноўных вытворчых фондаў беларускай энергасістэмы мяркуецца інвеставаць 3,1 млрд долараў. Прычым тэхнічнае пераўзбраенне будзе праводзіцца з выкарыстаннем найноўшых высокаэфектыўных тэхналогій, у асноўным з прымяненнем парагазавага цыкла. У электраэнергетычнай галіне да 2010 года плануецца ўвесці 1140 МВт магутнасцяў. Адным з найважнейшых праектаў стане будаўніцтва парагазавага блока магутнасцю 450 МВт на Мінскай ЦЭЦ-5, увод якога дазволіць штогод эканоміць каля 330 тыс. тон умоўнага паліва. Будуць пабудаваны сучасныя парагазавыя блокі на мінскіх ЦЭЦ-3 і ЦЭЦ-2, праведзена мадэрнізацыя Бярозаўскай ГРЭС, Гродзенскай ЦЭЦ-2, іншых станцый. Да 2010 года, сказаў Аляксандр Азярэц, у краіне будзе пабудавана 16 мініЦЭЦ, у тым ліку 10 — на мясцовых відах паліва.

Як паведаміў прадстаўнікам СМІ Аляксандр Азярэц пасля пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, у праекце праграмы «ёсць пэўныя няроўнасці». А таму дакумент будзе дапрацоўвацца з улікам выказаных рэкамендацый.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Зямля «прыхватызаваная»

Парушэнні зямельнага заканадаўства на тэрыторыі Мінскай вобласці растуць з геаметрычнай прагрэсіяй

Нахабства некаторых нашых сугамадзян, якія любым спосабам хочуць займець кавалак зямлі, у прамым сэнсе не ведае межаў. Асаблівай папулярнасцю сярод такіх «прыхватызатараў» карыстаецца тэрыторыя паблізу сталіцы і на берагах вадаёмаў. Як адзначыў падчас сумеснай калегіі пракуратуры і абласнога Камітэта Дзяржкантролю (КДК) пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір, выяўлены і выпадкі спекуляцыі зямлёй. Напрыклад, нейкі грамадзянін А., карыстаючыся недасканаласцю заканадаўства і спагадлівасцю прадстаўнікоў мясцовай выканаўчай улады, набыў за бясцэнак паблізу Раўбіцкага вадасховішча шэсць зямельных участкаў агульнай плошчай 1,5 га. Праз некаторы час «землеўладальнік» перапрадаў «залатыя сотні» і атрымаў агромністы «навар». Пракуроры, вядома ж, не пакінулі гэты і іншыя факты парушэння зямельнага заканадаўства па-за ўвагай. За апошнія паўтара года пяць службовых асобаў сельскіх і раённых выканаўчых камітэтаў былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, 32 чыноўнікі атрымалі адміністрацыйнае пакаранне, 28 — дысцыплінарныя спагнанні. Усяго ж абласной пракуратурай было праведзена амаль 100 праверак выканання зямельнага заканадаўства. Аднак не ўсе чыноўнікі і «прыхватызатары зямлі» зрабілі належныя высновы пасля пракурорскіх папярэджванняў. Напрыклад, у тых жа Раўбічах толькі пасля некалькіх настойлівых патрабаванняў пракуроры грамадзяне І. і А. пачалі разбураць самавольна ўзведзеныя ў водаахоўнай зоне пабудовы.

Увогуле, каб высветліць, ці збіраюцца мясцовыя ўлады і парушальнікі зямельнага заканадаўства выпраўляць памылкі, супрацоўнікі абласной пракуратуры і КДК нядаўна правялі кантрольную праверку. Вынікі гэтай «рэвізіі» аказаліся несуцяшальнымі. Паводле слоў старшыні Камітэта Дзяржкантролю Мінскай вобласці Уладзіслава Цыдзіка, было выяўлена больш за 1870 парушэнняў зямельнага заканадаўства, у тым ліку факты самавольнага захопу ўчасткаў агульнай плошчай 9 га, 20 выпадкаў нямэтавага выкарыстання зямлі, на 152 га зямлі, адведзеных пад будаўніцтва жылля, больш за два гады не ступала нага чалавека. Кантралёры накіравалі ў суды і раённыя аддзелы ўнутраных спраў больш за 200 матэрыялаў праверак. Як падкрэсліў Уладзіслаў Цыдзік, вал парушэнняў зямельнага заканадаўства расце з геаметрычнай прагрэсіяй. І ў гэтым найперш вінаватыя прадстаўнікоў мясцовых уладаў, прыродаахоўных органаў і спецыялістаў па землеўпарадкаванню. Бо на іх вачах і з іх маўклівага дазволу незаконна захопліваюцца ўчасткі, узводзяцца катэджы і будуюцца хлявы, гаражы, лазні паблізу вадаёмаў. Паводле слоў прадстаўніка КДК, калі не спыніць нахабных захопнікаў зямлі, то звычайнаму чалавеку ў хуткім часе немагчыма будзе нават падысці да ракі ці возера.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

НЕЛЕГАЛА АДАСЛАЛІ НА РАДЗІМУ

«Звязда» паведамляла, як у Брэсце быў затрыманы дваццацігадовы расіянін пры спробе нелегальна перасячы мяжу. Для гэтага малады чалавек задумаў зрабіць падкоп пад агароджу з калючага дроту ...звычайным алюмініевым кубкам. Свой учынак ён тлумачыў жаданнем хутчэй сустрэцца з каханай дзяўчынай, якая жыве ў Германіі. Праваахоўныя органы не выявілі фактаў, якія б сведчылі, што гора-рамантык мае дачыненне да злачыннай дзейнасці. І нелегал быў адпраўлены ў Расію.

Яна СВЕТАВА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.09.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 027,62
1 латвійскі лат	4 295,85
1 літоўскі літ	876,77
1 чэшская крона	109,93
1 польскі злоты	803,50
1 расійскі рубель	85,85
1 украінская грыўня	427,30

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,0315
10 UAH	49,7268
1000 BYR	11,6365
EUR	35,2193

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.09.2007 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падрыхтавана на падставе «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у падшыў па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-6901.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 25 верасня падпісаў Указ № 450 «Аб устанаўленні даплат за вучоныя ступені і званні»

Дакументам значна павышаецца памер даплат за вучоныя ступені. За вучоныя званні ўстанаўліваюцца даплаты на аснове выканання прынцыпу ўзаемасувязі паміж узроўнем навуковай кваліфікацыі спецыяліста і памерам яго матэрыяльнага заахвочвання. Істотна павялічацца даплаты акадэмікам і членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама асобам, якія працуюць у дзяржаўных арганізацыях адукацыі і навукі, за вучоную ступень кандыдата навук і доктара навук. Для работнікаў гэтых арганізацый упершыню ўводзяцца даплаты за вучонае званне прафесара і дацэнта. Пры гэтым даплаты за вучоную ступень і вучонае званне падсумоўваюцца. Асобам, якія працуюць у іншых арганізацыях, якія фінансуюцца з бюджэту, таксама будуць павышаны даплаты за вучоныя ступені і ўстаноўлены даплаты за вучоныя званні. Даплаты будуць назначацца прапарцыянальна адпрацаванаму часу (аб'ёму выкананых работ) і з улікам укладу асобаў, якія маюць вучоныя ступені і вучоныя званні, у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, навуку і інавацыйнае развіццё краіны. Рашэнне аб іх назначэнні будзе прымацца штогод да 15 студзеня.

Такія меры будуць садзейнічаць павелічэнню прэстыжу навукова-педагагічнай працы. Указ уступіць у сілу з 1 студзеня 2008 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У ПЕРШАКУРСНІКАЎ СКРАЛІ СТЫПЕНДЫЮ

У Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны скралі студэнцкую стыпендыю для першакурснікаў.

Як паведаміў «Звяздзе» рэктар гэтай ВНУ Антон Ятусевіч, злачынства адбылося падчас абедзенняга перапынку, калі практычна ў памяшканнях вучэбнага корпуса не было людзей. Нехта здолеў адчыніць металічныя дзверы з двума замкамі і ўзламаць сейф. Каса знаходзіцца ў галоўным корпусе акадэміі, у будынку па вуліцы Даватара. Як адзначыў рэктар, грошы прызначаліся для студэнтаў першага курса, якія, у адрозненне ад іншых студэнтаў, яшчэ не маюць пластыкавых банкаўскіх картак. Паводле атрыманай інфармацыі, скрадзена каля 70 мільёнаў беларускіх рублёў. Памер стыпендыі для лепшых студэнтаў складае 136 тысяч беларускіх рублёў. А для астатніх — 80—90 тысяч.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАЙШОЎ У АТАКУ. НА МІЛІЦЫЮ

Гэта быў 24-гадовы жыхар вёскі Новая Гута Гомельскага раёна, які раней ужо адбываў тэрмін пакарання ў калоніі за разбой. Калі ж выйшаў на волю, то зноў узяўся за крымінал, учыніўшы крадзеж дзяржаўнай маёмасці ў сваёй вёсцы, за што і быў аб'яўлены ў рэспубліканскі вышук.

Аб усім гэтым, як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар Грышкевіч, двое міліцыянераў патрульна-паставой службы, якія выйшлі на вячэрняе дзяжурства ў Мазыры, не ведалі. Яны цікавіліся, чым займаецца маладая кампанія ў адным з дваро?, адкуль даносіцца шум. І звярнулі ўвагу на хлопца, які сядзеў воддаль з бутэлькай віна, вырашыўшы праверыць яго дакументы. Патрабаванне міліцыянераў прывяло да нечаканага павароту: хлопец адскочыў убок, выцягнуў з кішэні нож і рушыў на патрульных, пагражаючы ім. Потым разбіў аб асфальт бутэльку, і ў яго руцэ апынулася вострая «рыжачка». У гэтай вось абстаноўцы, калі ён ігнараваў загады міліцыянераў, тыя выклікалі па рацыі падмацаванне. Абышлося без папераджальных стрэлаў. Хуліган быў абясшкоджаны.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

УП «Минский городской центр недвижимости» информирует:

В извещении о проведении 65-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска, назначенный на 27 сентября 2007 года, опубликованном в газете «Звязда» от 15 сентября 2007 года, лоты № 32, 33 исключены.

В извещении о проведении открытого аукциона по предоставлению юридическим лицами индивидуальным предпринимателям во временное пользование торговых площадей в торговом центре «Купаловский», опубликованном в газете «Звязда» от 15 сентября 2007 года, вместо слов: «документы на участие принимаются по 26 августа 2007 года», следует читать: «документы на участие принимаются по 26 сентября 2007 года».

ААТ «НАФТАН»: НОВЫ ДЗЕНЬ ДАВЕРЫМ НОВАМУ ПАКАЛЕННЮ

Хто яны — наступнае пакаленне навапалачан, якія працуюць сёння на адным з вядучых, прэстыжных прадпрыемстваў рэспублікі — ААТ «Нафтан»? Хто «піша» гісторыю горада ўвогуле і прадпрыемства ў прыватнасці?

Наваполацк пачынае сваю гісторыю з досыць блізкага 1958 года. Жаданне пабудаваць Новы Полацк прывяло на бераг Заходняй Дзвіны, на ўдарную камсамольскую будоўлю, хлопцаў і дзяўчат з розных куткоў вялікага Саюза. Так новаспечаны горад стаў месцам пражывання, галоўным чынам, новага пакалення. Але і сёння малады горад застаецца горадам для маладых: з больш як 100 тысяч тутэйшых жыхароў звыш 30 тысяч складае моладзь ва ўзросце ад 14 да 31 года. Скажам шчыра, нават без статыстычных звестак відавочна, хто насяляе Наваполацк. Дастаткова выйсці ў другой палове дня на адну з цэнтральных гарадскіх вуліц і на свае вочы пабачыць мноства юных, прыгожых твараў.

Буйнейшае прадпрыемства Наваполацка (і краіны, як вядома) — ААТ «Нафтан» — крыху маладзейшае за горад і гэтакае ж багатае на моладзь. Маладыя людзі прыходзяць на «Нафтан» па размеркаванню ці проста па ўласнаму жаданню і даволі хутка ўсведамляюць усе важкія «плюсы» магчымасці «нафтанаўцам звацца» — прыстойны заробак, перспектывы для павышэння кваліфікацыі, працягу вучобы, кар'ернага росту з аднаго боку, а з другога — магчымасць пабудаваць жыллё, адпачываць у санаторыі, займацца разнастайнымі відамі спорту на цудоўнай спартыўнай базе прадпрыемства, падарожнічаць з калектывам па гарадах і краінах… Укараненне такой палітыкі на прадпрыемстве цалкам стасуецца з асноўнымі накірункамі рэспубліканскай праграмы «Моладзь Беларусі» на 2006—2010 гады.

(Заканчэнне на 2, 7 стар.)



КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилого неиспользуемого помещения с отдельным входом (общ. пл. 263 кв. м) находящегося на первом этаже здания, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 27 с условием его использования под объект общественного питания (столовая, кафе). Начальная цена — 5 900 000 бел. руб. Оплата стоимости права аренды производится в течении 5 дней на р/с арендодателя. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьком отделении ОАО «Б С-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор аренды заключается сторонами в течение 10 календарных дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 30.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 231. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29.10.2007 г. до 17.010 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.

Сайт в Интернете: www.rlt.by

ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «МИНСКИЙ АВТОМОБИЛЬНЫЙ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

проводят открытый аукцион по продаже объекта республиканской собственности – оборудования для изготовления изотермических панелей для рефрижераторов (инвентарный № 490260), 1998 год выпуска. Оборудование находится по адресу: г. Могилев, ул. Крупская, 232. Начальная цена лота – 1 122 969 908 рублей. Перечень документов для участия в аукционе, порядок проведения торгов и иные условия оговорены в условиях проведения аукциона. Оплата за приобретенное оборудование производится в соответствии с договором купли-продажи, который заключается в течение 20 рабочих дней после проведения аукциона. Задаток в размере 100 000 000 рублей перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 КУП «Минский городской центр недвижимости». Аукцион состоится 31 октября 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Социалистическая, 2.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 30 октября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: 227-40-22, 217-96-37.

Интернет: www.mgcn.by

ISSN 1990 - 763X

ААТ «НАФТАН»:

Хто яны — наступнае пакаленне навапалачан, якія працуюць сёння
Хто «піша» гісторыю горада ўвогуле

ЗАБЯСПЕЧВАЕМ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ УСІМ НЕАБХОДНЫМ

За год шасцітысячны калектыў «Нафтана» абнаўляецца на 250—300 чалавек з улікам тых, хто выходзіць на пенсію ці звальняецца па нейкіх прычынах, — расказвае Мікалай КАЛБАСЕНКА. — Каля 50 чалавек — маладыя спецыялісты, якія прыйшлі пасля вучылішча, тэхнікума, ВНУ па запыту вытворчасці. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт забяспечваюць нас інжынерамі-механікамі, інжынерамі-тэхнолагамі, інжынерамі-электрыкамі, энергетыкамі, інжынерамі па аўтаматызацыі вытворчых працэсаў... Яны пастаўляюць нам, безумоўна, лепшых з лепшых. Усе, хто ўладкоўваецца па вольнаму найму, адбіраюцца на конкурснай аснове — праходзяць тэсціраванне ў пісьмовай форме. З сярэднім балам і вышэй далей праходзяць вуснае выпрабаванне, пасля чаго і прымаецца рашэнне аб прыёме на работу. Хтосьці, безумоўна, застаецца ў рэзерве. У апошнія пяць гадоў запрашалі мы і спецыялістаў з іншых прадпрыемстваў: новыя працэсы патрабуюць новага вопыту, новых кадраў.

Паколькі на завод прыходзяць гатовыя спецыялісты, то наша далейшая задача — стварыць умовы для іх адаптацыі. Каб праз год-два яны пачалі працаваць у поўную сілу, праявілі сябе. Са свайго боку «Нафтан» забяспечвае ўсім неабходным. Па-першае, прыстойны заробак, дастатковы для пачатку працоўнага жыцця. Па-другое, жыллё. Каму трэба, выдзяляецца пакой у інтэрнаце. У нас ёсць два інтэрнаты для халасцякоў і тры для маласямейных. Маладыя спецыялісты складаюць асобную чаргу на атрыманне ўласнага жылля. Штогод ім выдзяляецца 5 працэнтаў ад здадзенага жылля. Гэта значыць, што свайго шанцу можна дачакацца на працягу пяці гадоў. Крэдыт на будаўніцтва жылля пад 4,75 працэнта гадавых выдае «Нафтан» праз ААТ «Слаўнафтабанк»

Мікалай КАЛБАСЕНКА, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях.

на 25 гадоў. Нагадаю, што летась мы здалі адзін 108-кватэрны дом. Сёлета заклалі два дамы на 108 кватэр, яны будуць здадзены восенню наступнага года. Наогул, паводле нашай праграмы, мы павінны будаваць адзін дом у год.

Яшчэ адзін важны аспект — магчымасці прафесійнага росту. Усе маладыя спецыялісты, якія прыходзяць на рабочыя месцы, вырастаюць да інжынерна-тэхнічных работнікаў прыкладна за тры гады. Праз гэты тэрмін ім можна даверыць самастойны ўчастак работы. Скажам, на кожнай тэхналагічнай установе ёсць кіраўнік ніжэйшага звяна — кіраўнік гэтай установы. Вось на гэты ўзровень можна выйсці за тры гады. Зразумела, пад увагу ў дадзеным выпадку бяруцца толькі асабістыя якасці і дасягненні канкрэтнага чалавека, паколькі гаворка ідзе пра вельмі небяспечную і адказную работу. Наступная прыступка — кіраўнік сярэдняга звяна, пасля — узровень галоўных спецыялістаў. Самыя перспектыўныя для кар'ернага росту пасады — тэхнічныя, звязаныя з тэхналогіяй вытворчасці. Гэта інжынеры — хімікі, тэхнолагі, механікі. У апошнія пяць гадоў тут назіраўся актыўны рух. На «Нафтане» ўкараняліся новыя працэсы, вытворчасць інтэнсіўна развівалася, і таму той, хто прыйшоў літаральна пяць гадоў таму, займае цяпер пасады начальнікаў цэхаў і іх намеснікаў.

Жадаюць нашы работнікі вучыцца — калі ласка. Зараз каля 300 чалавек атрымліваюць першую або другую вышэйшую адукацыю. Мы аплачваем вучобу ў тых выпадках, калі заводу патрэбны канкрэтныя спецыяльнасці, калі работнік значыцца ў рэзерве на пасаду. Частка вучыцца за свае грошы. Чацвёра займаюцца ў аспірантуры — такая група з'явілася ў нас упершыню за апошнія гады.

Прадпрыемства стварыла цудоўныя ўмовы для баўлення вольнага часу з карысцю для здароўя. Ёсць Палац воднага спорту, спартыўны комплекс, турыстычная база. Ніхто нашых работнікаў не прымушае займацца спортам, яны і самі праяўляюць надзвычай высокую актыўнасць. Бяром удзел у самых розных спартыўных мерапрыемствах — на ўзроўні канцэрна, абласных і рэспубліканскага прафсаюзаў. Арганізуем свае першынствы па футболе, паколькі ў нас шмат футбольных каманд.

Вось яны — рэдкія «кадры», дысцыплінаваныя «профі». За абедам, ад якога іх адарваў аб'ектыў, аддаюць перавагу шахматам.

Ключ ад горада — у руках навучэнца

Сярэдні ўзрост навапалачаніна — 35 гадоў. Кожны трэці жыхар горада — малады чалавек. І таму, зразумела, у межах рэгіянальнай праграмы «Моладзь Навапалацка» на 2006—2010 гады правадзіцца велізарная работа са школьнікамі, студэнтамі, маладымі сем'ямі, спецыялістамі, у тым ліку работнікамі «Нафтана» і г.д. **Жанна СОНІЧ, начальнік аддзела па справах моладзі Навапалацкага выканаўчага камітэта** можа бясконца расказваць пра шматлікія падзеі мінулага і будучыні:

— Наша моладзь, у тым ліку школьнікі, актыўна задзейнічана ва добраўпарадкаванні горада, помнікаў, шэфстве над ветэранамі вайны і многіх іншых акцыях. У межах работы навуковых таварыстваў

Начальнік аддзела па справах моладзі Навапалацкага гарвыканкама Жанна СОНІЧ дзеліцца вопытам работы.

школьнікі пішуць доследныя работы, распрацоўваюць навуковыя праекты. І вучнёўская, і студэнцкая, і працоўная моладзь удзельнічае ў гарадскім маладзёжным форуме, які адбудзецца ў снежні гэтага года пяты раз. Форум, дарэчы, — адно з буйнейшых і маштабных мерапрыемстваў горада. Ён складаецца з дзвюх частак — пленарнага пасяджэння вучнёўскага парламента з удзелам прадстаўнікоў гарадской улады і ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання лепшых прадстаўнікоў працоўнай моладзі па выніках года. Старшыня вучнёўскага парламента, навучэнец політэхнічнага тэхнікума Дзмітрый Адамовіч атрымаў на апошнім форуме сімвалічны ключ — нібыта ключ ад горада. Так што ўся ўлада сканцэнтравана ў нас у руках новага пакалення. Калі гаварыць пра работу ўласна вучнёўскага парламента, то ў якасці прыкладу можна прывесці пленарныя пасяджэнні, на якіх прымаюцца важныя рашэнні, штомесячную работу «Школы лідара», куды запрашаецца для шчырай гутаркі яркая асоба, якая дасягнула пэўных вяршынь і гатовая падзялiцца вопытам. У складзе парламента працуе шэсць камісій — па правах дзіцяці, культуры, сацыяльных пытаннях і г.д...

У горадзе ёсць Навапалацкае дзяржаўнае музычнае вучылішча, Навапалацкае дзяржаўнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў, Навапалацкі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны ліцэй № 28 нафтахіміі, Навапалацкі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Гэта можа сведчыць аб дастатковых магчымасцях і высокім узроўні падрыхтоўкі тутэйшых спецыялістаў. Таму беспрацоўныя, як правіла, — асобы без адукацыі і вопыту работы. Усё ж такі нават рабочыя кадры на тым жа «Нафтане» часта маюць адну, а тое і дзве вышэйшыя адукацыі. Таму зараз аддзел па справах моладзі стварае банк даных маладых спецыялістаў, якія скончылі школу, вучылішча, тэхнікум, універсітэт. Так прасцей будзе наладзіць працэс перанавучання.

Для прыезджых з іншых рэгіёнаў у горадзе ёсць дастатковая колькасць інтэрнатаў: 11 належыць рабочым установам і 7 — навучальным. «Нават калі ў пэўнай арганізацыі не аказалася месца для пражывання, яна звяртаецца з хадайніцтвам у другую, і пытанне вырашаецца, — удакладняе Жанна Соніч. — Умовы пражывання, як правіла, неблагія, нават у вельмі старых будынках. Штогод мы праводзім сярод інтэрнатаў конкурс — вельмі сур'ёзнае мерапрыемства, калі пад увагу бяруцца разнастайныя параметры. І, ведаеце, усе цягнуцца — ніхто не хоча быць апошнім. Самае цікавае, што першыя месцы займаюць зусім не новыя інтэрнаты».

Зараз у горадзе каля 2 тысяч маладых сем'яў маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Сёлета былі здадзены ў эксплуатацыю тры дамы, у якіх маладым сем'ям належыць 128 кватэр.

— Сярод многіх мерапрыемстваў, прысвечаных нашым маладым сем'ям, хочацца вылучыць «круглы стол», на якім абмяркоўвалася роля таты ў сучаснай сям'і, — расказвае Жанна Соніч. — У якасці ўзорнага прыкладу мы запрасілі на сустрэчу Андрэя Шаўкела, яго жонку Жанну і сына Максіма. Андрэй, дарэчы, працуе на ААТ «Нафтан», выдатны спецыяліст і сапраўды цудоўны бацька...

У Навапалацку працуюць спецыялізаваныя дзіцяча-юнацкія школы алімпійскага рэзерву, дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, хакейны клуб «Хімік», Палац воднага спорту, дом фізічнай культуры, басейны, фізкультурна-спартыўны клуб па рабоце з насельніцтвам па месцы жыхарства, у якіх займаецца звыш 3 тысяч падлеткаў і моладзі. Ёсць і Палац культуры, Палац культуры нафтавікоў, Палац культуры і адпачынку, Цэнтр рамёстваў і традыцыйных культур. Адным словам, моладзі ёсць дзе сябе рэалізаваць — было б жаданне. Пытанне ж дастатковай колькасці даступных для маладых сем'яў бараў, кафэ застаецца пакуль адкрытым.

«Практыка паказвае, што наша моладзь — вельмі актыўная, гатовая не толькі выказваць новыя ідэі, але і ствараць, працаваць, — робіць заключэнне Жанна Соніч. — Але ўсё ж такі канчатковы вынік залежыць не толькі ад іх жадання нешта змяніць ці палепшыць, але ад зладжанай работы самых розных службаў горада».

Шматлікая пярвічка БРСМ

З аддзелам па справах моладзі цесна супрацоўнічае гарадскі камітэт грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

У склад гарадской арганізацыі ГА «БРСМ» уваходзіць 94 пярвічныя арганізацыі. Гэта нямала: ахоплены сто працэнтаў школьнай і вучнёўскай моладзі і 95 працэнтаў прадпрыемстваў і арганізацый горада з колькасцю моладзі звыш 10 чалавек.

Паводле слоў **першага сакратара гарадской арганізацыі БРСМ Надзеі ЛУКІНОЙ**, на «Нафтане» агітацыйную работу пачыналі з таго, што актывісты арганізацыі абышлі кожны цэх, усёй моладзі расказалі пра тое, як цікава і карысна можна бавіць вольны час. Цяпер на заводзе — 250 членаў БРСМ, і гэта самая шматлікая пярвічка сярод працоўнай моладзі. Чатырнаццаць чалавек — Сяргей Мацясовіч, Андрэй Бандарэнка, Мікалай Лісічонак, Дзмітрый Змітрачонак, Сяргей Далімаеў, Фелікс Будзько, Аляксандр Барэйка, Сяргей Скіба, Аляксандр Бобрык, Аляксандр Марозаў, Сяргей Шчарбіцкі, Мікалай Марозаў, Сяргей Кузняцоў, Сяргей Мясаедаў уваходзяць у склад добраахвотнай народнай дружыны ГА «БРСМ» ААТ «Нафтан».

«На маю думку, — кажа Надзея Лукіна, — для працоўнай моладзі вельмі важнае пытанне арганізацыі вольнага часу. І таму мы актыўна праводзім з яе ўдзелам спартыўныя мерапрыемствы, турслёты, фестывалі, ладзім экскурсійныя паездкі па Беларусі і за яе межамі. Акрамя таго, прадстаўнікі розных пярвічак пастаянна аб'ядноўваюцца вакол канкрэтных ідэй, ніхто сам па сабе не «варыцца». А ўсе мерапрыемствы верасня вырашана прымеркаваць да 5-гадовага юбілею арганізацыі. Для працоўнай моладзі дадаткова арганізуем спартыўны фестываль і вечарынку».



Першы сакратар гарадской арганізацыі БРСМ г. Навапалацка Надзея ЛУКІНА: самая шматлікая пярвічка — на «Нафтане».

Начальнік установкі «Вытворчасць вадароду» Сяргей ГЛІСТОЎЧАНКА, ён жа — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Аператарная ўстаноўкі «Юнікрэкінг»: начальнік установкі Дзмітрый БУРАК, аператары Аляксандр ГУЗЮК і Дзяніс МІНКІН.

Стаць электрыкам не проста

— У нашым электрацэху працуе каля 250 чалавек, і прыкладна сотня з іх — гэта моладзь, — распавядае **начальнік цэха № 9 Генадзь ПЯТРОЎ.** — Многія маюць вышэйшую адукацыю, скончылі, у прыватнасці, Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію. Прафесія інжынера-электрыка прадугледжвае абавязковую наяўнасць вышэйшай адукацыі. Да таго ж працаваць зараз даводзіцца на найноўшай, складнай мікрапрацэсарнай тэхніцы, з якой без адпаведных навыкаў і ведаў не справіцца. Увогуле стаць электрыкам не так і проста. Гадоў 5—6 давядзецца быць памочнікам, і толькі пасля табе могуць даверыць самастойнае выкананне пэўнай работы. Зараз на заводзе ўстаноўлена каля сямі тысяч электрарухавікоў імпартнай вытворчасці — расійскіх, японскіх, нямецкіх, англійскіх і іншых. Наш цэх забяспечвае рамонт, наладку і эксплуатацыю ўсяго электраабсталявання. Дарэчы, ва ўсім свеце энергацэхі лічацца асноўнымі, на нашым заводзе гэта хоць і другасны па сутнасці, але адзін з самых адказных участкаў, які патрабуе высокага прафесіяналізму, дысцыпліны і самакантролю.

Гэтымі якасцямі вылучаюцца якраз намеснік начальніка цэха Аляксандр Кяцко, майстры Андрэй Тычына, Дзмітрый Яфрэменка, электраманцёр Міхаіл Крывашэеў і многія іншыя. 33-гадовы Аляксандр Парашчанка можа служыць цудоўным прыкладам прафесійнага росту. Пасля заканчэння Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «радыёінжынер» ён прыйшоў у 1998 годзе на завод электраманцёрам, пасля стаў інжынерам-энергетыкам, затым майстрам участка электратэхнічнай лабараторыі, нарэшце, стаў вядучым інжынерам-энергетыкам.

Намеснік начальніка цэха № 9 Аляксандр КЯЦКО прыйшоў на завод электраманцёрам у 1993 годзе, пасля заканчэння політэхнічнай акадэміі па спецыяльнасці інжынер-электрык. Быў начальнікам змены, намеснікам начальніка цэха, браў удзел у будаўніцтве комплексу «Гідракрэкінг», зараз заняты на эксплуатацыі кагенерацыйнай газатурбіннай установкі, ад якой ажыццяўляецца ўсё электразабеспячэнне завода. З увядзеннем гэтай установкі ў эксплуатацыю у 2000 годзе пачалася маштабная рэканструкцыя электразабеспячэння ўсяго «Нафтана» — замена падстанцый і шмат іншых работ. Моладзь паспяхова асвойвае новую тэхніку. На змену старому абсталяванню прыйшло лічбавае, таму запатрабаваліся прыстойныя веды ў камп'ютарнай галіне. Цяпер нават электраманцёру не лішне ведаць замежныя мовы.

— Некаторыя маладыя спецыялісты, якія прыйшлі па размеркаванню, атрымліваюць магчымасць будаваць жыллё літаральна праз два гады плённай працы, — расказвае Аляксандр Кяцко. — Не магу не пахваліцца нашымі спартыўнымі дасягненнямі: дзевяты цэх неаднаразова займаў першыя месцы на круглагадовай спартакіядзе — па такіх відах спорту, як футбол, плаванне, валейбол і г.д.

Перадавыя тэхналогіі

У рабоце ўстаноўкі «Юнікрэкінг» задзейнічана 59 чалавек, абсалютную большасць з якіх складае моладзь з вышэйшай адукацыяй. Усе спецыялісты скончылі Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт або Беларускі дзяржуніверсітэт. Гэта хімікі-тэхнолагі і механікі. Частка іх прыйшла па накіраванню, астатнія прайшлі адбор на прадпрыемстве. **Дзмітрыю БУРАКУ, начальніку ўстаноўкі «Юнікрэкінг»** — 30 гадоў. Працуе на «Нафтане» ўжо 10 гадоў, апошнія паўтара — на пасадзе начальніка ўстаноўкі. У свой час пачынаў слесарам, пасля быў аператарам, старэйшым аператарам і намеснікам начальніка ўстаноўкі.

Паводле слоў **Анатоля КАНСТАНЦІНАВА, намесніка галоўнага інжынера ўстаноўкі «Юнікрэкінг»,** установка «Юнікрэкінг» уведзена ў эксплуатацыю па-водле праекта амерыканскай кампаніі UOP у 2004 годзе згодна з праграмай мадэрнізацыі завода. Падобных установак у свеце — звыш 150. «Гэта ёсць самыя што ні на ёсць перадавыя тэхналогіі», — адзначае Анатоль Канстанцінаў. Начальнікі змены і кіраўнікі ўстаноўкі стажыраваліся ў ЗША. За кошт «Юнікрэкінга» завод павялічыў магчымасці перапрацоўкі нафтавага астатку, з якога атрымлівае бензін, дызельнае паліва, газу. Праект павінен прывесці і ўжо прыводзіць да павелічэння адлічэнняў у бюджэт, у тым ліку бюджэт завода. Установка зарабляла летась каля 4 млн долараў у месяц.

30-гадовы **Сяргей ГЛІСТОЎЧАНКА — начальнік установкі «Вытворчасць вадароду».** У 1998-м скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт — тэхналагічны факультэт, кафедра хімічнай тэхналогіі паліваў і вугляродных матэрыялаў. Стаў інжынерам-хімікам-тэхнолагам. Скончыў аспірантуру па спецыяльнасці «хімічная тэхналогія нафты і газу». У 1997—98 гадах — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў за выдатную вучобу і поспехі ў навуковай дзейнасці. Пасля аспірантуры і службы ў арміі прыйшоў на завод аператарам 4-га разраду, пасля атрымаў 5-ы і 6-ы разрады і вось ужо год як узначальвае ўстаноўку. Яе штат — 27 чалавек. У асноўным гэта людзі ва ўзросце каля 30 гадоў.

— Пакуль працаваў аператарам, добра пазнаёміўся з кожным супрацоўнікам, так што знайсці агульную мову з калектывам было няцяжка, — распавядае Сяргей Глістоўчанка. — Зараз мы імкнёмся працаваць на самым высокім узроўні, падтрымліваць дысцыпліну і, калі адпачываць, то актыўна. Так, хтосьці ў нас захапляецца пейнт-болам, а хтосьці турызмам, настольным тэнісам ці футболам.

Дакладны рамонт плюс культура вытворчасці

З больш як 200 працуючых цэха № 12 палова — маладыя кадры. Гэта людзі актыўныя і на рабоце, і ўвогуле па жыцці.

— У нас, напрыклад, 40 членаў БРСМ, — удакладняе **начальнік цэха № 12 Віктар МЯНЬШОЎ.** — У цэху працуе двойчы чэмпіён свету па каратэ Канстанцін Каралёў, ёсць гарачыя аматары футбола, лёгкай атлетыкі, пажарнага спорту, стральбы, шахмат, а таксама цудоўныя спевакі з танцорамі. Калектыў высокаадукаваны. На рабочых пасадах 44 чалавекі маюць вышэйшую адукацыю, 64 — сярэднюю спецыяльную, астатнія — прафесійна-тэхнічную. Да сёлетняга прафесійнага свята нафтавікоў слесар Міхаіл Аўдошка атрымаў падзяку ад завода за выдатную работу. Не так даўно малады наладчык 8-га разраду па мікрапрацэсарнай тэхніцы Андрэй Кавалёў заняў пасаду начальніка ўчастка.

Наш цэх рамантуе сродкі вымярэння ўсяго завода, аказвае паслугі староннім арганізацыям па рамонту сродкаў вымярэння і тэхнічнаму абслугоўванню на 30—

Начальнік службы тэхнічнага абслугоўвання, рамонту і дыягностыкі Андрэй СКРАБАТУН сцвярджае, што пад яго кіраўніцтвам працуюць удзельнікі любых відаў спартыўных спаборніцтваў.

40 млн рублёў у месяц. На нас ускладзена тэхнічнае абслугоўванне ўсіх прыбораў фізіка-тэхнічнага аналізу, размнажальная тэхніка завода, сувязь, прамысловае тэлебачанне. Ажыццяўляем наладачныя работы, газавы маніторынг. Сваімі сіламі робім рамонт у цэху, не запрашаем збоку ніякіх спецыялістаў. Калі ласка, ацаніце і нашу культуру вытворчасці. Мяркую, ніводзін цэх не зможа пахваліцца такой прыгажосцю. Альпійскія горкі, кветнікі, фантанчык, скульптурныя выявы — усё зроблена рукамі саміх цэхавікоў. Кветкавую справу вядзе інспектар па кантролю за выкананнем даручэнняў Таццяна Кузняцова. На сваёй дачы яна сотак 5—7 адводзіць пад кветкі. Ведае ўсе тэрміны цвіцення, выспявання гэтай прыгажосці. Набывае насенне, вырошчвае ў цяпліцы, высаджвае... Вось ужо тры гады як Таццяна радуе сваім хобі і работнікаў прадпрыемства, і гасцей.

«Вочы і вушы» завода

Начальнік службы тэхнічнага абслугоўвання, рамонту і дыягностыкі абсталявання вытворчасцяў Андрэй СКРАБАТУН скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт у 1996 годзе. Пяць гадоў адпрацаваў дзяржаўным інспектарам праматамнагляду, курыраваў нафтахімічныя прадпрыемствы Віцебскай вобласці, а ў 2001-м яго запрасілі на «Нафтан» механікам. У 2002-м стаў намеснікам начальніка аддзела, праз два гады пачаў выконваць абавязкі начальніка, і вось ужо тры гады як узначальвае службу.

— Мяркую, неблагі прафесійны рост, — кажа ён. — Зараз мне — 33 гады, і абсалютная большасць маіх падначаленых, а гэта каля 40 чалавек, — ва ўзросце ад 25 да 40 гадоў. Гэта механікі-інжынеры і дэфектаскапісты. Апошнія, дарэчы, кантралююць якасць рамонтных службаў не толькі «Нафтана», але і спецыялізаваных арганізацый.

Служба тэхнічнай дыягностыкі і абслугоўвання — гэта «вочы і вушы» завода, паколькі гэтыя спецыялісты адказваюць за бяспеку ўсяго абсталявання — трубаправоду, пячэй, збудаванняў і г.д., правадзяць яго рэвізію ў працэсе эксплуа-

Інжынер службы тэхнічнага абслугоўвання, рамонту і дыягностыкі Аляксандр КРЫЛЕНКА рыхтуе кандыдакцую.

Начальнік цэха № 12 Віктар МЯНЬШОЎ і слесар 4 разраду Таццяна ГОЛУБЕВА дэманструюць альпійскую горку, зробленую рукамі работнікаў цэха.

Інспектар па кантролю за выкананнем даручэнняў Таццяна КУЗНЯЦОВА: «кантралюе» і кветкавую справу.

Працяг. Пачатак на 1-й стар.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 верасня 2007 г. № 37 (91)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ВАЕННЫ ГАРАДОК — ПРАБЛЕМНЫ ГАРАДОК?

У Шчарчове Пружанскага раёна ўсё ж выгаднае геаграфічнае становішча. Вёска — усяго за нейкія тры кіламетры ад дарогі Брэст—Пружаны. Нават некаторыя брэсцкія маршруткі заходзяць у сам населены пункт. Вельмі проста дабірацца і ў райцэнтр. Раней на тэрыторыі Шчарчоўскага сельсавета было два калгасы. З цягам часу іх аб'ядналі ў адзін. Землі ў гэтых мясцінах вельмі бедныя. Гэта называлі адной з прычын таго, што мясцовыя гаспадаркі спакон веку займалі радкі недзе напрыканцы раённай зводкі. Не намі заўважана: дзе калгас слабы, там і вёска не квітнела. Паступова закрываліся навакольныя школы па прычыне рэзкага памяншэння колькасці вучняў. На 22 вёскі сельсавета налічваецца ўсяго толькі тысяча чалавек.

Вось ужо хутка год, як першыя рабочыя курткі і боты сышлі з канвеера са шчарчоўскай маркай. Загадчык мясцовай вытворчасці Міхаіл Шкрабацюк гаворыць, што заказаў хапае. Нават па вешалцы гатовай прадукцыі можна меркаваць, якія прадпрыемствы і арганізацыі шыюць рабочую форму для сваіх працаўнікоў. Курткі заказваюць энергетыкі і лесаводы, аранжавыя накідкі бяруць дарожнікі і чыгуначнікі. Па жаданню кліентаў тут наносяць лагатыпы на адзенне або іншыя апазнавальныя знакі, эмблемы.

Сам Міхаіл Мікалаевіч — спецыяліст па вытворчасці абутку, раней працаваў на белаазёрскім «Белкельме». Ён паказвае і падрабязна тлумачыць прызначэнне ўсіх шасці відаў абутку, што выпускае цэх. Галоўная ўласцівасць ботаў і чаравікаў — іх якасць і надзейнасць у эксплуатацыі. Для лесарубаў, напрыклад, вырабляюць абутак са спецыяльным наском з металам. Такі бот не праб'е нават сякера, якая выпадкова саскочыла. Абутак хоць і чыста рабочы, але сучасны выгляд робіць яго, я сказала б, нармальным на выгляд. Кліенты не крыўдзяцца.

«КПВС» купіла некалькі памяшканняў. Таму раскройны цэх размешчаны асобна, а вытворчасць вопратак і абутку займае два паверхі былой казармы. Адразу за парогам міні-фабрыкі растуць сосны. Вакол — лес. А грыбы, кажуць, можна збіраць нават на тэрыторыі былой часці.

Гаворым з работніцамі ўпакавачнага цэха Аленай Данілюк і Любоўю Пратасюк. Жанчыны вельмі задаволеныя, што знайшлі работу блізка ад дому. Раней яны працавалі ў часці, а потым у адзін дзень засталіся без сродкаў для існавання. «Цэлы год ездзілі ў Жабінку на «крэветкі», — расказвае Алена Валянцінаўна. — Гэта ж так нязручна. Ды і заробкі не вельмі высокія, а тут калі загружанасць работай добрая, можна атрымаць за месяц 500—600 тысяч рублёў».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Жыццё ж самога Шчарчова апошнія дзесяцігоддзі ў многім вызначала наяўнасць вялікай вайсковай часці. Для сем'яў ваеннаслужачых у свой час узвялі два 48-і адзін 75-кватэрны дамы. Школа папаўнялася вучнямі, мелі стабільную выручку гандлёвыя пункты. Але два гады таму часць расфарміравалі. Вайскоўцы забралі з сабой толькі тэхніку і абсталяванне, а ўсе будынкі і памяшканні (у колькасці 43) пасля праведзеных ва ўстаноўленым парадку юрыдычных працэдур перайшлі ва ўласнасць раёна.

— Добра, што нашай часці шанцавала з камандзірамі, — расказвае старшыня Шчарчоўскага сельскага Савета Аляксандр Дзяшко. — Тут заўсёды падтрымліваўся парадак. Казармы, ангары для тэхнікі, гаспадарчыя і падсобныя збудаванні своечасова рамантаваліся і ўтрымліваліся ў належным стане. Так што нясорамна было запрашаць прыезджых «купцоў». Першай на вызваленую базу часці звярнула ўвагу брэсцкая прыватная фірма «КПВС». Яе кіраўнік Міхаіл Табалевіч прыехаў, агледзеў будынкі, памяшканні і вырашыў адкрыць тут прадпрыемства пашыву рабочага адзення і абутку.

ВЁСКА З МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

Сёння ў Гальшанах, на жаль, вы не знойдзеце ніводнага чалавека з прозвішчам Гальшанскі. Але гэта мястэчка на Ашмяншчыне дзіўнае, незвычайнае... Пра яго не ведае, напэўна, толькі той, хто не быў знаёмы з творчасцю Уладзіміра Караткевіча і не чуў пра яго раман «Чорны замак Альшанскі». Той жа, хто ведае, імкнецца патрапіць сюды хоць раз, каб убачыць, як сярэднявечча пераплятаецца з сучаснасцю, палюбавацца прыцягальнай прыгажосцю некалі велічных пабудоў, адчуць ірэальнасць быцця... І, безумоўна, пачуць легенды пра прывідаў, якія выбралі сваім прыстанішчам былы французскі кляштар. (Да апошніх мясцовыя жыхары так прызвычаіліся, што, здаецца, лічаць іх паўнапраўнымі жыхарамі сваёй вёскі).

У Усе, хто пабываў у Гальшанах, напэўна, пагодзяцца са мной, што на звычайную вёску гэты населены пункт не вельмі падобны. Гісторыкі называюць Гальшаны адзіным у Беларусі мястэчкам, якое практычна захавала сваё архітэктурнае аблічча: у былым яўрэйскім квартале што ні дом — то былая лаўка ці майстэрня, а касцёл і кляштар пабудаваў Павел Сапега на пачатку XVII стагоддзя, тады ж быў узведзены і Гальшанскі замак.

Сёння, гледзячы на рэшткі некалі велічнай пабудовы, якая захавалася толькі на чвэрць, цяжка паверыць, што некалі замак лічыўся адным з найпрыгажэйшых у Еўропе і ўяўляў сабой шыкоўную рэзідэнцыю магнатаў. Сцены і столі пакояў пакрывалі фрэскі і ляпніна, а падлога была выкладзена керамічнай пліткай.

Сапегам, дарэчы, мястэчка дасталося ад легендарнага роду Гальшанскіх — апошняя князёўна Гальшанская выйшла замуж за Паўла Сапегу і «прынесла» яму радавы маёнтак у якасці пасагу... Але ж не ёй паставілі помнік на сучаснай плошчы Гальшанаў, а іншай прадстаўніцы славутага роду — Соф'і Гальшанскай, каралеве Польшчы, апошняй жонцы караля Ягайлы і родапачынальніцы дынастыі Ягелонаў. (Да Соф'і кароль быў жанаты тройчы, але ў шлюбах нараджаліся толькі дзяўчаткі.)

Работы, звязаныя з усталяваннем помніка, праводзіліся летась, а паралельна перарабляла і перабудоўвалася ўся плошча. На яе рэканструкцыю пайшло больш за 300 млн рублёў, і сёння цэнтр аграгарадка (гэта новы статус Гальшан) не пазнаць.

На адкрыццё помніка і прысвечаную гэтай падзеі канферэнцыю прыязджалі госці нават з Латвіі і Польшчы.

— Гальшаны зусім не падобныя на звычайную вёску... Багатая на імёны і падзеі гісторыя, руіны радавога замка, неўміручыя легенды стваряюць своеасаблівую аўру. Нават, магчыма, крыху змрочную. Але ж гэта і прыцягальна для людзей прыезджых, для турыстаў... Нявыжо нельга знайсці прадпрымальнага чалавека, здольнага, скажам так, перавесці гістарычныя здабыткі ў фінансавыя? Акультурыць тэрыторыю побач з руінамі, пабудаваць гасцініцу ці турбазу? — пытаюся ў старшыні Гальшанскага сельскага Савета Войцэха Коўзана, калі пасля «ўводнай» экскурсіі мы сядзім у яго кабінеце і размаўляем аб мінулым і сучасным Гальшан.

Войцэх Іванавіч тлумачыць, што тэарэтычна зрабіць можна ўсё. І нават аддачу атрымаць. Але першапачаткова неабходна ўкласці ў гэта суму з сямю нулямі і больш. (Летась толькі на добраўпарадкаванне дарожак і пад'ездаў да замка пайшло 60 млн). Старшыня ўжо шукаў багатых людзей, гатовых укласці сродкі ў «гісторыю», і нават знайшоў аднаго прадпрымальніка з Масквы. Той падлічыў, колькі грошай неабходна будзе патраціць, колькі можна потым атрымаць.

— У чалавека былі вялікія планы... Пачысціць азёры — а іх тут два, зону адпачынку зрабіць... Але, напэўна, ён перадумаў — даўно не звязваўся са мной. А нам для аднаўлення азёраў неабходна спачатку заказаць каштарыс, які цягне больш чым на 200 мільёнаў... Магчыма, гэтыя грошы з'явяцца, але не раней, чым у наступным годзе.

Нягледзячы на тое, што Гальшаны проста ахутаны ўсякімі легендамі і паданнямі, клопаты ў Войцэха Іванавіча самыя зямныя. Не так даўно пры сельскім Савеце адкрылася аддзяленне раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. У полі зроку яго работнікаў — адзінокія састарэлыя людзі, праблемныя сем'і. Праблемныя ў сэнсе злоўжывання спіртным. (І гэта прытым, што на тэрыторыі сельсавета пражывае шмат вернікаў.) Да нядаўняга часу такіх сем'яў было 12, але не так даўно Коўзан настаяў, каб камісія па справах непаўналетніх уключыла ў групу сацыяльнай рызыкі яшчэ адну. І гэта не проста фармальнасць. Цяпер, калі пасля адпаведных сігналаў суседзяў ці па выніках плановых праверак такой сям'і вынесуць два папярэджанні, на трэці раз можна будзе смела ініцыяваць працэдуру адабрання дзяцей і быць упэўненым, што гэта надоўга не зацягнецца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПРА ГЭТА ГАВОРАЦЬ

«ЗА» І «СУПРАЦЬ» ЛІЧЫЛЬНІКАЎ

У Магілёўскай вобласці ідзе масавая ўстаноўка індывідуальных прыбораў уліку вады

З улікам працы абласной ЖКГ ва ўсе папярэднія гады цяпер каля паловы фонду шматкватэрных дамоў рэгіёна аснашчана лічыльнікамі халоднай і гарачай вады. І калі раней людзей даводзілася ўсімі сіламі ўгаворваць усталяваць лічыльнікі, то цяпер свядомыя жыхары самі праяўляюць ініцыятыву.

— А што рабіць? — рытарычна пытаецца Таццяна, якая жыве ў магілёўскай шматпавярхоўцы. — У пад'ездзе амаль усе маем суседзі паклапаціліся пра лічыльнікі, а засталіся без прыбораў толькі некалькі кватэр. І калі ў якой з іх, напрыклад, пацячэ ўнітаз, то і на мяне «падзеляць» гэты фінансавы цяжар. Ды яшчэ на першым паверсе цырульня размясцілася, дзе няспынна мыюць валасы кліентам...

— Не, цырульня не мае ніякага дачынення да расходу вады жыхарамі дома — там свае лічыльнікі, — папраўляе намеснік начальніка ўпраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Каваленка. — Але ў астатнім высновы правільныя. У пад'ездах, дзе болей за 20 кватэр, стаяць групавыя лічыльнікі вады, і пэўная колькасць выдаткаў (пасля вылічэння паказанняў індывідуальных лічыльнікаў у кватэрах) сапраўды падзеліцца на тых, хто не мае прыбораў уліку.

Масавае ўсталяванне індывідуальных лічыльнікаў вады ў кватэрах пачалося пасля адпаведнага даручэння Прэзідэнта і прыняцця рашэння аблвыканкама ў лютым гэтага года. У дакументе запісана, што ў 2007 годзе трэба ахапіць прыборамі ўліку ўвесь шматкватэрны фонд вобласці.

— І некаторыя раёны з гэтай задачай спраўляюцца, — запэўніў Андрэй Каваленка. — Напрыклад, Чэрыкаў на сёння выканаў заданне на 70 працэнтаў. Вядома ж, у гэтым райцэнтры толькі 750 кватэр — тут не параўнаць аб'ёмы з Магілёвам, дзе кватэр 78 тысяч. Льняная доля шматкватэрнага жыллёвага фонду прыпадае, натуральна, на абласны цэнтр і горад Бабруйск. І ў гэтых гарадах заданне выканана на 30 працэнтаў і крыху болей.

У жыллёва-камунальнай гаспадарцы распавядаюць, што цяжка было пераламаць псіхалогію насельніцтва. Людзей пераконвалі на сустрэчах у працоўных калектывах, работа вялася праз дамавыя і вулічныя камітэты. Кіраўнікі ЖКГ і цяпер выступаюць у СМІ, у гарадах вісяць плакаты і лозунгі.

Людзей удавалася прывабіць скідкамі. Вядома, што на працягу трох гадоў вада каштуе на 20 працэнтаў ніжэй для тых, хто ўсталяваў лічыльнікі. А за самі прыборы ўліку і работы па іх установцы (у Магілёве гэта каштуе каля 130 тыс. рублёў) можна плаціць растэрмінавана — аж да шасці месяцаў. Ёсць і іншыя льготы. Маламаёмасным прыборы ўліку ставяцца бясплатна, а адзінокія пенсіянеры плацяць толькі за ўстаноўку — за самі прыборы плаціць не трэба. Акрамя гэтага, спецыялісты падлічылі, што выходзячы з цяперашніх тарыфаў тэрмін акупляльнасці лічыльніка — каля трох гадоў. Асабліва выгада адчуваецца там, дзе ёсць гарачая вада — кошт падагрэву вады даволі высокі.

Нягледзячы на гэта, ёсць людзі, якія катэгарычна адмаўляюцца ставіць індывідуальныя прыборы ўліку вады.

— Мы толькі нядаўна завяршылі рамонт і тады не падумалі пра лічыльнікі, — гаворыць жыхар Бабруйска Міхаіл. — Цяпер, каб устанавіць прыборы, нам трэба палову сцяны разламаць, а гэта ўжо надта вялікія выдаткі.

— А я лічу, што мы за ваду заплацім і без лічыльнікаў, — падхоплівае яго жонка Алена. — Вада ж недарагая, праўда? І тарыфы наўрад ці будуць рэзка ўзнімацца.

Вада сёння сапраўды каштуе няшмат: 256 рублёў за кубаметр (тысячу літраў). Але гэта цана, верагодна, будзе павялічвацца. Тым больш што «доля» энергарэсурсаў складае прыкладна палову кошту вады — бо ваду здабываюць і прапампоўваюць электрычнымі помпамі.

І, урэшце, навошта плаціць за ваду, якую не спажываеш? Бо, як сведчаць уладальнікі індывідуальных прыбораў уліку, сям'я спажывае заўважна меней вады, чым гэта прадугледжана нормамі.

— Зразумела, ёсць і аб'ектыўныя фактары, якія тармозяць ўстаноўку лічыльнікаў, — прызнае Андрэй Каваленка. — Напрыклад, у старых дамах, дзе патрэбна замена стаяка. Альбо ў тых дамах, дзе не прадугледжана сістэма цыркуляцыі гарачай вады і дзе трэба чакаць, пакуль з крана пойдзе гарачая вада. Але гэтыя праблемы таксама вырашальныя, вось толькі тут патрэбны час і сродкі. А ўвогуле сёння, паводле апытанняў, 40 працэнтаў насельніцтва падтрымліваюць установку лічыльнікаў, 35 працэнтаў — яшчэ не вызначыліся, і прыкладна 20 працэнтаў — супраць.

На працягу трох гадоў вада каштуе на 20 працэнтаў ніжэй для тых, хто ўсталяваў лічыльнікі.

У самога намесніка начальніка абласнога ЖКГ лічыльнікі ўстаноўлены яшчэ летась. Па-першае, работнікі жыллёвай гаспадаркі, што цалкам лагічна, былі ў авангардзе карыстання прыборамі ўліку: як пераконваць іншых, калі сам не маеш? А другой прычынай, як у магіляўчанкі Таццяны і ў многіх іншых, стала нежаданне плаціць за кагосьці. Бо не сакрэт, што ў суседняй кватэры можа жыць болей людзей, чым прапісана. І ёсць розніца ў расходзе вады для тых, хто цэлы дзень сядзіць дома, і ў тых, хто ходзіць на працу, а на выхадныя дні зусім з'язджае. Сям'я Каваленкі якраз належыць да ліку апошніх.

Яшчэ адзін аргумент за лічыльнікі — эканомія. Як толькі ў чалавека з'явіцца індывідуальны прыбор, ён не будзе адкрываць ваду на поўны напор, калі ў гэтым няма неабходнасці, і ніколі не дапусціць працякання ўнітаза. Таму што туды спускаюцца яго грошыкі. Але ж галоўны аргумент уладаў на карысць усталявання прыбораў уліку — эканоміць не толькі чалавек, але і дзяржава. Для ўсталявання лічыльнікаў у кватэрах прыцягваюцца дадатковыя брыгады прамысловых прадпрыемстваў — сваіх у жыллёва-камунальнай гаспадарцы не стае. Працы сёння хапае ўсім. Некаторыя прадпрыемствы ставілі лічыльнікі сваім работнікам альбо дапамагалі ім у гэтым фінансава.

Ёсць, вядома ж, і праблемы. Сітуацыя са стаякамі і вентылямі ў некаторых будынках такая, што даводзілася адключаць ваду ў цэлым доме: усе жыхары заставаліся без вады на некалькі гадзін, ды яшчэ гэта паўтаралася не адзін дзень. Праўда, людзям тлумачылі сітуацыю, і яны ставіліся з разуменнем: што ж, лічыльнікі — гэта добра.

Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення ЖКГ, у Магілёўскай вобласці сёння ўсталявана 33 працэнты ад патрэбнай колькасці (54 тысячы пры неабходнасці 167 тысяч).

Акрамя ўзгаданага вышэй Чэрыкава, трэба адзначыць таксама Слаўгарад, Мсціслаў, Чавусы, Бялынічы, Клічаў. У гэтых сельскіх раёнах цяпер выканана больш за палову задання.

— Мяркую, што ў наступным годзе мы гэтую кампанію завершым, — лічыць Андрэй Каваленка. — Трэба яшчэ, акрамя шматкватэрнага фонду, ставіць лічыльнікі і ў прыватным сектары. Гэта магчыма зрабіць там, дзе вада праведзена ў дом. Я думаю, што ў будучыні ўсё будзе лічыцца і рэгулявацца. Нас чакае і масавая ўстаноўка лічыльнікаў на газ, а таксама і на цяпло. Мы прыйдзем да гэтага. А пакуль я раю ўсім усталяваць індывідуальныя прыборы ўліку на ваду і зразумець, што на гэтым можна сапраўды эканоміць.

Ілона ІВАНОВА.

У КРАМУ, ЯК У «МАРКЕТ», або «Аграгарадскі» камфорт для вясковай талакі

Некалькі гадоў таму ў цэнтральных сядзібах аграпрамысловых прадпрыемстваў пачалі абуладкоўвацца аграгарадкі. Першым населеным пунктам «новага тыпу» ў Валожынскім раёне стала вёска Доры. Статус аграгарадка яна атрымала ў 2005-м. Безумоўна, сацыяльную сферу «з нуля» адраджаць не прыйшлося, аднак...

На многіх аб'ектах даўно ўжо неабходна было правесці капітальны рамонт, паколькі будынкі прыходзілі ў заняпад. Грошай «як заўсёды» не хапала, таму перспектывы пераўтварэння ў аграгарадок сталі для Дораў сапраўдным шанцам на будучыню. Зараз тут працуюць адукацыйны комплекс «сярэдняя школа-дзіцячы садок», школа мастацтваў, фельчарска-акушэрскі пункт, філіял банка, аддзяленне сувязі, сельскі Дом культуры, добрая крама. Сталовая, якая дагэтуль была «закансервавана», пачала прымаць наведвальнікаў. Адчынілася і кафэ — прыватнікі, уважыўшы ўсе перавагі аграгарадскога жыцця, вырашылі размясціць сваю «кропку» менавіта тут. Дарэчы, паводле слоў тутэйшых жыхароў, усе «плюсы» цяперашняга сэрвісу вяскоўцы адразу ацанілі. «У краму пасля яе пераабсталявання хадзілі не толькі для таго, каб нешта купіць, а і проста паглядзець, — заўважаюць месцічы. — На паліцах усякіх тавараў багата — як у гарадскіх «маркетах». Тутэйшы Дом культуры таксама пераўтварыўся, на яго сцэне не толькі вясковыя ці раённыя калектывы мастацкай самадзейнасці выступаюць, прыязджаюць нават беларускія «зоркі» — узгадваюць, што аднойчы тут была з канцэртам Ірына Дарафеева. Спачатку здавалася непрывычным для вяскоўцаў такое жыццё, тым больш што аграгарадок быў першым у раёне. Таму здзіўляцца давялося многаму.

— Сённяшні ўзровень абслугоўвання рэальна набліжае вёску да горада, — кажа старшыня Дорскага сельскага Савета Рамуальда Іваноўская.

Зразумела, падчас абуладкавання аграгарадка не ўсё ўдалося зрабіць, да прыкладу, у плане добраўпарадкавання, аднак гэта справа часу.

Больш магчымасцяў з'явілася і ў мясцовай улады — сельскі Савет цяпер працуе з дапамогай сучаснай аргтэхнікі. Камп'ютары ў свой час цэнтралізавана былі закуплены праз Мінскі аблвыканкам, так што з Дораў можна аператыўна выйсці на сувязь не толькі з раёнам, а і з патрэбнымі міністэрствамі і ведамствамі. Маецца ўся неабходная нарматыўна-прававая база ў электронным варыянце, якая пастаянна абнаўляецца. Так што можна без усялякіх перашкод своечасова вырашаць надзённыя праблемы жыхароў. Як заўважае Рамуальда Браніславаўна, раней не ўсе разумелі важнасць камп'ютараў для арганізацыі працы сельскага Савета, затое цяпер жыцця без незаменнай «электронікі» не ўяўляюць.

Між тым, дэмаграфічная сітуацыя тут па-ранейшаму застаецца цяжкай: летась на тэрыторыі Дорскага сельсавета памерлі 24 жыхары, а на свет з'явілася толькі шэсць немаўлят, шлюбам пабраліся сем сямейных пар. Напэўна, усе каментарыі тут залішнія... Аднак сітуацыя не безвыходная.

— Мясцовая гаспадарка (сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Дорскі») актыўна будуе жыллё, — заўважае Рамуальда Іваноўская. — За апошнія некалькі гадоў было здадзена ў эксплуатацыю больш чым тры дзесяткі сучасных катэджаў, усе яны заселены. У бліжэйшых планах — яшчэ 10 камфартабельных дамоў. Штогод да нас прыязджаюць 30—40 чалавек, прычым не толькі з Мінскай вобласці. Адна сям'я спачатку адсюль у горад «збегла», а пасля вярнулася, атрымала дом, цяпер муж і жонка працуюць у гаспадарцы.

Жывёлы на падворках сучасных вяскоўцаў становіцца ўсё менш. Такая сітуацыя адзначаецца паўсюль, не стаў выключэннем і Дорскі сельсавет. Па-першае, усе неабходныя прадукты харчавання можна зараз купіць у краме — заўсёды ёсць тая ж мясная, малочная прадукцыя ў самым шырокім асартыменце.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

РЭЗЕРВЫ ЭКАНОМІІ

«ФІРМА» ВЕНІКАЎ НЕ ВЯЖА. А вось дровы нарыхтоўвае

Сваім сярод сваіх лічаць старшыні сельскіх Саветаў раёна дырэктара Смалявіцкага філіяла дзяржаўнага прадпрыемства «Мінаблпаліва» Аляксандра Лашука. Яго так і называюць — наш «трынацаты сельсавет». Чаму? Па тлумачэнні я звярнуўся да старшыні Пліскага сельскага Савета Аляксандра ЛЯХОЎСКАГА.

— А таму, што ў многім функцыі і задачы ў нас, сельсаветаў, і прадпрыемства, якое ўзначальвае Аляксандр Міхайлавіч, амаль аднолькавыя. Як і для нас, для яго галоўнае — клопат пра людзей. Акрамя гэтага, Лашук, на мой погляд, адзін з самых актыўных дэпутатаў Пліскага сельскага Савета і раённага Савета. Ён пастаянна жыве праблемамі мясцовай улады, і не толькі выдатна ведае і разумее іх, але і па меры сваіх магчымасцяў дапамагае вырашаць. Працуем мы нібы ў адной звязцы, — гаворыць Аляксандр Ляхоўскі.

Як ператварыць даўгі ў прыбытак?

У пацвярджэнне сваіх слоў Ляхоўскі расказаў, як на тэрыторыі яго сельсавета наладжаны працэс забеспячэння мясцовымі энераносьбітамі. Вяскоўцам няма патрэбы ехаць у Смалявічы, каб заказаць машыну дроў ці брыкету. У будынак сельскага Савета, а то і ў вёскі ў вызначаны загадзя тэрмін прыязджаюць супрацоўнікі філіяла і на месцы прымаюць заяўкі, аплату за паліва. Праз пэўны час людзям прама да хаты ці нават у двор прывозяць заказанае. Вельмі зручна, асабліва для сталых людзей ці інвалідаў.

Старшыні сельскіх Саветаў «фірму» Лашука па звычцы часта завуць па-ранейшаму — «гарпаліва». Ён у прынцыпе не супраць і ў сваю чаргу старшынь сельскіх Саветаў кліча калегамі. У размове са мной так і абмовіўся аднойчы: вось днямі патэлефанаваў адзін калега...

І сапраўды, з «калегамі» ён пастаянна бачыцца на сесіях райсавета, часта прысутнічае на нарадах з удзелам старшынь сельскіх Саветаў, у цесным кантакце з імі працуе над пастаўленымі задачамі. Раз у месяц разам з прадстаўнікамі раённых службаў Лашук наведвае пэўны сельсавет, дзе ў час сустрэч з вяскоўцамі часта ўзнімаецца актуальная сёння тэма эканоміі энергарэсурсаў і паліва. У гэтых размовах Аляксандр Міхайлавіч нярэдка спасылаецца на ўласны вопыт.

Занятца энергазберажэннем, у дадзеным выпадку перайсці на мясцовыя энераносьбіты, Аляксандра Лашука прымусілі цяжкія абставіны. Хутка споўніцца тры гады з таго часу як ён узначаліў гарпаліва. Спадчыну атрымаў такую, што, як гаворыцца, ворагу не пажадаеш — стратная гаспадарка без відавочных перспектыў выхаду з крызісу. На двары стаяў снежань, а ў памяшканнях было па-зімняму холадна. За вялікія даўгі суседні завод жалезабетонных вырабаў (паслугамі яго кацельнай карысталася гарпаліва) адключыў іх ад забеспячэння цяплом. Прадпрыемства «сядзела на картатэцы» і хутка знайсці грошы на ацяпленне было не магчыма. Вось новы кіраўнік і вырашыў наладзіць уласнае ацяпленне, тым больш што дроў хапала, абрэзкамі драўніны быў завалены гаспадарчы двор.

Без прамаруджання ўдалося па лініі тэхнічнага пераабсталявання атрымаць грошы на набыццё двух катлоў на дровах, у памяшканнях уладкавалі дадатковыя радыятары. І з таго часу праблем з ацяпленнем не ўзнікае. Прычым пераважна ў якасці паліва выкарыстоўваюць адыходы дроў і абрэзкі, прыкладна дзесяць кубаметраў штомесяц у ацяпляльны сезон. Такім чынам, выдаткі мізэрныя, бо спальваюцца выключна адыходы. Раней гэтыя абрэзкі вывозілі на звалку, у лепшым выпадку прадавалі за капейкі насельніцтву.

Несумненныя перавагі выкарыстання мясцовых энераносьбітаў сталі відавочныя сёлета. Дарэчы, на газ Лашук перавёў два свае ЗІЛы, якія дасталіся з мінулых часоў. Ну вельмі ж пражэрлівыя аўтамабілі — «з'ядалі» 38 літраў на 100 км. У выніку дастаўка дроў і іншых вырабаў насельніцтву патанне-ла.

Надзвычай запатрабаваны вяскоўцамі аказалася прадукцыя ўчастка па вырабу трохметровых секцый плота. Гэтыя гатовыя элементы дастаткова прымацаваць да слупкоў — вакол сядзібы з'яўляецца прыгожая агароджа. Сёння прадпрыемства завалена заказамі на выраб секцый. Аляксандр Міхайлавіч прызнаецца, што калі два гады таму ён арганізоўваў гэты ўчастак, то сумняваўся наконт попыту на дадзеную прадукцыю. Але цяпер цікавасць да яе літаральна шалёная. Сярод спажыўцоў не толькі вяскоўцы, але гаспадары навакольных дач, сельскія Саветы і нават бліжэйшыя аграгарадкі. (Лашук паказаў тоўстую папку заявак на выраб секцый плота і пашкадаваў, што ўсе іх хутка задаволіць не дазваляе абмежаванасць вытворчых магутнасцяў.)

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ВЁСКА З МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Раней, да з'яўлення аддзялення сацыяльнага абслугоўвання, старшыня Савета сам пастаянна ездзіў з урачамі па «цяжкіх», глядзеў, ці дома бацькі, ці накормленыя малыя... Дарэчы, сваіх дзяцей у Коўзана пяць. Войцэх Іванавіч упэўнены, што іх лёгка выхоўваць тады, калі яны яшчэ ляжаць упоперак ложка. Выхаваўчы працэс ні ў якім разе нельга пускаць на самацёк незалежна ад таго, восем год твайму нашчадку ці васемнаццаць...

— Пасля выхаду Дэкрэта Прэзідэнта № 18 аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей нашы «цяжкія» мамы і таты атрымалі на рукі распрацаваныя сельскім Саветам спецыяльныя памяткі, дзе па пунктах выкладзена ўсё тое, за што яны нясуць адказнасць і ў сувязі з чым могуць быць пакараны. Дарэчы, гэта вельмі сур'ёзна, у тым ліку і для кіраўнікоў розных узроўняў.

Хуткіх вынікаў мы не чакаем — выхаваўчы працэс усё ж марудны. Але, скажам, у сям'і Барысевічаў ужо заўважны відавочны прагрэс. Я перагаварыў з ляснічым Гальшанскага лясніцтва, і бацьку сямейства ўзялі на працу. Магчыма, адносіны ў сям'і і наладзяцца...

■ ■ ■

На пытанне, як жывецца людзям у сельсавеце, Войцэх Іванавіч адказвае адным словам: камфортна. Магчыма, не ў кожным з 47 населеных пунктаў, але ў Гальшанах — дакладна. 22 дзяржаўныя сацыяльныя стандарты выконваюцца па ўсім сельсавеце. Ёсць тут тры кафэ, месцы ў якіх на выхадныя дні распісаны на два месяцы наперад. У магазіны пасля рэканструкцыі прыемна зайсці, гэтак жа, як і ў камбінат бытавога абслугоўвання. Войцэх Іванавіч шчыра рассмяяўся, пачуўшы ад мяне, што ў адным з сельсаветаў вянкі для пахавання былі выстаўлены на продаж у пакоі, дзе аказваюцца цырульніцкія паслугі — побач з сушкай для валасоў. («Ведаеце, я пабаяўся б сесці ў крэсла да такога цырульніка!»). У Гальшанскім быткамбінаце загадчыца сядзіць у асобным кабінеце, дзе знаходзяцца ўзоры прадукцыі. Асобна — зала для пашыву адзення, цырульня, склад для рытуальных прыналежнасцяў.

І ўсё ж па аграгарадку застаецца яшчэ шэраг пытанняў. У асноўным, патрэбны невялікія дапрацоўкі, але іх шмат. Сродкі пад гэта будуць выдзяляцца з артыкула на добраўпарадкаванне. Сёлета, лічыць Войцэх Іванавіч, далі грошай «не густа» — усяго 20 млн рублёў. Таму ў адпаведнасці з прынятым Указам Прэзідэнта № 21 ад 12 студзеня «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва» Гальшанскі сельскі Савет да 1 чэрвеня падаў раённым уладам усе падлікі і ўдакладненні па сваім бюджэце на 2008 год. У выніку Гальшанам запланавана выдзеліць больш за 100 млн рублёў.

— Гэтай сумы таксама малавата, — гаворыць Коўзан, — бо з яе адразу трэба вылічыць грошы за асвятленне вуліц. Але будзем эканоміць, шукаць іншыя рэзервы...

Эканоміць электраэнергію ў Гальшанах пачалі з красавіка, паколькі ў сакавіку перарасходавалі яе на 12 працэнтаў. Затое пасля ўстаноўкі рэле часу спажыванне энергіі скарацілася на 40 працэнтаў. (Святло ўключаецца і выключаецца ў залежнасці ад часу сутак.)

— Самае цяжкае — патлумачыць неабходнасць эканоміі людзям, якія цудоўна ведаюць пра стандарты і патрабуюць сваё.

■ ■ ■

Шмат работы з фасадамі і агароджамі, іх трэба давесці да ладу і на цэнтральнай Ашмянскай вуліцы, і на іншых. І не толькі ў Гальшанах. Войцэх Іванавіч не разумее тых, хто да самага звычайнага патрабавання мясцовай улады — навесці парадак на сваім падворку — ставіцца выходзячы з прынцыпу: табе трэба, ты і наводзь... Ды не старшыні Савета гэта трэба, дакладней, не яму аднаму. Проста дом, двор, тэрыторыя каля дома — той маленькі свет, з якога пачынаецца шлях у свет вялікі. І гэты шлях не павінен быць засмечаным. Такія вось простыя ісціны...

Цяпер у Гальшанах паставілі кантэйнеры для смецця, раз на тыдзень з раённай ЖКГ прыязджае машына і вывозіць яго... Сёння і міні-палігоны перададзены на баланс раённай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Але гэтага недастаткова.

— Я ўпэўнены, — гаворыць Войцэх Коўзан, — што ўчасткі ЖКГ ці камунальныя прадпрыемствы павінны быць у кожным вялікім сельсавеце. У нас ім дакладна знайшлася б работа. У адных толькі Гальшанах 17 вуліц — іх трэба падтрымліваць у парадку... Раніцай у панядзелак едзеш на працу, па баках глядзець не хочацца — столькі смецця застаецца пасля вячэрняй дыскатэкі. Але для стварэння такога камунальнага ўчастка патрэбны дазвол больш высокіх інстанцый. Я хадайнічаў ужо перад райвыканкамам, ды зрухаў пакуль што няма. Прычыны мне зразумелыя — усё ўпіраецца ў грошы, у недахоп тэхнікі. А ўзяць у калгасе старызну ў самога рука не паднімаецца — астатняе жыццё будзеш на запчасткі працаваць. Ды і вадзіцеля на дабіты трактар не загоніш... Так што пытанне гэта з парадку дня не здымаецца.

■ ■ ■

Затое Коўзану, паводле яго ўласнага прызнання, сапраўды пашанцавала з сельскагаспадарчым прадпрыемствам — СВК «Гальшанскім». Гэта адна з самых моцных гаспадарак у раёне — з усімі станоўчымі для сельсавета вынікамі. Апрацоўка прысядзібных участкаў, дастаўка паліва для насельніцтва, дапамога ў добраўпарадкаванні ніколі не з'яўляліся і не з'яўляюцца для СВК праблемай.

— За год работы я пераканаўся, што ўзаемаразуменне з кіраўніком сельскагаспадарчага прадпрыемства, размешчанага на тваёй тэрыторыі, — ужо 50 працэнтаў поспеху. А калі гэты кіраўнік у дадатак яшчэ і разумны, кемлівы, — лічы, пашанцавала на ўсе 100, — гаворыць Войцэх Коўзан.

Дарэчы, у СВК дастаткова жорстка вырашаюцца ўсе праблемы з алкаголем. Праштрафіўся — поўнасцю пазбаўляешся прагрэсіўкі. Нават калі 29 дзён з 30 працаваў бездакорна.

— Нармальны метад, у гэтым сэнсе я абсалютна згодны з кіраўніком прадпрыемства Мікалаем Праўко. Паважаеш людзей ты, будуць паважаць цябе і тваю працу.

...Сам Войцэх Іванавіч жыве са сваёй сям'ёй у суседнім — Баруснскім сельсавеце. І, як і іншыя жыхары-аднавяскоўцы, рэгулярна атрымлівае пісьмовыя паведамленні мясцовага сельвыканкама аб неабходнасці сачыць за парадкам на сваім падворку.

— Гэта тут, у Гальшанах, я — старшыня Савета, — усміхаецца Коўзан. — А там — звычайны жыхар, які павінен выконваць распараджэнні мясцовай улады. Што і раблю...

Наталля КАРПЕНКА.

P.S. *А замак у Гальшанах, вядома, не «чорны», як у творы Караткевіча, — хаця б таму, што пабудаваны з цэглы, якая мае карычнева-чырвоны колер...*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Ашмянскі раён.

«ФІРМА» ВЕНІКАЎ НЕ ВЯЖА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Зноў жа заняцца гэтай справай падказала жыццё. Да прыходу сюды Лашука гарпаліва займалася продажам брыкету, нарыхтоўкай і колкай драўніны на дровы. Апошнія пастаўлялі насельніцтву і асобным установам у аб'ёме 50 кубоў штомесяц. Цяпер — 400 кубоў. І не ўсім адразу ўдаецца дагадзіць. Спраўляцца з гэтымі аб'ёмамі вельмі цяжка. Самае большае, што можна атрымаць ад продажу паліва — пяць працэнтаў рэнтабельнасці. Гэтых сціплых прыбыткаў з часам стала востра не хапаць з-за росту выдаткаў на гаручае для тэхнікі, павышэння тарыфаў на электраэнергію і г. д. А ўзняць строга фіксаваныя цэны на мясцовае паліва нельга. Абслугоўвае гарпаліва пераважна людзей малазабяспечаных, у асноўным вяскоўцаў сталага ўзросту, адзінокіх старых, інвалідаў, людзей, якія жывуць на адну пенсію. Вось і ўзнікла ў Лашука думка адкрыць участак па вырабу секцый плота.

Але спачатку трэба было набыць і ўсталяваць піларараму, каб мець неабходны матэрыял для патрэб участка. Лашук узяў з дапамогай цэнтра занятасці крэдыт на 15 млн рублёў пад стварэнне новых працоўных месцаў, і неўзабаве ў гарпаліве пілавалі лес на дошкі. Участак, дзе вырабляюць секцыі плота, стаў даваць 30 працэнтаў рэнтабельнасці, з'явілася свая капейка. Для параўнання: да прыходу Лашука тут было на 8 млн рублёў даўгоў, цяпер на рахунку 40 мільёнаў чыстага прыбытку. Толькі з пачатку года ўчасткам выраблена больш за 15 кіламетраў плота, распілаваны сотні кубоў леса для насельніцтва.

Грошы далі магчымасць для вытворчых манеўраў. Сёння ў Лашука галава моцна не баліць аб тым, як выконваць заяўкі вяскоўцаў і сельсаветаў па прымальных цэнах. Як вядома, апошнім часам лес істотна падаражэў. Скажам, на аўкцыёне круглы лес каштуе 120 долараў за куб. Рэдкі вясковец мог бы дазволіць сабе задавальненне паставіць новую агароджу, калі б Лашук купляў драўніну па такіх цэнах. Таму ён стварыў пры гарпаліве брыгаду лесарубаў. І цяпер асабліва праблем з сыравінай няма. Палову драўніны нарыхтоўвае свая брыгада, палову пастаўляе лясгас. Зразумела, драўніна сюды ідзе не самая лепшая, часцей за ўсё паваленыя дрэвы, санітарныя высечкі.

Але гэтых, паводле слоў Аляксандра Міхайлавіча, сціплых вынікаў наўрад ці ўдалося б дасягнуць без супрацоўніцтва з мясцовай уладай. Менавіта дзякуючы дапамозе райсавета і райвыканкама ўдалося ператварыць стратнае прадпрыемства ў прыбытковае, умацаваць вытворчую базу, павялічыць

«Раней абрэзкі вывозілі на звалку. Цяпер імі ацяпляюць памяшканні».

аб'ёмы паставак паліва і пашырыць паслугі.

Заўважу, прадпрыемства не падпарадкоўваецца непасрэдна раёну, яно — філіял абласной арганізацыі. Тым не менш поспех калектыву залежыць ад узаемаразумення з раённымі ўладамі. Лашук прывёў такі прыклад. Штодзень яго прадпрыемства павінна пастаўляць людзям шэсць машын паліва, у асноўным колатыя дровы. Але перш чым завезці іх канкрэтнаму спажыўцу, трэба даставіць на тэрыторыю прадпрыемства шэсць трактарных прычэпаў двухметровых чурак. Трактар у дзень можа выконваць толькі два рэйсы. Пры гэтым у лес разам з ім неабходна было накіроўваць грузчыкаў. Атрымлівалася дорага і марудна.

Аляксандр Міхайлавіч звярнуўся да мясцовай улады з просьбай дапамагчы, у тым ліку і матэрыяльна, з лесавозам. Вядома, не новым. Лашуку пайшлі насустрач. Неўзабаве за 25 млн быў набыты старэнькі, але яшчэ моцны лесавоз «Урал», яго адрамантавалі, тое-сёе замянілі. Добра, што падыходзілі запчасткі беларускай вытворчасці. (Між іншым, новы лесавоз каштуе 120 млн.)

Пашанцавала, гаворыць Лашук, і на вадзіцеля лесавоза Анатоля Дзюсава: выдатны спецыяліст, старанна выконвае свае абавязкі. Таксама адказна працуе вопытны піларамшчык шостага разраду Аляксандр Грак. Вяскоўцы вельмі цэняць яго, імкнуцца, каб менавіта Аляксандр Уладзіміравіч апрацаваў іх лес, бо ён бездакорна пілуе нават 12-метровыя дрэвы. На сваім месцы дрываколы Юрый Кулінковіч і Андрэй Тарасюк. Невыпадкова па паказчыку аказання паслуг насельніцтву сярод роднасных прадпрыемстваў Смалявіцкі філіял займае чацвёртае месца ў вобласці — пасля Мінскага, Слуцкага і Салігорскага раёнаў. Дарэчы, за гэтыя дасягненні калектыву сёлета Аляксандр Лашук быў узнагароджаны ганаровай граматай аблвыканкама.

Зразумела, ён ганарыцца тым, што прадукцыя прадпрыемства ідзе на ўпрыгожванне роднага Смалявіцкага раёна. Яму прыемна, што не толькі старшыні Саветаў, якія па абавязку павінны клапаціцца аб навядзенні парадку на сваіх тэрыторыях, але і звычайныя людзі хочуць добраўпарадкаваць сваю тэрыторыю.

— Нядаўна адной бабульцы з Азярыцкай Слабады завезлі 25 секцый плота. Кожны фрагмент каштуе 32 тысячы. Плюс дастаўка. Назбіралася 700 тысяч. І такіх выпадкаў шмат. Каму дарослыя дзеці дапамагаюць, хто сам паступова збірае грошы. Агульная тэндэнцыя — людзі хочуць, каб іх месца жыхарства вабіла вока, — гаворыць Аляксандр Міхайлавіч.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Смалявіцкі раён.

КАПЕЙКА РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ

ДЫЛЕМА ВУЛІЧНАГА АСВЯТЛЕННЯ

Пры рэалізацыі Дырэктывы № 3 некаторых старшынь Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню завадзіць у тупік «дылема вулічнага асвятлення»: як зэканоміць электраэнергію і пры гэтым забяспечыць выкананне дзяржаўнага сацыяльнага стандарту? Насамрэч, выйсце ёсць. Вось якім яго ўбачылі для сябе ў Бабруйскім раёне.

— Штомесяц для кожнага сельсавета мы распісваем шэраг мерапрыемстваў па скарачэнню затрат на вулічнае асвятленне, — патлумачыў нашаму карэспандэнту **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ.** — Працуем у цеснай сувязі з раённымі электрасеткамі. Напрыклад, толькі ў гэтым годзе ў нас было ўстаноўлена 1100 энергазберагальных святлільнікаў. А гэта — адчувальная эканомія. За 8 месяцаў на вулічнае асвятленне ў 12 сельскіх і адным пассавеце было зрасходавана 142 млн 551 тыс. 600 рублёў. Усяго на 2007 год на гэтыя мэты ў раённым бюджэце закладзена 274 млн 408 тыс. рублёў. Як бачым, на 4 апошнія месяцы (верасень, кастрычнік, лістапад, снежань) нам застаецца 131 млн 856 тыс. рублёў. Можна меркаваць, што 45—50 млн рублёў мы рэальна зэканомім. Гэтыя сродкі мы можам расходаваць на набыццё лямпачак, на ўстаноўку рэле часу. Сёлета толькі за кошт зэканомленых сельвыканкамамі сродкаў было ўстаноўлена 31 такое рэле ў населеных пунктах Вялікія Бортнікі, Сычкава, Гарбацэвічы, Глуша.

Паводле слоў Леаніда Андрэевіча, праграмуемае астранамічнае рэле часу з пункту гледжання рэальнай эканоміі паспела добра сябе зарэкамендаваць:

— Аднаго фотарэле для сур'ёзнай эканоміі недастаткова, — працягвае старшыня. — Бывае, у пахмурнае надвор'е вёска і «днём з агнём». А рэле часу дае больш магчымасцяў вар'іраваць працягласць працы ліхтароў. Скажам, можна запраграмаваць рэле часу адключаць асвятленне ў 23.00 і ўключаць ў 5.00, калі на вулічным пачынаецца актыўны рух. Гэта вельмі перспектыўны накірунак, які мы будзем актыўна развіваць і надалей.

Па расходах на вулічнае асвятленне старшыні сельскіх і пасялковых выканкамаў Бабруйскага раёна трымаюць справаздачу кожны месяц. Ад вынікавасці гэтых справаздач напрамую залежыць памер іх прэміі.

— У мяне на руках заўсёды маецца інфармацыя з аналізам спажывання электраэнергіі на вулічнае асвятленне не толькі па кожнаму сельсавету, але і па кожнаму лічыльніку, — распавядае Леанід Баркоўскі. — Мы фіксуем апошняе паказанне, розніцу з папярэднім, улічваем каэфіцыент і ўмоўны расход. Напрыклад, возьмем Слабадкоўскі сельсавет, там 28 лічыльнікаў. У вёсцы Туголіца за жнівень нагарэла 511 кВт, у Варановічах — 642 кВт, а ў пасёлку Юбілейны — аж 900. Адразу ўзнікае пытанне: чаму ў Юбілейным такі вялікі расход? Неадрэгулявана рэле ці сам лічыльнік не ў парадку? Мы перадаём гэтую інфармацыю электрасеткам, а яны аператыўна выпраўляюць непаладкі. Своечасова адрэгуляваць рэле (асабліва восенню і зімой, калі цямнее рана) — гэта самы важны момант у пытанні эканоміі электраэнергіі сельвыканкамамі.

Для таго каб выявіць збоі ў рабоце рэле, мы разам з работнікамі раённых электрасетак рэгулярна праводзім рэйды. Акрамя таго, у кожнага старшыні ёсць свой актыў — старасты і сельскія камітэты, якія таксама своечасова сігналізуюць аб непаладках рэле і лямпачак, якія перагарэлі. Увогуле, мясцовыя жыхары вельмі зацікаўленыя ў тым, каб з вулічным асвятленнем у іх не ўзнікала ніякіх праблем.

На пасяджэннях Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання неаднаразова адзначалася, што ў Магілёўскай вобласці лепш, чым у іншых, наладжана работа па вулічнаму асвятленню. Спецыялістам астатніх абласцей ёсць чаму павучыцца ў «Магілёўэнерга».

— Схема супрацоўніцтва з раённымі электрасеткамі ў нас даўно адпрацавана і ажыццяўляецца без збояў, — пацвердзіў Леанід Баркоўскі. — У мясцовых бюджэтах прадугледжаны два расходныя артыкулы — на аплату вулічнага асвятлення і на тэхнічнае абслугоўванне сетак. У старшынь заўсёды ёсць сродкі на набыццё новай лямпачкі і на аплату за выклік спецыяліста, які гэтую лямпачку заменіць.

Норма расходу электраэнергіі на вулічнае асвятленне (для кожнага сельсавета асобна) на працоўных нарадах у раённым Савеце вызначаецца штомесяц.

— Практыка паказала, што нельга ўстанавіць адзіны нарматыў на тры-чатыры месяцы, — патлумачыў Баркоўскі. — У кастрычніку цямнее раней, чым у верасні, у лістападзе працягласць светлавога дня яшчэ меншая. Мы аналізуем аб'ём спажытай энергіі за аналагічны перыяд мінулага года і (з улікам эканоміі) вызначаем заданне па спажыванню на наступны месяц. Гэта і ёсць выкананне Дырэктывы № 3 на практыцы.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

МОЖАМ, КАЛІ ЗАХОЧАМ

З савецкіх часоў многія прывыклі да таго, што аб іх праблемах паклапоціцца дзяржава. Маўляў, мы напішам куды трэба, паскардзімся, што вуліца зарасла бадыллём, што агароджа павалілася ці нахілілася ад ветру — адпаведныя службы ўсё паправяць. Толькі не мы, жыхары той самай вуліцы...

На гэтым фоне кантрастам выглядаюць наступныя прыклады. Вёска Жгунь лічыцца самым прыгожым населеным пунктам у Добрушскім раёне. На кожным кроку тут чысціня, прыгажосць, шмат зеляніны, аб чым паклапацілася мясцовая ўлада (сельскі Савет), кіраўніцтва сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва, а таксама грамадскасць. На чарзе ўжо была дапамога пенсіянерам — жыхарам васьміквартэрнага дома па вуліцы Юбілейнай — у добраўпарадкаванай дваровай тэрыторыі. Але жыхары не сталі чакаць дапамогі, вырашылі навесці парадак уласнымі сіламі.

Ініцыятарам гэтай справы выступіла Аляксандра Жаўнова, і яе актыўна падтрымалі. Сёлетняй вясной людзі разбілі каля дома клумбы. Кветкі з'явіліся і ў вазонах, якія былі расстаўлены на пнях зрэзаных дрэў, і ў пад'ездзе, дзе, дарэчы, пафарбавалі сцены і пабялілі столь. Маладая сям'я Шынкаровых, якая пераехала сюды з райцэнтра, так папрацавала над водаправодным люкам, што ён набыў форму кветкі.

Усё гэта харство можна назіраць і каля дома № 25 Маладзёжнага мікрараёна Светлагорска, дзе таксама ў большасці жывуць пенсіянеры. Іх на добрую справу натхніла Ларыса Андрэйчыкава. І зараз не толькі насельнікаў гэтага дома, але і суседзяў, і проста прахожых радуюць і курыца-нясушка, што «ўселася» ў кошык, і грыбы, што высоўваюць свае шапачкі з-пад кустоў, і кветкі, што вясёлкай рассыпаліся ў палісадніку. А з пад'езда на ўсё гэта харство задаволена пазіраюць дзед ды баба — дэкаратыўныя.

Паклапаціліся аб сваім настрої і жыхары шматпавярховага дома № 1, што па праспекце Кастрычніка ў Гомелі. Знаходзіцца ён у людным месцы — каля рынку і гандлёвага цэнтра, на скрыжаванні дзвюх вуліц. Народ тут ходзіць розны, у тым ліку трапляюцца і бамжы. Каб засцерагчы сябе ад непажаданых сустрэч, жыхары арганізавалі ў пад'ездзе дзяжурства сваімі ўласнымі сіламі. Па графіку. Гэта крыху дапамагло, але не настолькі, каб парадак быў забяспечаны поўнасцю. Тады па ўзгодненню з адміністрацыяй Савецкага раёна горада была створана народная дружына, у якую ўвайшло чатырнаццаць жыхароў дома — ім ручылі адпавядныя пасведчанні. Цяпер парадку на дварэ і ў пад'ездзе стала куды больш. Выпівохі абыходзяць гэты дом бокам, каб пазбегнуць непрыемнасцяў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

У КРАМУ, ЯК У «МАРКЕТ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Таксама свой уплыў аказвае старэнне насельніцтва, многім ужо не па сілах на сваім падворку даглядаць вялікую гаспадарку. З 910 чалавек, што жывуць на тэрыторыі Дорскага сельсавета, больш чым трэць — пенсіянеры, а ў маленькіх вёсках гэтая прапорцыя іншая, там пераважна адны старыя і засталіся. Ды і людзі ў працаздольным узросце не надта імкнуцца трымаць жывёлу, паколькі закупачныя цэны на тое ж малако невысокія, вялікіх грошай тут не заробіш. Таму колькасць кароў за мінулы год зменшылася амаль на трыццаць і цяпер агульны статак свойскай жывёлы налічвае крыху больш за сотню.

На тэрыторыі сельсавета 25 чалавек, якія адносяцца да катэгорыі адзінокіх. Такім надаецца першачарговая ўвага, пры неабходнасці аказваецца матэрыяльная дапамога. З-за абмежаванасці магчымасцяў сельскага Савета прыходзіцца звяртацца з адпаведнай просьбай у райвыканкам, дзе ў такіх выпадках ніколі не адмаўляюць, ідуць насустрач. Дапамогу аказваюць і восем сацыяльных работнікаў, якія абслугоўваюць 11 вёсак Дорскага сельсавета. Гэтыя людзі ўсюды паспяваюць — прынамсі, ніякіх нараканняў на іх работу не было. Дарэчы, не толькі асобным катэгорыям неабходна падтрымка, у ёй мае патрэбу і пэўная колькасць пенсіянераў без ільгот.

— Па падворку заўсёды можна вызначыць, да каго са старых дзеці прыязджаюць і з якой рэгулярнасцю, — лічыць Рамуальда Іваноўская. — Людзям у паважным узросце часцяком самастойна проста не па сілах даглядаць уласную сядзібу. Кожны з іх, зразумела, заўсёды імкнецца нешта рабіць, але з гадамі завіхацца па гаспадарцы становіцца ўсё цяжэй. Асабліва калі дзеці заязджаюць рэдка. Вось тут неабходна і мясцовай уладзе падтрымаць такіх жыхароў, да прыкладу, каб падрамантаваць жыллё.

Дапамагае і СВК «Дорскі», які пачаў уключаць палеткі вяскоўцаў у агульныя палі севазвароту. Выходзячы з памераў участка, пасля ўборкі выдзяляецца збожжа. Пенсіянеры атрымліваюць ураджай з 20 сотак бясплатна, калі неабходна назапасіць больш, то разлічваюцца за зерне па сабекошту. Шкада толькі, што на сена і бульбу такая зручная «схема» не распаўсюджваецца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,

Валожынскі раён.

ВАЕННЫ ГАРАДОК — ПРАБЛЕМНЫ ГАРАДОК?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Людзі, што засталіся без працы, перабіваліся хто чым мог. Адны ездзілі на прадпрыемства па перапрацоўцы крэветак аж у суседні райцэнтр, іншыя наймаліся да фермераў на сезонныя работы, нехта стараўся найбольш «ухапіць» за сезон нарыхтоўкі грыбоў і ягад. (У Шчарчове аж 10 прыёмных пунктаў дароў лесу.) Але ж сезонныя заробкі — непастаянныя, таму ненадзейныя. І жанчыны-работніцы, і старшыня Савета ў адзін голас гаварылі, што работу тут знайшлі ўсе жыхары Шчарчова хто толькі хацеў. На вытворчасці занята 115 чалавек. Частку з іх давялося запрашаць з Пружан. Для гэтага цэх мае спецыяльны аўтобус, які прывозіць і адвозіць людзей.

Часць расфарміравалі, а жылыя дамы, якія неабходна абслугоўваць, засталіся. Таму ў Шчарчове арганізавалі ўчастак ЖКГ. Тут таксама знайшлі работу былыя ваенныя, пераважна мужчыны. Са скасаваннем вайсковай арганізацыі адбылі на новае месца дыслакацыі афіцэры і прапаршчыкі, а тыя, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, засталіся. І, можна сказаць, паціху адаптаваліся да жыцця вёскі, яе гаспадаркі.

Кіраўнік мясцовай улады Аляксандр Дзяшко гаворыць, што на сёння ўсе былыя вайскоўцы і члены іх сем'яў працаўладкаваныя за выключэннем хіба тых, якія аддаюць перавагу жыццю без напругі. Маецца на ўвазе, пускаюць неблагую ваенную пенсію на віна-гарэлачную прадукцыю і спрыяюць тавараабароту сельскіх магазінаў. Але такіх нямнога. Большасць людзей знайшлі сваё месца і пастаянны заробак. Нават тыя, хто мае больш сталы ўзрост, часта не сядзяць без працы. Напрыклад, былы камандзір часці Уладзіслаў Вядліцкі пасля выхаду на пенсію купіў вясковы домік, абсталяваў пасеку і стаў пчаляром. Цяпер яго мёд ведаюць ва ўсёй акрузе і едуць па гаючы прадукт да Уладзіслава Уладзіміравіча. А ён, выхадзец з Расіі, стаў сапраўдным шчарчоўцам.

А вось іншыя вяскоўцы не спяшаюцца знайсці сабе занятак, затое не ўпускаюць магчымасці іншыя. Так, будынак былога штаба часці аблюбаваў гарадскі прадпрымальнік і мае намер вырабляць там мэблю. На цэх па вытворчасці акон з ПВХ зрабіў заяўку другі дзелавы чалавек. Значыць, паступова ажыве былая вайсковая часць, пра якую напамінаюць толькі рады калючага дроту. Ім раней былі агароджаны асабліва ахоўныя аб'екты. Пакуль агароджу ніхто не здымаў. Ёсць на 60-гектарным участку два ангары, якія мясцовая ўлада разам з раённай меркавалі прыстасаваць пад сучасную малочна-таварную ферму. Але літаральна некалькі дзён таму прыязджалі галоўны санітарны ўрач раёна разам з начальнікам райінспекцыі па ахове навакольнага асяроддзя і вынеслі катэгарычны вердыкт: «Не!». Бо надта блізка акаэалася б тая ферма ад будынка сярэдняй школы.

Не дазволілі — і многія ўздыхнулі з палёгкай. Тым больш што ёсць іншая прапанова па размяшчэнні ў памянёных ангарах незвычайнага для нашых мясцін прадпрыемства па вырошчванні грыбоў. Прыязджалі амбіцыйныя прадпрымальнікі, якія не хочуць мірыцца з тым, што амаль круглы год шампіньёны ў Беларусь завозяць з Польшчы ды Прыбалтыкі. А тут плошчы дазваляюць гадаваць столькі грыбоў, што іх хопіць ледзь ці не на ўсю краіну.

Ёсць у былой часці і вялікая спартыўная зала, і кавярня, дзе некалі нават банкеты праводзілі. Калі прыдуць сюды іншыя прадпрымальнікі і стане былы ваенны аб'ект гэткім прамысловым гарадком, — спадзяюцца ў Шчарчове, — знойдзецца прымяненне і названым установам. Не выключаюць тут, што з часам перамесціцца ў вёску і цэнтр аб'ядноднага сельгаспрадпрыемства. Зараз хоць і называецца ААТ «Шчарчова», цэнтральнай сядзібай яго з'яўляецца Галасяціна. А развіццё вытворчасці на тэрыторыі былой часці можа стаць стымулам і для развіцця вёскі.

У часы Савецкага Саюза Пружанскі раён быў ці не адным з самых «мілітарызаваных», і не толькі ў рэспубліцы. Тут дыслацыравалася ні мала ні многа — 42 вайсковыя часці. І цяпер уся гэта гаспадарка, няцяжка здагадацца, плаўна перайшла ў спадчыну раёна, стаўшы на дзесяцігоддзі галаўным болем для яго кіраўнікоў. Тое, што апісана вышэй, лепшы прыклад выкарыстання вайсковага мінулага. І, на жаль, амаль адзіны. Многія ваенныя базы, гаспадары якіх пакідалі краіну адразу пасля развалу Саюза, поўнасцю станавіліся здабычай марадзёраў. Там кралі і выносілі ўсё, што паддавалася пагрузцы і вывазу. Потым былі прыняты адпаведныя заканадаўчыя акты, і пакрысе пачалі арганізоўваць ахову такіх аб'ектаў. Але ж кожнага метра кабелю, нават кіламетра ахоўніка не паставіш...

«Многія ваенныя базы поўнасцю станавіліся здабычай марадзёраў».

Старшыня Савета Аляксандр ДЗЯШКО (справа) і загадчык вытворчасці «КПВС» Міхаіл ШКРАБАЦЮК.

Нават калі перадавалі на баланс раёна ваенную гаспадарку Шчарчова ў больш-менш прыстойным стане, то, паводле падлікаў спецыялістаў, на рамонт жылых аб'ектаў і кацельні спатрэбілася каля двух мільярдаў рублёў. Але хто такія грошы дасць? Увесь цяжар клопатаў пра жыллё кладзецца на плечы раённага бюджэту. І сёння ў Пружанах самымі праблемнымі з'яўляюцца былыя ваенныя гарадкі Засімавічы і Слабудка. На парадку дня — рамонт, добраўпарадкаванне, замена многіх камунікацый.

Як сказаў старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч, ахова і выкарыстанне базы ваенных часцей — адна праблема. Але ёсць іншая, яшчэ больш надзённая — падтрыманне ў парадку пакінутых гарадкоў, шматкватэрнага жылля. Як правіла, такія дамы перадаюцца ў распараджэнне раённай ЖКГ у тым стане, калі неабходны тэрміновы рамонт з вялікімі капіталаўкладаннямі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

Прамая лінія

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА. ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

Апошнім часам ў галіне аховы здароўя адбываюцца сур'ёзныя пераўтварэнні. Як заўважаюць спецыялісты, усе такія змяненні перш за ўсё накіраваны на тое, каб палепшыць якасць, павялічыць даступнасць медыцынскага сэрвісу. Аднак не ўсё так проста — на шляху да сучаснага ўзроўню абслугоўвання паўстаюць пэўныя праблемы. Многія з іх абмяркоўваліся падчас чарговай «прамой лініі», што адбылася ў рэдакцыі. Як з глыбінкі патрапіць на прыём у рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры, ці абнаўляецца флюараграфічнае абсталяванне, хто рэгулюе цэны на паслугі ў прыватных медыцынскіх цэнтрах, чаму адзначаецца недахоп вузкіх спецыялістаў, калі ў сталіцы пачнуць працаваць новыя паліклінікі? На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае начальнік упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Уладзіміравіч БРОЎКА.

☎ **Уладзімір Сцяпанавіч МАКСІМАЎ, Лельчыцкі раён:**

— Як магчыма патрапіць на прыём да спецыяліста ў рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры? На якіх умовах (платна альбо бясплатна), хто павінен даваць накіраванне, ці можна напрамую прыехаць? Увогуле, ці можа пацыент з глыбінкі пры неабходнасці звярнуцца ў сталічную клініку?

— Безумоўна, Уладзімір Сцяпанавіч, такая магчымасць заўсёды ў чалавека ёсць — накіраванне ў медыцынскія ўстановы рэспубліканскага падпарадкавання рэгулюецца Пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 2 лістапада 2005 года «Аб парадку інфармавання насельніцтва аб аказанні медыцынскай дапамогі ў арганізацыях аховы здароўя і аб парадку накіравання на абследаванне і лячэнне». Гэтым дакументам устаноўлена наступнае правіла: адпаведнае накіраванне можа быць выдадзена ўчастковымі ўрачамі ў тым выпадку, калі няма магчымасці для дыягностыкі і лячэння магчымага захворвання ў арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць першасную медыка-санітарную дапамогу. Такім правам валодаюць і іншыя спецыялісты, якія ўзгадаюцца ў названай пастанове міністэрства. Вызначаны і падставы для накіравання хворых на абследаванне і лячэнне ў медыцынскія ўстановы рэспубліканскага падпарадкавання. Гэта адбываецца ў тым выпадку, калі няма магчымасці для дыягностыкі і лячэння таго ці іншага захворвання ў арганізацыях аховы здароўя абласнога ўзроўню і горада Мінска. Важкай падставай з'яўляецца неабходнасць удакладнення дыягназу ў складаных выпадках, адсутнасць эфекту ад метадаў лячэння, якія прымяняюцца, а таксама калі ўзнікае неадкладная патрэба ў прымяненні высокатэхналагічных метадаў дыягностыкі і лячэння. Для таго, каб вырашыць пытанне аб накіраванні ў адпаведную медыцынскую ўстанову рэспубліканскага ўзроўню, перш за ўсё вам неабходна звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства. Абследаванне і лячэнне ў рэспубліканскіх установах медыцынскага профілю бясплатнае.

☎ **Аляксей Міхайлавіч Карчэўскі, г. Мінск:**

— Я з'ўляюся старшынёй асацыяцыі хворых на рассеяны склероз. Сярод такіх хворых шмат лежачых, калясачнікаў. Самая цяжкая для іх праблема — памперсы. А паколькі гэтая хвароба пачынаецца ў маладым узросце, то адпаведна пенсіі ў людзей вельмі маленькія і тыя ж памперсы яны проста не могуць набыць. Ці будзе нейкім чынам вырашацца пытанне?

— Міністэрства аховы здароўя вывучала гэтую праблему. Зараз распрацаваны праект пастановы ўрада, якім павінен быць зацверджаны пералік тэхнічных сродкаў для рэабілітацыі хворых. У яго ў тым ліку ўключаны і памперсы. Як толькі адпаведны дакумент зацвердзіць урад (спадзяюся, што гэта адбудзецца ўжо ў бліжэйшы час), то адразу будзе выпрацаваны механізм і парадак забеспячэння хворых памперсамі.

☎ **Пётр Сцяпанавіч Федасенка, г. Мінск:**

— Хто рэгулюе цэнаўтварэнне ў прыватных медыцынскіх цэнтрах — у многіх «цэннік» проста зашкальвае, няўжо нельга ўстанавіць пэўныя абмежаванні на тарыфы?

— У адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы рэгістрацыю тарыфаў на платныя медыцынскія паслугі ажыццяўляе Міністэрства аховы здароўя па ўзгадненню з Міністэрствам эканомікі. Парадак іх фарміравання вызначаны адпаведнай пастановай ад 22 снежня 2003 года. Тарыф на платныя медыцынскія паслугі фарміруецца на падставе эканамічна абгрунтаваных нормаў і нарматываў матэрыяльных і працоўных затрат, парадку падаткаабкладання, які існуе. У разлік бяруцца кошт медыкаментаў, матэрыялаў (медыцынскага і немедыцынскага прызначэння), а таксама абсталявання, якое выкарыстоўваецца, арэндная плата, падаткі, камунальныя плацяжы і шэраг іншых фактараў. Таму цэны могуць адрознівацца ў той ці іншы бок, аднак патрабаванні да ўсіх адноль-кавыя — тарыфы павінны быць абгрунтаванымі. А ўжо канкрэтны выбар медыцынскай установы заўсёды з'яўляецца асабістым клопатам кожнага пацыента.

☎ **Вячаслаў Георгіевіч Сцепановіч, г. Рагачоў:**

— Пачуў інфармацыю наконт таго, што пэўнае медыцынскае абсталяванне (напрыклад, для правядзення флюараграфіі) уяўляе небяспеку для пацыентаў з-за зношанасці. Паколькі гэта адпавядае рэальнасці і як у такім разе плануецца абнаўляць абсталяванне?

— На працягу 1999—2007 гадоў у Беларусі адбываецца тэхнічнае перааснашэнне службы прафілактычнай флюараграфіі, за гэты час было закуплена 199 маладозных сістэм лічбавай рэнтгенаграфіі, якія выкарыстоўваюцца для даследаванняў органаў грудной поласці. Згодна з афіцыйным заключэннем Праматамнагляду, доза апрамянвання пацыента на такім абсталяванні ў некалькі разоў меншая, чым нарматыў, які рэкамендаваны МАГАТЭ падчас выканання адпаведных даследаванняў. Але сапраўды, Вячаслаў Георгіевіч, зараз у арганізацыях аховы здароўя яшчэ знаходзіцца ў эксплуатацыі 292 флюарагарафічныя апараты з выкарыстаннем рэнтгенаўскай плёнкі. Яны таксама прымяняюцца пры выяўленні туберкулёзу і анкалагічных захворванняў. У адпаведнасці са спецыяльным загадам Міністэрства аховы здароўя праведзены тэхнічны агляд састарэлага абсталявання, па яго выніках было спісана 68 флюарографаў, якія не адпавядалі сучасным патрабаванням да якасці выявы і стваралі высокія дозы апрамяньвання на пацыентаў. У плёначных апаратах, якія засталіся ў выкарыстанні, флюарэсцэнтныя экраны заменены на сучасныя высокаадчувальныя на аснове рэдказямельных металаў. Гэта дазволіла зменшыць уваходную дозу на пацыентаў у сярэднім у 1,5—2 разы. Тэхнічны стан рэнтгенаўскіх апаратаў пастаянна кантралюецца Праматамнаглядам. Калі падчас спецыяльных праверак адзначаецца перавышэнне прамянёвых нагрузак на пацыентаў і персанал, то далейшая эксплуатацыя такога абсталявання адразу забараняецца, яно падлягае належнаму рамонту альбо ўвогуле спісанню.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.
(Працяг будзе.)

КАЗАЧНЫ ВОДПУСК, АБО ВОДПУСК ДАЎЖЫНЁЮ Ў ЖЫЦЦЁ

Водпуск — шчаслівая пара. Аб ім марыш цэлы год, ён, як прамень надзеі, свеціць табе ў хаосе няспынных турбот, праблем і дробных радасцяў. Да яго імкнешся, адлічваючы месяцы, тыдні, дні. Спадзяешся, што ў гэты год ужо дакладна адпачнеш, дазволіш сабе ўсе свае слабасці. Вось ён ужо прыйшоў... І вось ён ужо прайшоў... Зноў тое ж, зноў праблемы і клопаты. Не хочацца ісці на працу, бегчы як вавёрка ў коле. Ну чаму водпуску заўсёды не хапае?! Чаму ён мільгануў і знік удалечыні, не паспеўшы як след нам дапамагчы?

Думаю, многіх наведвалі падобныя думкі пасля імкліва праляцелага адпачынку і звязаныя з ім расчараванні ад запланаваных, але не зробленых спраў, ад думак пра спакой і душэўны настрой, якія так і засталіся ў фантазіях і марах. Горш за тое, пасля водпуску, як правіла, становіцца яшчэ цяжэй. Выпадаючы на кароткі час з «кола жыцця» і вымушана хутка вяртаючыся ў яго, міжволі бачыш збоку гэту пастаянную неразбярыху. Раней пасільны груз становіцца вельмі цяжкім...

Тут на дапамогу прыходзяць схаваныя прыродныя механізмы, якія незаўважна дапамагаюць арганізму пазбавіцца ад шоку, звязанага з пераходам ад аднаго віду дзейнасці да іншага. На фоне падсвядомага непрымання рэальнасці адбываецца ўхіленне ад непажаданага, што і прыводзіць, як правіла, да рэзкага спаду жыццёвай энергіі. Тут і пачынаюць нагадваць пра сябе нашы «любімыя» хранічныя захворванні. Ні для каго не сакрэт, што хваробы людзі ў большасці сваёй зыходзячы са сваіх уласных магчымасцяў і жаданняў. Часам мы сустракаем жыццярадасных людзей, якіх «ніякая зараза не бярэ», пры гэтым уздыхаем: «яму б мае праблемы», і не хочам зразумець таго, што каталізатарам як праблем, так і радасцяў у сваім жыцці з'яўляемся мы самі. Але ў нас усё неяк не хапае часу прытармазіць і падумаць, прыслухацца да сябе і задаць шчырае пытанне: «Чаго я хачу?». «Што за дзіўнае пытанне, — падумаюць многія, — я цудоўна ведаю, чаго хачу!» — і назавуць стандартны набор класічнага поспеху, прынятага ў грамадстве.

Чаму тады мы восенню чхаем, скардзімся і сумуем? Чаму так часта нам не падабаецца наша жыццё, наша праца, мы не задаволеныя сабой? Чаму з узростам мы кажам часцей адны і тыя ж словы: «Вось так усё жыццё і праляціць у пастаянных праблемах, клопатах, а жыць калі?» Мы ўсе ўпотай спадзяёмся, чакаем, што яно, сапраўднае жыццё, у якім добра, у якім мы сабе падабаемся, абавязкова да нас прыйдзе. Але... Як паказвае практыка зносінаў з людзьмі ва ўзросце, яно не прыходзіць. І ў большасці выпадкаў нас чакае расчараванне і шкадаванне аб згубленым часе. Аднак яго назад не вярнуць. Так і бяжым у «коле жыцця» да чарговага водпуску з надзеяй на адпачынак, спакой і, нырнуўшы з галавой на кароткі тэрмін у свет «марнавання часу» або «занятку тым, што падабаецца», зноў з неахвотай выпадаем з нашых мрояў у халодны, восенскі дзень. Спытацца ў сябе, а што далей, мы не спяшаемся. Гэта вельмі зразумелы адказ. І з кожным годам відавочнасць такога адказу ўсё больш бязлітасная.

Большасць людзей сярэдняга ўзросту казкі ад жыцця не чакаюць. Але тут з намі адбываецца чарговы парадокс. Казачныя прынцы на «руковым кані» патрэбны былі, каб выйсці замуж, «цудоўныя прынцэсы» — каб раджаць і выхоўваць дзяцей. І ўвогуле казкі — для дзяцей... Але пасталеўшы, людзі не спяшаюцца расставацца з казкай. І гэта была б не бяда, калі б казка не была — чужой. Распаўсюджаныя фантазіі, якія падтрымліваюць эмацыянальны дух у чалавеку, наўпрост звязаны з «героямі-палюбоўнікамі» — у мужчын і «гламурнымі прыгажунямі» — у жанчын. З захапленнем мы назіраем за чужым жыццём у шматлікіх серыялах, патанаючы ў любоўных прыгодах, заплюшчваючы вочы на сваё сапраўднае, такое прыгожае і ні на што не падобнае жыццё.

Чаму ж складана вяртацца з водпуску і як зрабіць так, каб у жыцці было больш радасці і шчасця? Адказ просты: паверце ў сябе, зрабіце са свайго жыцця казку, станьце сапраўдным, а не схаваным глыбока ў душы героем-палюбоўнікам, бо на свеце столькі людзей, якім патрэбна ваша каханне; ператварыцеся ў гламурную прыгажуню — вядома, што каноны прыгажосці для ўсіх розныя. Не бойцеся дазволіць сабе быць смешным, шчаслівым, не чакайце, пакуль вас папросяць зрабіць свае жыццё прыгожым і радасным, вазьміце адказнасць за гэта ва ўласныя рукі, скажыце сабе: «Так, я заўсёды ў душы ведаў (ведала), што я ўсё магу, толькі бярог гэта для асаблівага выпадку». Сёння гэты дзень наступіў. Звычайны, нічым не адметны дзень, які толькі вы можаце пражыць лёгка, радасна і шчаслівa, толькі вы можаце, усміхаючыся да вушэй, дыхаць лёгкім паветрам, прагажэць і здаравець ад усведамлення сваёй здзейсненай цудоўнай казкі — казкі на адзін дзень.

Ваша Святлана АНІШЧАНКАВА.

Краіна здароўя
Выпуск № 26 (39)

Прыемная навіна

Дзякуй нямецкім вучоным

Вучоных Мюнхенскага інстытута радыялогіі імя Ота Хуга ў Гомельскай вобласці добра ведаюць па іх гуманітарнай дапамозе насельніцтву, якое пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Некалькі апошніх гадоў, напрыклад, яны прыкладалі свае намаганні, каб шляхам грашовых ахвяраванняў нямецкіх арганізацый і грамадзян сабраць фінансавыя сродкі для будаўніцтва ў Гомелі цэнтра шчытападобнай залозы пры абласным эндакрынналагічным дыспансэры.

І гэта ўдалося. Цэнтр такі адкрыты быў на мінулым тыдні, што дае магчымасць лячыць тут большую колькасць пацыентаў. Гамяльчане ўдзячныя за гэта нямецкім спецыялістам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Метэапаты

ДА ПЕРАМЕНЫ НАДВОР'Я АДЧУВАЛЬНЫ КОЖНЫ ТРЭЦІ

Паводле статыстыкі, у 40 працэнтаў людзей восенню назіраюцца прыкметы дэпрэсіі. «І гэта невыпадкова, — гаворыць кандыдат медыцынскіх навук, загадчыца кафедры псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына Байкова. — Парушэнне сезонных біялагічных рытмаў, рэзкае зніжэнне сонечнай актыўнасці робяць чалавека больш уразлівым да развіцця дэпрэсіі і іншых псіхічных расстройстваў і прыводзяць да абвастрэння хранічных хвароб».

Прыродныя з'явы прымушаюць пакутаваць мільёны людзей на планеце. Да перамены надвор'я адчувальны кожны трэці: метэазалежныя людзі на магнітныя буры і перапады атмасфернага ціску рэагуюць асабліва востра: адразу змяняецца эмацыянальны фон (упадак сіл, пагаршэнне памяці, раздражняльнасць, беспадстаўная трывога), з'яўляюцца цёмныя кругі пад вачамі і галаўны боль, які ў асобных выпадках суправаджаецца насавым кровацячэннем, нярэдка турбуюць цягнучыя болі ў мышцах, ламата ў суставах, сухасць у роце.

На штодзённае метэаадчувальнасць — з'ява непастаянная. Яна ўзмацняецца ў залежнасці ад таго, наколькі ўразлівы арганізм, інакш кажучы, якія і ў якой форме (цяжкай ці лёгкай) хранічныя хваробы мае чалавек. Сама па сабе яна бяспечная, але калі ў адказ на атмасферныя з'явы абвастраюцца хранічныя хваробы, з'яўляюцца нечаканыя збоі ў рабоце сардэчна-сасудзістай, стрававальнай, дыхальнай сістэмах, то гэта ўжо сур'ёзна.

Ёсць тры стадыі метэаадчувальнасці: лёгкая — слабасць і санлівасць, сярэдняя — скачкі ціску і парушэнне сардэчнага рытму і цяжкая — болі ў галаве, сэрцы, задышка і нервовыя расстройствы.

Найбольш уразлівыя да перамены надвор'я людзі з хранічнымі захворваннямі, асабліва сардэчна-сасудзістай сістэмы — гіпертонікі, тыя, хто мае ішэмічную хваробу сэрца, стэнакардыю, сардэчную недастатковасць, перанеслі інфаркт. У іх галаўны боль і боль у суставах, слабасць, прыступы стэнакардыі можа правакаваць нават змяненне напрамку ветру. Але часцей за ўсё пагаршаецца самаадчуванне пры рэзкіх перападах тэмпературы і атмасфернага ціску.

Чаму ад капрызаў надвор'я больш за ўсіх церпяць сардэнікі? Таму што менавіта крывяносныя сасуды прымаюць на сябе галоўны метэаўдар. Калі атмасферны ціск паніжаецца, а тэмпература паветра павялічваецца, урачы раяць сардэчнікам больш бываць на свежым паветры, рабіць дыхальную гімнастыку, піць настойку кораня жэньшэню, лімонніка, полівітаміны.

Калі ж атмасферны ціск павышаецца, а тэмпература, наадварот, паніжаецца, то людзям з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы рэкамендуецца масаж шыйна-плечавога пояса, гарчычнікі на вобласць патыліцы і нажныя гарачыя ванны. Можна таксама прымаць настойку валяр'яну, сардэчніку, рэланіум або спазматычныя сродкі — папазол, дыбазол, но-шпу, папаверын. Зразумела, калі няма проціпаказанняў да іх прымянення. А калі звычайная доза лекавых прэпаратаў не дапамагае, варта параіцца з урачом і перагледзець дазіроўку з папраўкай на метэаўмовы.

Змены надвор'я не могуць стаць прычынай хваробы, яны толькі пагаршаюць праяўленне немачы, якую чалавек ужо мае. А на стан людзей з моцным здароўем надвор'е амаль не ўплывае: у іх перапады тэмпературы і атмасфернага ціску суправаджаюцца хуткімі змяненнямі выпрацоўкі гармонаў, утрыманнем трамбацытаў у крыві, згусальнасці крыві, актыўнасці ферментаў. Гэтыя змяненні — своеасаблівая абарончая рэакцыя арганізма на неспрыяльныя ўмовы.

Можа падацца, што метэапатычныя рэакцыі — спрадвечны спадарожнік людзей. Але гэта не зусім так. Спецыялісты лічаць, што ад метэазалежнасці можна калі не пазбавіцца, то значна яе знізіць.

Акрамя традыцыйнай парады «весці здаровы лад жыцця», метэапатам рэкамендуецца:

- кожную раніцу пачынаць з лёгкай гімнастыкі і душа;
- традыцыйны чай замяніць адварамі ліпы, медуніцы, святаянніку, мяты;
- аддаваць перавагу прадуктам з высокім утрыманнем калію: разынкі, абрыкосы, курага, банены, бульба (запечаная або ў «мундзірах»);
- прымаць вітамін Е, які ўтрымліваецца ў зерневых прадуктах і арэхах;
- прывучаць сябе спакойна рэагаваць на крытычныя сітуацыі;
- штодзённа праводзіць расслабляльны масаж вобласці шыйнага аддзела пазваночніка і лапатак. Гэта можна рабіць і самастойна: абедзвюма рукамі пагладжвайце скуру па напрамку ад шыі да плячэй на працягу 10—15 хвілін;
- прымаць заспакаяльныя сродкі (настойкі глогу, валяр'яну, сардэчніку), калі заўважаеце, што часта раздражняецеся па дробязях;
- абмежаваць колькасць ласункаў, тлустай, смажанай і вострай ежы (пры ўздзеянні магнітных палёў на арганізм ён пачынае горш засвойваць вугляводы, а нізкая тэмпература паветра прыводзіць да павышанага ўтварэння свабодных радыкалаў, якія парушаюць дзейнасць клетачных мембран);
- абавязкова ўвесці ў харчовы рацыён рыбу, фасолю, чачавіцу, гарох, грэчку, капусту, рэпчатую цыбулю, яблыкі і моркву;
- з прафілактычнай мэтай выпіваць па 1/2 шклянкі настою рамонку за 30 хвілін да яды 2—3 разы на дзень і шклянку адвару шыпшыны — за гадзіну да сну.

Людзі з розынмі захворваннямі рэагуюць на розныя фактары надвор'я. Для ***сардэчнікаў і астматыкаў*** *небяспечнае нізкае ўтрыманне кіслароду ў паветры. У гэтыя дні, як паказваюць шматгадовыя назіранні «хуткай», у тры разы павялічваецца колькасць выклікаў ад такіх хворых. Яны таксама хваравіта рэагуюць на рэзкае пахаладанне.*

Гіпертонікаў і гіпатонікаў *турбуюць рэзкія перапады атмасфернага ціску. Гіпертонікі таксама горш пераносяць бязветранае надвор'е.*

Людзі з захворваннямі суставаў, апорна-рухальнага апарату, з хранічнымі бранхітамі, *як правіла, дрэнна пераносяць моцную вільготнасць.*

Абвастрэнне псіхічных захворванняў *прыходзіцца на вельмі ветраныя дні.* ***Маленькія дзеці*** *асабліва неспакойна паводзяць сябе ў дажджлівыя дні. Тыя, у каго ёсць* ***хваробы шчытападобнай залозы,*** *звычайна няважна адчуваюць сябе, калі на вуліцы туман.*

Рэзкае пахаданне з холаду ў цялло можа выклікаць абвастрэнне хранічных інфекцый, а ўстойлівае пахаладанне, наадварот, прытармазіць вострыя запаленні і павысіць імунітэт.

Вольга ШАЎКО.

Інфарм-укол

НЕ ЕСЦІ ФРУКТАЎ — РАЗВІВАЦЦА З ФІГУРАЙ

У фруктах досыць высокі працэнт цукру. І менавіта гэта ўнушае многім боязь.

На самай справе яны спаталяюць голад, як лёгкі перакус ці дэсерт. Вялікі яблык, персік, банан, грэйпфрут утрымліваюць каля 100 ккал. Фруктовыя валокны даюць пачуццё насычэння. Даследаванні паказалі, што жанчыны, якія ўжываюць выключна фрукты, худзеюць хутчэй, чым тыя, хто выкрэслівае іх са свайго рацыёну. Не так даўно ў ЗША было ўстаноўлена, што людзі з нармальнай вагой ужываюць у сярэднім каля 2 порцый фруктаў у дзень, а з лішняй — менш за адну.

СЫР ТАЛІІ НЕ ПЕРАШКОДА

Можна есці любыя сыры, пры ўмове, што порцыі будуць... разумнымі.

У 30 г тлустага сыру — каля 100 ккал і 7 г тлушчу (30 г — гэта кавалачак памерам прыклада на з вялікі палец рукі). У залежнасці ад гэтага, як вы спраўляецеся са сваімі каларыйнымі запасамі, вырашайце, адзін ці два разы на дзень можаце дазволіць сабе любімы сыр. Калі хочаце скінуць вагу і сочыце за тым, што ясце, аддавайце перавагу цвёрдым сырам (пармезан, чэдэр), гарганзоле. А для прыгатавання салатаў і запяканак лепш выкарыстоўваць сыры з паніжаным утрыманнем тлушчу — смак той жа, а калорый менш. Для дыетычнага харчавання рэкамендуюцца сыры альпійскага рэгіёна — чэдэр, мацарэла, правалоне і ўсе швейцарскія сыры.

СЯБРЫ І ВАРАГІ ЦЭЛЮЛІТА

Многія дыетолагі мяркуюць, што харчаванне не так моцна ўплывае на развіццё цэлюліта, як гарманальны фон, фізічная актыўнасць і нармальнае кровазабеспячэнне падскурнай тлушчавай клятчаткі.

Іншыя спецыялісты мяркуюць, што пры цэлюліце не варта злоўжываць тлустай ежай, асабліва жывёльнымі тлушчамі. Абавязкова абмяжоўваюць свіны тлушч, сала, птушку ўжываюць толькі без скуры. Не рэкамендуюцца мясныя і рыбныя кансервы, вэнджаныя мяса і рыба, вялікая колькасць солі і вострых спецый. Абмяжоўваць соль, салёныя і салодкія прадукты вельмі важна, паколькі гэта нармалізуе водны абмен і спрыяе лепшаму дрэнаванню тлушчавай клятчаткі.

Магніт павышае... патэнцыю і не толькі

Ёсць ідэя!

І магніты лечаць. Але ж не звычайныя, а спецыяльныя. Ды не ў выглядзе розных бранзалетак. Адразу і не запомніш назву гэтага цуда-магніта: «Аплікатар ліставы магнітафорны медыцынскага прызначэння. АЛМ»

«А ці ёсць у вас такое? І чытаю доўгую назву» — цікаўлюся па тэлефоне ў даведачным бюро аптэк Віцебска. І чую кароткі адказ: «Не бывае ў нас такога!»

А шкада! Упершыню мне давялося ўбачыць гэты рарытэтны зараз аплікатар (на здымку), калі рыхтаваў адзін матэрыял пра вясковую бальніцу, што тады ўжо закрылася. Людзі скардзіліся: чаму закрылі такую добрую медыцынскую ўстанову? Менавіта там прымянялі яшчэ ў савецкія гады рэдкія методыкі пры лячэнні і рэабілітацыі хворых. Былы ўрач і расказаў пра АЛМ. Падарыў на памяць некалькі такіх медыцынскіх магнітаў. Расказаў, што ў адрозненне ад звычайных двухполюсавых магнітаў АЛМ маюць некалькі полюсаў. Два бакі АЛМ па-рознаму ўздзейнічаюць на арганізм.

А тут праз нейкі час прыходзіць да мяне знаёмы. Хацеў параіцца, дзе можна лепш палячыць класічную мужчынскую хваробу. Прастатыт адным словам. Маўляў, ты ж журналіст, хутчэй даведаешся, ды каб рэальнай была цана лячэння. А мне якраз расказвалі, што магніты дапамагаюць і ў такіх выпадках. Зайшоў праз тыдзень да яго. Жонка дзверы адкрывае ды гаворыць: «Праходзь, мой наогул звар'яцеў, нейкія магніты прыкладвае да марлі. Сядзіць з гэтымі магнітамі. І дзе ён іх купіў? Ужо і не ведаю, што думаць?» Я, вядома ж, прамаўчаў. Праз месяц прыносіць мой таварыш бутэльку добрай гарэлкі. Дапамагае!

Па каментарый я звярнуўся да знаёмых спецыялістаў. Адзін наогул не чуў пра «такое». А другі расказаў, што, сапраўды, яшчэ ў савецкія гады аплікатары можна было дастаць. Вырабляліся яны тады ў горадзе Андропаў. Прэзентаваў арыгінальную інструкцыю да АЛМ савецкіх часоў. Цікава чытаць першую старонку: «Інструкцыя па эксплуатацыі. 4. 189. 101. Рэкамендавана камісіяй па апаратах і прыборах, якія выкарыстоўваюцца ў фізіятэрапіі, Камітэта па новай медыцынскай тэхніцы ўпраўлення па ўкараненні новых лекавых сродкаў і медыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя СССР».

Зараз такія аплікатары можна знайсці ў расійскіх аптэках. Безумоўна, самае простае — купіць іх у Маскве. А мо і ў Мінску недзе знойдзеце?

Аплікатар у выглядзе плоскіх квадратаў карычневага колеру, аказваецца, лёгка можна парэзаць. Кавалачкі, што нагадваюць шакалад, прыкладваюць да марлі, замацоўваюць пластырам. І павязкі на праблемныя ўчасткі цела завязваюць. Калі няма проціпаказанняў, можна іх выкарыстоўваць пры лячэнні закрытых пераломаў і г.д. Яны дапамогуць, калі чалавек хварэе на нежыт, радыкуліт. Нават астэахандроз па сілах магніту, зразумела, у комплексным лячэнні. Яшчэ ён можа пазмагацца з трамбозам, дапаможа пры раненнях мяккіх тканак...

Проціпаказанні: цяжарнасць, алкагольная інтаксікацыя, сістэмныя захворванні крыві, востры інфаркт, інсульт, выкарыстанне электралячэння. Ды, зразумела, не кожны індывідуальна можа перанесці магнітнае ўздзеянне.

Сеанс лячэння залежыць ад захворвання. Звычайна, у першы раз хопіць хвілін 10—15. Потым працягласць магнітнага лячэння можна павялічваць. Тыя, хто ўжо лячыўся, праводзілі сеансы 2 разы на дзень: раніцай і пад вечар (знаёмы з прастатытам нават спаў з магнітам, што «ўстанавіў» бліжэй да праблемнага месца). Звычайна штодзённы курс цягнецца трохі болей за два тыдні. Але ж можа дасягнуць і некалькіх месяцаў. Новыя АЛМ маюць актыўнасць на працягу некалькіх гадоў.

Важна! У любым выпадку перад тым як прымяняць магніты, пастарайцеся знайсці ўрача, які вас пракансультуе. Нават, калі ў вас будзе адпаведная інструкцыя! У спецыяльнай літаратуры, напрыклад, я прачытаў, што ў Японіі медыкі раяць насіць магніты на працягу тыдня. Напэўна, у іх зусім іншая мадыфікацыя. Ёсць нават спецыяльныя «магнітныя пілюлі». Існуюць і розныя «магнітныя прыборы» для хатняга карыстання. Але каштуюць яны дорага. Ды і гэта зусім іншая тэма для публікацыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасе: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 29 верасня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 кастрычніка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 верасня 2007 года. Удачы ў гульні!

7 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на IV квартал 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____

Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____
(адрас)

_____ _____
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | лі-тар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____
(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____
(адрас)

_____ _____
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў жніўні былі ў Ваўкавыску, Шчучыне і Горках

Сярэдняя цана на ялавічыну першай катэгорыі на канец жніўня гэтага года склала Br7848 і вагалася ад Br5940—7250 у Пінску, Оршы, Рагачове, Лідзе да Br8000-9000 у Віцебску, Гродне, Магілёве, Бабруйску.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу, верхняя мяжа цэн засталася практычна такой жа. Сярэдняя цана на ялавічыну ў жніўні стала вышэй на Br194.

А сярэдняя цана на свініну ў жніўні складала Br7753. Самыя нізкія цэны (Br6820—7010) былі ў Верхнядзвінску, Ваўкавыску, Шчучыне, Клімавічах і Чавусах, а самая дарагая свініна была ў Брэсце, Наваполацку, Беразіне, Бабруйску і Горках — па Br8160—9500 за 1 кг. Сярэдняя цана на свініну ўзнялася ў жніўні на Br25.

У жніўні сярэдняя цана на свежую капусту склала Br1004, што танней у параўнанні з ліпенем на Br411. Самая танная капуста была ў Ваўкавыску, Шчучыне, Магілёве, Горках і Чавусах. Тут яе прадавалі па Br600—810 за 1 кг, што на Br30—410 танней, чым у ліпені. Найбольш высокія цэны на капусту былі ў Бярозе, Мазыры, Рагачове, Маладзечне, Салігорску. Жыхарам гэтых гарадоў даводзілася плаціць ад Br1160 да Br1440 за 1 кг, што на Br590—530 танней, чым у ліпені.

У Брэсце, Пінску, Століне, Магілёве, Бабруйску прадавалі ў жніўні самую танную цыбулю, якую можна было купіць па Br1000—1100 за 1 кг пры сярэдняй цане на цыбулю ў рэспубліцы на канец жніўня Br1345 за 1 кг, што на Br525 танней у параўнанні з ліпенем. Найбольш высокія цэны (Br1640-2000 за 1 кг) на цыбулю ў жніўні былі ў Мазыры, Шчучыне, Ашмянах, Клімавічах, Чавусах.

Цана бульбы ў сярэднім па рэспубліцы ў жніўні складала Br692, што на Br371 танней, чым у ліпені. Самы танны «другі хлеб» быў у Баранавічах, Лідзе, Ваўкавыску, Шчучыне, Бабруйску, дзе яго рэалізоўвалі па Br450—560, што на Br100—230 танней, чым у ліпені. Найбольш высокія цэны на бульбу былі ў Пінску, Оршы, Барысаве, Беразіне, Клімавічах — Br780—1100. Гэта на Br520—630 танней, чым у ліпені.

Параўнальны аналіз цэн штомесячна праводзіцца на прадпрыемствах гандлю ўсіх формаў уласнасці, афіцыйных і неафіцыйных рынках у 31-м горадзе Беларусі. Самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты ў ліпені былі ў Ваўкавыску, Шчучыне, Горках, Магілёве, а самыя высокія — у Брэсце, Беразіне, Салігорску, Гродне, Мінску, Барысаве.

БЕЛТА.

Уласнікі жылля не жадаюць аб'ядноўвацца ў таварыствы?

У цэнтральным рэгіёне стварэнне таварыстваў уласнікаў жылля пакуль вядзецца даволі марудна.

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» ўсяго на Міншчыне зараз працуюць толькі 47 такіх таварыстваў. Уласнікі проста не жадаюць прымаць удзел у сходах, якія збіраюцца для вырашэння гэтага пытання. Як адзначаюць спецыялісты, асноўная прычына такой сітуацыі — вялікі тэрмін эксплуатацыі жылля (у сярэднім 25—45 гадоў), і, як правіла, неабходнасць правядзення капітальнага рамонту і ўкладання істотных фінансавых сродкаў з боку ўласнікаў. Хто пры такім «раскладзе» будзе арганізоўвацца ў таварыства? Таму пераважная большасць адпаведных структур ствараюцца ў новабудоўлях — дамах, якія былі ўведзены ў эксплуатацыю ЖБК.

На Міншчыне выселена 15 неплацельшчыкаў

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Мінскім абласным унітарным прадпрыемстве «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі», найбольшая доля ў структуры запазычанасці насельніцтва па аплаце за кватэру (41,8 працэнта ад агульнай сумы) прыпадае на тых жыхароў, якія не разлічваюцца за паслугі ад 1 да 3 гадоў. Даўжнікі з трохмесячным «стажам» складаюць 10,9, ад 3 да 6 месяцаў — 12,9, ад 6 месяцаў да года — 13,8, звыш 3 гадоў — 20,6 працэнта. Усяго «набягае» значная сума — па выніках студзеня—ліпеня запазычанасць склала 6,2 млрд рублёў. Хоць за гэты час даўгі насельніцтва перад камунальнікамі і зменшыліся на 212,3 млн рублёў, але застаюцца вялікімі.

Паводле слоў спецыялістаў, неабавязковым жыхарам было разаслана больш чым 60 тысяч папярэджванняў, у 5,1 тыс. выпадкаў давялося адключаць камунальныя паслугі. Адна з мераў уздзеяння — накіраванне іскавых заяў. Сёлета ў суд іх было пададзена 3,3 тыс., а задаволена 2,3 тыс. на суму 1,4 млрд рублёў. Усяго ў вобласці было выселена 15 сем'яў, якія завінаваціліся па аплаце за кватэру (дакументы падаваліся на 61 сям'ю).

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Нашы электраманцёры — лепшыя ў СНД

Рамонтнікі філіяла «Глыбоцкія электрасеткі» РУП «Віцебскэнерга» сталі пераможцамі ў міжнародных спаборніцтвах прафесійнага майстэрства сярод аператыўна-рамонтнага персаналу размеркавальных электрычных сетак, што прайшлі на віцебскай зямлі.

Фота БЕЛТА.

Як паведаміў «Звяздзе» намеснік генеральнага дырэктара РУП «Віцебскэнерга» па ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Дзіклоў, усяго за перамогу змагаліся 7 камандаў: акрамя беларускай — з Расіі, Казахстана, Арменіі, Таджыкістана, Кыргызстана, Узбекістана.

Расіяне (з «Волжскіх электрасетак») і прадстаўнікі Казахстана заваявалі адпаведна 2-е і 3-е месцы.

Цікава, што афіцыйнае адкрыццё спаборніцтваў адбылося ў Летнім амфітэатры, а закрыццё — у віцебскім Лядовым палацы. Падчас спецыялізаванага «турніру» яго ўдзельнікі прадэманстравалі на практыцы, як аператыўна могуць адраманціраваць і наладзіць электраабсталяванне. Журы таксама ацэньвала дасканаласць выканання ўсіх патрабаванняў тэхнікі бяспекі. У якасці прызоў арганізатары прадставілі тэлевізары, відэакамеры, лічбавыя фотаапараты...

Паралельна адбылася і міжнародная канферэнцыя, прысвечаная тэме сучаснага менеджменту ў энергасістэмах краін Садружнасці.

Гэтыя спаборніцтвы праходзілі ўжо ў 4 раз, у тым ліку другі раз у нашай краіне. Тры гады таму электраманцёры прадэманстравалі сваё майстэрства ў Брэсце.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ



ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8200 рублёў на месяц 24600 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7850 рублёў на месяц 23550 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13000 рублёў на месяц 39000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11850 рублёў на месяц 35550 рублёў на квартал

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГ ЦЭНЫ

Выпуск № 11 (23)

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...УЗЯЦЬ НАПРАКАТ АЎТАМАБІЛЬ

Сёння пракат аўтамабіляў становіцца ўсе больш папулярным. Адным машына патрэбна, каб з'ездзіць на рыбалку ці паляванне, другім — каб скласці вясельны картэж з пэўных марак машын, трэцім — для падарожжа з сям'ёй, а дзелавым людзям — для працы. Карэспандэнт «Звязды» высветліў, колькі сёння каштуе такая паслуга і на якіх умовах можна арандаваць аўтамабіль. І не толькі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Амаль усе сучасныя кампаніі, якія займаюцца пракатам машын, маюць дастаткова вялікія паркі легкавых аўтамабіляў і мікрааўтобусаў. Машыну можна арандаваць як самастойна, так і з паслугамі вадзіцеля. Апошняе карыстаецца большым попытам на вяселлях і вечарынах.

Усе машыны ў гэтых кампаніях своечасова праходзяць тэхнічны агляд, тэхнічнае абслугоўванне і абавязковае страхаванне. Праўда, у кожнай кампаніі свае асаблівасці ўмоў арэнды. У адных фірмах, каб афарміць машыну на пракат без вадзіцеля, патрэбна ўсяго толькі пашпарт і вадзіцельскія правы, іншыя кампаніі да гэтага патрабуюць яшчэ, каб і вадзіцельскі стаж быў не менш за год ці два. А некаторыя арандадаўцы просяць прынесці нават даведку з месца працы.

Так, напрыклад, аўтамабілі ВАЗ-2107, -2108, -2109 («Лада») і -2121 («Ніва») можна ўзяць у арэнду на суткі за 45 тысяч беларускіх рублёў. Гэтыя машыны карыстаюцца попытам у людзей, якія збіраюцца адпачыць на прыродзе.

Кампаніі, якія займаюцца арэндай аўтамабіляў замежных марак, звычайна падзяляюць машыны на класы. «Пежо-206» — машына «А» класа, карыстанне ёю каштуе ў адной з беларускіх фірмаў 35 долараў у суткі. Калі машыну браць больш чым на трое сутак, пачынаюць дзейнічаць скідкі. Да прыкладу, за тую ж «Пежо-206», узятую на тыдзень, трэба будзе аддаць ужо па 30 долараў у суткі. У некаторых канторах можна дабіцца большай скідкі. «Шкода-Фабія» таксама адносіцца да класа «А», але за яе пракат прыйдзецца заплаціць ужо па 45 еўра ў суткі. Калі вам спатрэбіцца «чатырохколавы сябар» больш чым на месяц, то «сутачныя» для вас будуць зніжаны да 25 еўра.

Кошт на аўтамабілі класа «В» вагаецца ад 40 еўра ў суткі («Опель Вектра» 2004 года выпуску) да 60-ці («Шкода-Актавія» такога ж узросту).

Аўтамабілі класа «С» можна наняць і за 60 еўра («Кія-Маджэнцікс), і за 70 еўра («Шкода-Суперб»). Кошт пракату аўтамабіляў звычайна залежыць ад года выпуску. Машыны 1994 —1996 гадоў можна знайсці і за 15 долараў.

Як правіла, усе іншамаркі застрахаваны «аўтакаска» і абсталяваны сігналізацыяй. Да таго ж, у сур'ёзных кампаніях вам ніколі не аддадуць машыну брудную ці не запраўленую (праўда, за паліва прыйдзецца таксама заплаціць). Адзіных правілаў работы з кліентамі ў фірмах няма. Але ўсе так ці інакш стараюцца дагадзіць кліенту. Адны страхуюць вадзіцеляў і пасажыраў арандаванага аўтамабіля. Іншыя пастаянным кліентам даюць даволі значныя скідкі і нават, калі патрэбна, прыгоняць машыну на дачу.

Некаторыя кіраўнікі прыватных фірмаў могуць і адмовіць у арэндзе аўтамабіля кліенту не патлумачыўшы прычыны. Адназначна, ніколі не дадуць машыну чалавеку ў нецвярозым стане ці адразу пасля «бурнай вечарыны». Бывае, што адмаўляюць людзям, у якіх непрэзентабельны выгляд, а грошы ёсць. Вопыт паказаў, што менавіта такія кліенты часцей за ўсё крадуць машыны ці «пускаюць» іх на запчасткі. А некаторыя буйныя кампаніі, каб пазбегнуць непрыемнасцяў, правяраюць, ці не знаходзяцца іх кліенты ў вышуку.

Значна прасцейшая працэдура афармлення пракату аўтамабіля, калі бярэш машыну з вадзіцелем. Паслугі кіроўцы каштуюць 30 долараў за восем гадзін. Таму, калі браць аўтамабіль кшталту «Форд-Эскорт» 1994 года выпуску, выйдзе не так і дорага — 45 долараў за машыну з вадзіцелем плюс аплата за паліва. Сярэдні кошт арэнды мікрааўтобуса на такіх жа ўмовах складзе 20—30 долараў за гадзіну. Можна знайсці такую паслугу і за меншыя грошы.

Рамантычным асобам, якія хочуць сваю «другую палову» завезці ў рэстаран на «Кабрыялеце», прыйдзецца выкласці ад 32 да 60 долараў за кожныя 60 хвілін. Навяспечаныя таты могуць забраць сваю жонку з немаўлятам з радзільнага дома на лімузіне (такія заказы сёння з'яўляюцца ўсё часцей!). Сюрпрыз каштуе ад 50 долараў за гадзіну.

Але аўтамабіль — не адзіны спосаб перамяшчэння. Напрыклад, гульня ў Папялушку і Прынца абыдзецца рамантыкам як мінімум ў 150 долараў. Менавіта столькі сёння каштуе карэта з рамізнікам за кожную гадзіну пракату.

Вы памыляецеся, калі думаеце, што такіх не знаходзіцца. Ёсць нават тыя, хто вырашае зрабіць прапанову рукі і сэрца з вышыні птушынага палёту на павятраным шары! Гадзіна такога палёту каштуе 300 долараў, затое згода, кажуць, гарантаваная. І, сапраўды, якая дзяўчына вырашыцца адмовіць, калі да зямлі так далёка! Дарэчы, шар можа ўмясціць пяць чалавек, і выкарыстоўваюць яго для розных мэтаў, напрыклад, для вандроўкі з сябрамі, тады на кожнага прыходзіцца ўсяго толькі... па 60 долараў.

Ёсць і больш танны спосаб пялятаць. Дваццаць гадзін у паветры на лёгкім самалёце «Ікарус-С42» абыдуцца ў 50 долараў. Як бачыце, сёння можна і добра адпачыць, і здзівіць — былі б грошы.

Кожную пятніцу і суботу вясельныя картэжы ажыўляюць дарогі Беларусі. Амаль па два разы на тыдзень сталічная моладзь наладжвае ў лімузінах дзявочнікі ці хлапечнікі, нават са стрыптызам! Прыкладна два разы ў месяц закаханыя парачкі лятаюць на паветраным шары. А на Радаўніцу і звычайную машыну арандаваць цяжка.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Экспертыза

На бегавую дарожку і тэнісныя корты ў адных красоўках не ходзяць...

У гэта цяжка паверыць, але яшчэ 20 гадоў таму наяўнасць у гардэробе савецкага чалавека красовак лічылася рэдкай удачай. Блакітнай марай многіх школьнікаў 80-х гадоў былі красоўкі лідскай вытворчасці, але і іх знайсці ў свабодным продажы было вельмі праблематычна. А пра «Adidas», «Nike» ці «Reebok» не даводзілася нават і марыць.

Але нарэшце сітуацыя змянілася кардынальным чынам. Спартыўны абутак трывала ўвайшоў у наша жыццё, больш за тое, у спецыялізаваных спартыўных магазінах можна нават разгубіцца ад прапанаванага там выбару. Не менш багаты асартымент можна знайсці і на шматлікіх рэчавых рынках. Аднак мы ўсё ж такі паспрабуем разабрацца ў гэтым «багацці» з дапамогай спецыялістаў. А яны якраз папярэджваюць, што знешні выгляд спартыўнага абутку не можа быць вырашальным пры пакупцы. Галоўнае ў красоўках не прыгажосць, не іх супермодная форма, а камфорт, таму ў першую чаргу трэба звяртаць увагу на якасць і паходжанне матэрыялу. Для пачатку ўзважце красоўкі ў руках: калі абутак цяжкі, хутчэй за ўсё, перад вамі кантрафактная прадукцыя. Фірменны абутак павінен быць лёгкім. У якасных красоўках швы роўныя і акуратныя, а клей нідзе не бачны.

Для таго каб ногі ў красоўках «дыхалі», абутак вырабляюць з натуральнай скуры, камбінаванай з устаўкамі з тканіны. Праўда, апошнім часам з'явіліся сучасныя сінтэтычныя матэрыялы, напрыклад, гартэкс, які па знешнім выглядзе нагадвае нубук. Ён таксама валодае цудоўнымі вентыляцыйнымі ўласцівасцямі і выводзіць вільгаць. Яшчэ больш сучаснай з'яўляецца сістэма Clima Cool — яна забяспечвае не толькі камфорт для ступні, але і абараняе ногі ад знешніх уздзеянняў — холаду і дажджу. Таму такі абутак аднолькава падыходзіць для заняткаў спортам як у спартыўнай зале, але і на вуліцы.

Унутры красовак ні скуры, ні тым больш скуразамяняльніка быць не павінна — толькі тканіна, пажадана натуральнага паходжання, якая добра ўсмоктвае вільгаць, напрыклад, бавоўна. У фірменных красоўках яна часта мае антыбактэрыяльнае прамочванне. Выньце з красовак вусцілкі. У любым якасным абутку, не толькі спартыўным, вусцілкі можна дастаць і прасушыць. Гэта асабліва важна для тых, хто церпіць ад плоскаступнёвасці. Для такіх людзей не выпускаецца спецыяльных красовак. А плоскаступнёвасць можна карэктаваць пры дапамозе спецыяльных артапедычных вусцілак, якія ўстаўляюцца замест «родных», укладзеных у красоўкі. У фірменным абутку вусцілкі могуць мець невялікае патаўшчэнне пасярэдзіне. Гэты «бугарок» выконвае ролю супінатара, паколькі цудоўна падтрымлівае звод ступні і папярэджвае развіццё плоскаступнёвасці. Пад вусцілкай у красоўках павінны быць швы, а калі замест іх вы ўбачылі роўную кардонную ці тканінавую паверхню, лепш вярнуць абутак назад. У такіх красоўках нага будзе пацець, а вусцілка хутка разбурыцца.

Яшчэ адзін немалаважны крытэрый — якасць падэшвы. Падэшва — шматслойная канструкцыя. Рабро цвёрдасці, якое праходзіць уздоўж усёй падэшвы, вырабляецца з амартызацыйнага матэрыялу (у падробках гэта звычайная гума). У падробках адсутнічаюць таксама і спецыяльныя ўстаўкі, якія «гасяць» удары. Існуе некалькі сістэм, якія дазваляюць «гасіць» вібрацыю, — гэта або гель, або паветра, або газ, або пеністыя матэрыялы, якія ўбіраюць у сябе вібрацыю. Паветраная падушка ўяўляе сабой невялікі мяшочак, напампаваны паветрам ці асаблівым газам і запаяны пад пятку, а зрэдку — і пад пярэдні звод ступні. Выглядае ён як арыгінальны празрысты пластыкавы фрагмент у падэшве красовак. Пры хадзе падушка злёгку пружыніць і не дазваляе нагам стамляцца, а ўдар пяткі аб зямлю, які адчувае наш пазваночнік, змякчаецца пры кожным кроку. Апошнім часам вытворцы сталі выкарыстоўваць яшчэ і невялікія спружынкі са звыштрывалага матэрыялу. Але чаму аддаць перавагу? Усё індывідуальна — паветра, напрыклад, больш лёгкае, а пеністыя матэрыялы — больш надзейныя і больш даўгавечныя, затое робяць красоўкі больш цяжкімі для нагі.

Выбіраючы абутак, паспрабуйце сагнуць падэшву ў руцэ. Калі яна будзе прамерна цвёрдай ці «пераломіцца» пасярэдзіне, то вам будзе складана ў такіх красоўках не толькі бегаць ці выконваць нейкія фізічныя практыкаванні, але і проста гуляць.

Націсніце пальцам на насок. Калі ўмяцяны знікнуць даволі хутка, значыць, насок валодае добрымі эластычнымі ўласцівасцямі. Цяпер паспрабуйце сціснуць рукой пятко красовак. Калі яны сціскаюцца — перад вамі няякасны тавар. У адрозненне ад наска задняя частка абутку павінна быць цвёрдай, каб абараняць пятку пры фізічных ударах і змякшаць верагоднасць атрымання траўмы. А вось кант пяткі павінен быць, наадварот, мяккім і абавязкова прашытым у два швы.

Спартыўны абутак трэба падбіраць у залежнасці ад сезона, віду і ступені нагрузкі. Так, летнія мадэлі вырабляюць з больш тонкай скуры з устаўкамі з нейлону і сеткі. Абутак для халоднага надвор'я ўцяпляюць пры дапамозе асаблівага віду плашчоўкі і зверху прамочваюць спецыяльным сродкам, які абараняе ногі ад вільгаці. А зімовыя мадэлі робяць яшчэ і ўстойлівымі да марозу і солі, на якую вельмі «шчодрыя» нашы камунальныя службы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне будзе.)

Шчыра віншуем з юбілеем любую жонку і матулю
ДАНУТУ Іосіфаўну Чарняўскую.
Аднаго мы просім толькі ў Бога —
Каб вясёлай песняй быў твой лёс,
Каб пражыць гадоў табе так многа,
Колькі зорак на ручніку нябёс.

Муж, сыны, *в. Дзераўное.*

Карысная парада

ДАЕШ КОЖНАМУ ПА «МЯККАМУ МЕСЦУ»!

Нават самы заўзяты і няўрымслівы аматар падарожжаў не не, ды і памарыць, напэўна, раз-пораз «позу прыняць канапападобную». У сэнсе — адпачыць, прылегчы ў звыклай хатняй абстаноўцы, паспаць удосталь, пачытаць кнігу ці газету, паглядзець тэлепередачу. Для многіх з нас, уліччваючы далёка не шыкоўныя жыллёвыя ўмовы, у гэтым выпадку, як правіла, памочнік і надзейны сябар толькі адзін — тая самая канапа. Абсалютна не маю на ўвазе «абломаўшчыну», проста далёка не ўсе на сваіх квадратных метрах могуць дазволіць сабе мець увесь пералік мяккай мэблі, звычайна людзі вымушаны абмяжоўвацца як раз адной канапай (як варыянт — з адным або некалькімі крэсламі, магчыма, яшчэ банкеткамі ці пуфікамі). Такім чынам, канапа — гэта і месца для спання, і чытальная зала, і клуб па інтарэсах. А, значыць, да выбару гэтага прадмета мэблі трэба падыходзіць вельмі адказна і ўдумліва, бо набываецца канапа звычайна не на адзін год. Балазе, сёння ёсць з чаго выбіраць. Не тое, што дзесяць гадоў таму, калі, ратуючыся ад «унукаў» савецкай канапы, якімі былі завалены магазіны, давялося заказваць мяккі куток з Польшчы.

Фота Пятра ФАМІНА.

«Кніжка» або «тэлескоп»?

Пачнём з механізмаў трансфармацыі, якія дазваляюць ператвараць мэблю са становішча «канапа» у становішча «ложак». Разгледзім асноўныя з іх.

«Раскладушка». Гэты тып механізма трансфармацыі ўяўляе сабой металічную канструкцыю, нясучыя элементы якой выраблены з металічнай трубы. Упершыню мы даведаліся пра «раскладушку», калі мяккую мэблю пачалі завозіць да нас з-за мяжы. Напачатку гэта былі так званыя «гасцявыя» варыянты, не прызначаныя для штодзённага карыстання. Праўда, зараз з'явіліся «ўзмоцненыя» варыянты на кожны дзень. Спальнае месца пры такім тыпе лёгка выкідваецца наперад. Несумненнай перавагай з'яўляецца тое, што пры трансфармацыі са становішча «канапа» ў становішча «ложак» не псуецца падлога (найперш паркет ці ламінат).

«Еўракніжка». Механізм папярэчнай трансфармацыі (па шырыні): напачатку высоўваецца наперад да ўпора сядзенне, затым апускаецца ўніз спінка. Спальнае месца фарміруецца якраз з гэтых двух частак. Каб надаць большую мяккасць спінцы ў становішчы «канапа», выкарыстоўваюцца дадатковыя падушкі, якія адначасова памяншаюць глыбіню сядзення. Перавагай такога механізма з'яўляюцца вялікія, у параўнанні з іншымі механізмамі, спальнае месца (ложак, напрыклад, можа складаць 1,5х2,1 метра) і ёмістасць для захоўвання спальных прыналежнасцяў. Да недахопаў, бадай, можна аднесці глыбіню ўсёй мэблі: спінка ў становішчы «канапа» можа займаць дадатковыя 5—8 сантыметраў, а ў становішчы «ложак» або трэба мірыцца з невялікай шчылінай паміж краем мэблі і сцяной, або кожны раз падсоўваць канапу да сцяны.

«Кніжка». Самы звыклы нам механізм трансфармацыі, калі спінка проста адкідваецца. Да плюсаў можна аднесці невялікае па плошчы месца, якое займае канапа з такім механізмам, хуткасць (адным рухам) у раскладванні, даволі вялікае месца для захоўвання прыналежнасцяў. Недахопы: механізм можа лёгка выходзіць са строю (усе памятаюць гэтыя «раздолбаныя» жалезкі, праўда, зараз можна заказаць механізм замежнай фірмы, які пры правільнай эксплуатацыі праслужыць дастаткова доўга); пры высокай спінцы, як і ў выпадку з «еўракніжкай», або глыбіня мэблі павялічваецца на некалькі сантыметраў за кошт неабходнага для раскладвання зазору паміж канапай і сцяной, або мэблю кожны раз трэба рухаць туды-назад.

«Тэлескоп». Многія лічаць гэты «выкатны» механізм трансфармацыі найбольш зручным, хаця, як вы разумееце, усё на аматара. Прынцып дзеяння: з-пад сядзення высоўваецца дадатковая плоскасць, а розніца ў вышыні яе і «асноўнага» сядзення кампенсуецца падушкамі. Да істотнага мінуса можна аднесці колы такога механізма: нельга выбіраць танныя пластмасавыя, бо яны будуць псаваць падлогу (асабліва паркет ці ламінат) або хутка ўвогуле выйдуць са строю. Выбірайце больш дарагія каучукавыя.

Паралон або спружыны?

Зноў жа — на аматара. Галоўнае, на наш погляд, глядзець на вытворцу. Бо сучасны паралон (насамрэч эластычны пенаполіўрытан) — гэта высокаабъёмны матэрыял, які мае добрыя пругкія якасці і аднаўляльнасць, і можа значна пераўзыходзіць танныя спружыны. З іншага боку разгледзім спружынныя блокі, якія набіраюцца з двухконусных спружын. Апошнія павінны быць звіты са спружыннага дроту, кольцы ў спружынах падабраны так, каб пры нагрузцы яны мінімальна датыкаліся адно другога і каб уваходзілі адно ў другое. Тады не будзе традыцыйнага скрыпу пры эксплуатацыі мэблі.

Натуральна, паралон будзе каштаваць танней. Але трэба ўлічваць, як часта вы збіраецеся карыстацца канапай, на які тэрмін набываеце яе. Не лішнім будзе прысесці на мэблю (нават прылегчы), каб ацаніць ступень камфорту. Няхай гэта ацэнка будзе суб'ектыўнай, але ж менавіта вам рабіць свой выбар.

З чаго каркас?

Мы свядома пакінем па-за кадрам пытанні абіўкі, бо тканіну кожны выбірае на свой густ, уліччваючы шэраг фактараў: натуральны матэрыял ці штучны, маркі ці не і г.д. Яна навідавоку, таму, як правіла, ёй надаюць шмат увагі, а вось унутр канапы калі і заглядвае большасць, дык мімаходзь.

Між тым каркас — асноўны элемент канструкцыі, на якім мацуюцца ўсе іншыя часткі. Урэшце рэшт менавіта ён выконвае ўсе асноўныя функцыі па трываласці пры транспарціроўцы і эксплуатацыі мэблі. Улічваючы гэта ў залежнасці ад вышэйсказанага. Для вырабаў каркасаў выкарыстоўваюцца такія асноўныя матэрыялы, як фанера (ДВП) і масіў драўніны (у многіх вытворцаў пры выбары канкрэтнай мадэлі кліент можа абраць або адно, або другое). Каркас знутры можа быць пакрыты лакам (драўніна), пафарбаваны або абцягнуты тканінай (магчыма, прыгожа, але наколькі практычна?). Пры выбары масіву драўніны (сасна, можа быць бяроза) галоўнае, каб яна была добра прасушана, але тут застаецца толькі верыць на слова прадаўцу (і абавязкова высвятляць тэрмін гарантыі мэблі). Яшчэ абавязкова высветліце ў прадаўца, у якім выглядзе будзе дастаўляцца канапа: ужо цалкам сабраная ці збіраць будуць ужо на месцы. Бедаю выпадкі, калі людзі мусілі ў апошні момант адмаўляцца ад пакупкі, паколькі з-за асаблівасцяў канструкцыі ўжо цалкам сабраная мэбля не «праходзіла» ў габарытах «хрушчоўкі».

Вытворца і тэрміны

Напачатку пра апошнія. У большасці тэрмін выканання заказу (калі вы не набываеце адразу тое, што бачыце ў гандлёвай зале магазіна, а заказваеце абіўку, колькасць падушак і інш.) складае ад аднаго да двух месяцаў. У некаторых выпадках вас папросяць унесці перадаплату (каля 20 працэнтаў ад кошту), у іншых — канчатковы разлік пасля выканання заказу.

Што да вытворцаў, дык апошнім часам нашы прыватнікі навучыліся рабіць неблагую мяккую мэблю (часта капіруючы італьянскую, але за значна меншыя грошы). У наяўнасці ў іх, як правіла, даволі прыстойны выбар абіўкі, канапа можа камплектавацца рознай колькасцю падушак, крэслаў, банкетак (за дадатковую плату, зразумела). Дарэчы, пра «цану пытання» гаварыць не будзем: занадта многа фактараў уплывае на яе фарміраванне. Умоўна кажучы, пры адноласкавым тыпе механізму трансфармацыі можна выбраць самую танную ці самую дарагую тканіну, і розніца ў кошце канапы будзе істотнай. Спадзяёмся, наша «Карысная парада» дапаможа вам самастойна задаць усе патрэбныя пытанні прадаўцу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАВЕРЫМ НОВЫ ДЗЕНЬ НОВАМУ ПАКАЛЕННЮ

на адным з вядучых, прэстыжных прадпрыемстваў рэспублікі — ААТ «Нафтан»? і прадпрыемства ў прыватнасці?

«Нафтанаўскі» дэсант у гарах Каўказа.

тацыі, падчас прыпыначных рамонтаў. Па выніках іх работы выдаюцца тэхнічныя рашэнні па рамонту або ўказваюцца тэрміны па далейшай эксплуатацыі абсталявання. «Наша заключэнне — аснова для далейшай эксплуатацыі завода, — удакладняе Андрэй Скрабатун. — Служба вельмі адказная, так што ўсе спецыялісты маюць мінімум адну вышэйшую адукацыю. Некаторыя заканчваюць аспірантуру, магістратуру. У асноўным кадрамі забяспечваюць Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі нацыянальны тэхналагічны ўніверсітэт, Фізіка-тэхнічны інстытут Нацыянальнай акадэміі навук. Яскравым прыкладам высокай адукаванасці, высокага прафесіяналізму і адказнасці з'яўляецца наш унікальны 27-гадовы Аляксандр Крыленка».

Застаецца дадаць, што калектыў службы тэхнічнага абслугоўвання актыўны не толькі ў пашырэнні ведаў і прафесійным удасканаленні, але і ў баўленні вольнага

Аператар тэхналагічнай установкі на вытворчасці № 1 Сяргей СКІБА не прайграе ні ў спорце, ні ў асабістым жыцці.

часу. Наогул, няма такога віду спорту, на які ў гэтай службе не знайшлося б удзельніка. Многія работнікі за ўмоўную плату да чатырох разоў на тыдні наведваюць спарткомплекс «Нафтана». Што датычыцца сацыяльнага забеспячэння, у прыватнасці, вырашэння жыллёвага пытання, то тут моладзі не даводзіцца доўга чакаць. Летась два спецыялісты атрымалі жыллё

Лепшы ў тайскім боксе і кікбоксінгу

Сяргей СКІБА, аператар тэхналагічных установак на вытворчасці № 1 скончыў Наваполацкі політэхнічны тэхнікум па спецыяльнасці «тэхніка-механіка». Зараз завочна вучыцца на кафедры хімічнай тэхналогіі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. На «Нафтан» прыйшоў працаваць у 2003-м аператарам тэхналагічных установак.

— Яшчэ на першым курсе вучобы ў тэхнікуме прыйшоў на спаборніцтвы па кікбоксінгу «пахварэць» за сябра. Мне так спадабалася, што я пачаў рэгулярна займацца кікбоксінгам і тайскім боксам у спартыўным клубе «Алімп». У 2002 годзе заваяваў сярэбраны медаль па тайскаму боксу на чэмпіянаце Еўропы ў Партугаліі. У 2003-м — заняў 2-е месца на чэмпіянаце свету па кікбоксінгу ў Ялце і стаў чэмпіёнам свету па тайскаму боксу ў Тайландзе. У 2004-м заваяваў 2-е месца на чэмпіянаце свету па тайскаму боксу ў Тайландзе і стаў чэмпіёнам Кубка свету па кікбоксінгу ў Маскве. У 2005-м — сярэбраны медаль на чэмпіянаце свету па тайскаму боксу, бронзавы медаль на чэмпіянаце свету па кікбоксінгу ў Марока. Летась атрымаў «серабро» на чэмпіянаце Еўропы па кікбоксінгу ў Македоніі. Зараз я — майстар спорту міжнароднага класа па тайскаму боксу і кікбоксінгу. Падчас падрыхтоўкі да спаборніцтваў мяне вызваляюць ад работы і адпускаюць на вучэбна-трэніровачныя зборы. Калі іх няма, значыць, спалучаю работу з трэніроўкамі. Гэта вельмі цяжка. Але спорт — хуткавей, хобі, чым сэнс жыцця. Таму я вучуся, і адтэрміновак на сесіі мне ніхто не дае. Надалей маю намер атрымаць другую вышэйшую адукацыю ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Пакуль мяне задавальняе маё становішча, і я вельмі ўдзячны «Нафтану» за тое, што ён камандзіруе мяне на спаборніцтвы, спансіруе мае падарожжы. Усё-ткі кікбоксінг і тайскі бокс — не алімпійскія віды спорту, і Мінспорту спансіруе літаральна трох спартсменаў плюс трэнера зборнай. Астатнія павінны самі шукаць грошы на свае паездкі.

Хімічны аналіз ускладзены на жанчын

Сяргей СУШКО, начальнік аддзела тэхнічнага кантролю цэха № 13 кажа, што пад яго кіраўніцтвам працуе каля 230 чалавек, прычым 216 — гэта жанчыны. Звыш 60 — ва ўзросце да 31 года.

— Нашы жанчыны — лабаранты хімічнага аналізу 3—5 разраду, мужчыны — слесары-рамонтнікі. Летась да нас прыйшлі па размеркаванню спецыялісты з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Для нашых супрацоўнікаў вышэйшая адукацыя не абавязковая, але, як было заўважана вышэй, такія ёсць. Працуюць новаспечаныя спецыялісты ў паліўнай, маслянай і газаказталітычнай лабараторыях, дэманструюць высокі ўзровень ведаў. Дарэчы, у цэху — пяць лабараторый: па кантролю паліўнай вытворчасці, масляная, даследчая, газаказталітычная і санітарная.

Работа аддзела, інакш ён яшчэ называецца цэнтральнай лабараторыяй, заключаецца ў правядзенні аналітычнага кантролю за тэхналагічным працэсам завода.

Галоўны механік Анатоль ШУЦІН.

Мы павінны ажыццяўляць уваходны кантроль сыравіны, якая прыходзіць на завод, хадавы кантроль у час перапрацоўкі і пашпартны — падчас адгрузкі. Ад дакладнасці і аб'ектыўнасці нашых вынікаў залежыць рэжым тэхналагічных аб'ектаў прадпрыемства. Лабараторыя акрэдытаваная па міжнароднай сістэме якасці ISO.

Што датычыцца вольнага часу, то нашы спецыялісты актыўна ўдзельнічаюць у турзлётах, штогадовай спартакіядзе, якая праводзіцца па 22 відах спорту. Нічэй за 2-е месца не апускаліся...

Спадарыня Восень

Святлане КАЛТУНОВАЙ, лабаранту хімічнага аналізу — 26 гадоў. Пасля заканчэння вучобы на кафедры хімічнай тэхналогіі паліўных і вугляродных матэрыялаў у Полацкім дзяржаўным універсітэце ў 2002 годзе паступіла ў магістратуру і атрымала дыплом магістра тэхнічных навук. Дарэчы, у тым жа годзе перамагла ў конкурсе газеты «Знамя юности» і атрымала тытул «Спадарыня Восень». Зараз вучыцца на 3-м курсе аспірантуры Полацкага ўніверсітэта. На «Нафтан» прыйшла па размеркаванню чатыры гады таму. З'яўляецца тут, у 13-м цэху, актывістам-лідарам БРСМ, бярэ ўдзел ва ўсіх культурна-масавых мерапрыемствах. Добра валодае французскай мовай, англійскую вывучае з рэпетытарам. Любіць спорт — настольны тэніс, гандбол.

60 прафесій адной вытворчасці

Вытворчасць № 5 — гэта сем участкаў па рамонту тэхналагічнага абсталявання. Помпава-кампрэсарнага, напрыклад, калон і апаратаў ёмістага тыпу, вентыляцыі арматуры, будынкаў і збудаванняў і г.д. Адным словам, шматфункцыянальная структура. «У нас на заводзе — звыш дзвюх тысяч помпаў, больш як 100 кампрэсараў — складанага тэхналагічнага абсталявання, якое мы павінны рамантаваць, — тлумачыць **Іван ГАРДЗЕЕЎ, намеснік начальніка вытворчасці № 5.** — Мы вырабляем, напрыклад, запчасткі да абсталявання на механічным участку. На ўчастку ўладкавання тэрыторый рамантуем да-

Намеснік начальніка рамонтна-механічнай вытворчасці № 5 Іван ГАРДЗЕЕЎ не хавае рэдкіх кадраў.

рогі, ажыццяўляем бягучы і капрамонт, робім разметку. У межах праграмы «Адраджэнне вёскі» летась пабудавалі 15 дамоў у Пастаўскім раёне. Працягваем будаўніцтва і сёлета. Аказваем шэфскую дапамогу сельскагаспадарчым арганізацыям — у жніўні, напрыклад, са сваёй тэхнікай дапамагалі ўбіраць ураджай».

Штогод па заяўцы вытворчасць № 5 прымае двух выпускнікоў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і двух выпускнікоў тэхнікума. На падставе конкурсу адбіраецца яшчэ дзесьці каля 20 чалавек у год. Гэта вытворчасць, бадай, самая багатая на колькасць прафесій — іх тут каля шасцідзесяці. Асноўная — слесар па рамонту тэхналагічных установак. Але ёсць і адзінкавыя — заліўшчык свінцова-алавяністых сплаваў, заточнік сухім спосабам, каваль на молатах і прэсах. Штогод у групах тэхнічнага мінімуму праводзяцца курсы павышэння кваліфікацыі. 5—6 груп па 20 чалавек у кожнай вучацца з кастрычніка па сакавік. Па завяршэнні спецыяльная камісія прымае экзамен — правярае веды. Так можна павысіць разрад да 6-га. Слесар 6-га разраду далей можа стаць майстрам, старшым майстрам, начальнікам участка, намеснікам начальніка вытворчасці, начальнікам вытворчасці. Іван Гардзееў пачынаў у свой час слесарам 3-га разраду. На 5-м яго прызначылі майстрам, пасля калектыў выбраў начальнікам участка. Цяпер ён — намеснік начальніка вытворчасці.

На вытворчасці № 5 ёсць адказны за ўдзел работнікаў у спартыўных мерапрыемствах — інжынер-канструктар 2-й катэгорыі Крыўко Вячаслаў. Спецыялісты ўдзельнічаюць у першынствах па футболу, настольнаму тэнісе, лёгкай атлетыцы, турзлётах.

Андрэю БАНДАРЭНКУ, намесніку начальніка вытворчасці № 5 — 27 гадоў, а новую пасаду ён атрымаў літаральна 1 верасня.

— Адказваю за працэс падрыхтоўкі да рамонту, яго выкананне і здачу, — гаворыць ён. — А трапіў я на «Нафтан» па конкурсе. У 2002 годзе скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «трубаправодны транспарт нафты і газу», і мяне ўзялі на аб'ект, які будаваўся, — комплекс «Гідракрэкінг», на ўстаноўку фракцыянавання машыністам помпаў 4-га разраду. Комплекс будаваўся, я набіраўся вопыту, цягнуўся і паступова стаў механікам гэтага самага комплексу. Пасля мяне паравялі механікам установкі «Трэці рэформінг». Там адпрацаваў 2,5 года, і па запрашэнню начальніка 5-й вытворчасці трапіў у рамонтную вытворчасць вядучым спецыялістам па рэканструкцыі. Праз паўгода пасля знаёмства з асноўнымі накірункамі работы, нюансамі рамонту тэхналагічнага абсталявання, стаў намеснікам. Маю членства ў БРСМ і лічуся ў складзе добраахвотнай дружыны па ахове правапарадку. Без членаў гэтай дружыны не абыходзіцца, бадай, ніводнае масавае мерапрыемства ў горадзе.

Паводле слоў **галоўнага механіка Анатоля ШУЦІНА,** задача рамонтнай службы прадпрыемства — забеспячэнне тэхнічнага і міжрамонтнага абслугоўвання, правядзенне капрамонту абсталявання і збудаванняў. Гэтай рабоце папярэднічае вялікая работа на стадыі распрацоўкі праектаў, планавання. Яе ажыццяўленне залежыць ад узаемадзеяння ўсіх службаў прадпрыемства — матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, праектных упраўленняў, камплектацыі і вытворчасцяў. Усе работы — павышанай адказнасці і праводзяцца ў сціслыя тэрміны, таму вялікае значэнне мае ўзровень падрыхтоўкі і адказнасці спецыялістаў. Дарэчы, навучальныя ўстановы выхоўваюць менавіта такія кадры. Дзякуючы гэтаму і ўдаецца дасягнуць пастаўленых мэтаў, мяркуе Анатоль Шуцін.

Рэдкі кадр — каваль

Каваль на молатах і прэсах Алег АСУШЧАНКА.

Тры гады працуе на «Нафтане» **Алег АСУШЧАНКА, каваль на молатах і прэсах**. Некалі працаваў у Маскве, у прыватніка — вопыту набіраўся. Паколькі ў Беларусі на каваля не вучаць, давялося перайматься вопыт у тых людзей, якія ўжо авалодалі гэтым майстэрствам. Фактычна ўсе кавалі — самавучкі. Зараз Алег умее практычна ўсё. Па гарадзе можна адшукаць прыклады яго коўкі, галоўным чынам, дэкаратыўнай. Ва ўласным доме нічога ўзорна-паказальнага зрабіць яшчэ не паспеў — увесь вольны час робіць гараж. Работа на заводзе, зразумела, нічога агульнага з дэкорам не мае. «Не магу не заўважыць, што абсталяванне, на якім я працую, патрабуе абавязковай замены. Яно «разбілася», разнасілася, калі так можна сказаць, і ўдар праблематычна правільна дазіраваць», — сказаў Алег, калі мы прыйшлі паглядзець на яго рабочы «інструмент».

Хто нафту прымае, той і адгружае

Паводле слоў **Сяргея ЯЎТУШЫКА, начальніка цэха № 8,** з больш як 400 чалавек, якія працуюць пад яго кіраўніцтвам, звыш 100 — моладзь. «Зараз адбываецца працэс абнаўлення кадраў, па-

Падпісчык «Звязды», аматар футбола начальнік цэха № 8 Сяргей ЯЎТУШЫК.

колькі тыя, хто прыйшоў на завод сорак гадоў таму маладым спецыялістам, цяпер рыхтуюцца да выхаду на пенсію, — знаёміць са сваім калектывам Сяргей Яўтушык. — Увогуле ж кожны год да нас прыходзіць пяцёрка выпускнікоў мясцовых устаноў. Асноўныя нашы спецыяльнасці — слесар, аператар-машыніст, зліўшчык-разліўшчык. Я прыйшоў на завод у 1991-м інжынерам-тэхнолагам. Мой працоўны шлях можна падзяліць пакуль на дзве часткі: першую я адпрацаваў інжынерам-тэхнолагам, а другую — начальнікам цэха...».

Цэх № 8 прымае расійскую нафту, адпраўляе на перапрацоўку, атрымлівае та-

Загадчыца інтэрната № 1 ААТ «Нафтан» Галіна БУРМІНАВА.

рэаграфічны ансамбль «Камарыкі», ансамбль бальных танцаў «Менуэт», дзіцячы тэатр «Крынічка», выяўленчая студыя «Сонейка», калектыў «Юнацтва». Сёлета народная студыя эстрадных шоў-праграм «Он-лайн» стала лаўрэатам 10-га традыцыйнага абласнога свята беларускай эст-

Адзін з любімых відаў спорту.

Палац культуры — у дзесятцы лепшых

6 лістапада Палацу культуры ААТ «Нафтан» споўняецца 40 гадоў. Гэта ўнікальная ўстанова яшчэ дасць фору многім маладым будынкам. Наваполацкі палац уваходзіць у дзесятку лепшых у краіне. Сапраўды, некаторыя памяшканні, скажам, зала для правядзення тых жа семінараў, пасяджэнняў, дзелавых і творчых сустрэч увогуле падаецца музеем. Палац дыхае ўрачыстасцю, дасканаласцю ліній і формаў ва ўсім. Праўда, **дырэктар Таццяна НЯЧАЕВА**, якая прыйшла сюды масавіком у 1973-м і вось ужо дваццаць гадоў з'яўляецца дырэктарам установы, сціпла заўважае, што бачыла і больш дасканалыя палацы. Да чаго і будзе спрабаваць імкнуцца. У найбліжэйшых планах, напрыклад, — маштабная, грунтоўная рэканструкцыя глядзельнай залы. Патрабуецца абнаўленне акустычнай сістэмы, сінтэзатара, мікшэрнага пульта, радыёмікрафонаў. Спартыўная зала чакае набыцця падвясной і страхавочнай апаратуры, паколькі тут займаюцца артыстры цырка.

ААТ «Нафтан» утрымлівае непасрэдна будынак палаца і фінансуе асноўныя мерапрыемствы, якія плануюцца і праводзяцца сумесна з прафкамам прадпрыемства. Цяпер у Палацы культуры працуе 60 чалавек, 15 — па-за штатам, на самаакупнасці. Яны займаюцца падрыхтоўчымі групамі, выхоўваюць будучых танцораў, спевакоў, паўнавартасных артыстаў эстрады. «Палац ажыццяўляе культурна-масавую работу з працоўнымі ААТ «Нафтан», з моладдзю, якая пражывае ў інтэрнатах, з дзецьмі і падлеткамі, — тлумачыць Таццяна Нячаева. — За паўгода мы правялі звыш сотні мерапрыемстваў. Для многіх навапалачан Палац культуры застаецца месцам, дзе можна знайсці занятак па душы, раскрыць саве творчыя магчымасці, развіць таленты. І сёння тут спяваюць, танцуюць, займаюцца музыкай, цыркавым, тэатральным і іншымі відамі мастацтва звыш тысячы дзяцей і дарослых ва ўзросце ад 4 да 50 гадоў».

Паводле слоў **загадчыцы аддзела па арганізацыі мастацкай самадзейнасці Надзеі ФУРСЕЙ,** зараз у палацы дзейнічае 11 калектываў мастацкай самадзейнасці, два клубы па інтарэсах — клуб ветэранаў і вінаградараў і 10 падрыхтоўчых платных груп. З 11 дарослых калектываў 7 носяць званне «народны» і «ўзорны». Гэта духавы аркестр, які ўваходзіць у тройку лепшых у рэспубліцы, студыя эстрадных шоў-праграм «Он-лайн», вакальна-ха-

Немалады, але ж пераможца

Інтэрнату № 1 ААТ «Нафтан» у наступным годзе споўніцца 45 гадоў. Сапраўды немалады, згодна **загадчыцы ўстановы Галіны БУРМІНАВА,** але з 2001 года не саступае першага месца ў штогадовым гарадскім аглядзе-конкурсе нават інтэрнатам з еўра-рамонтамі.

Два пад'езды — жаночыя, адзін — для сямейных пар. Сёння тут пражывае каля сотні чалавек. Нягледзячы на тое, што інтэрнат належыць «Нафтану», 80 працэнтаў жыльцоў — асобы старонніх арганізацый. Дарэчы, іх каля трыццаці. «Такім чынам, — кажа Галіна Бурмінава, — пры засяленні новага чалавека заключаецца трохбаковая дамоўленасць аб аплаце. Плаціць за пражыванне будзе сам чалавек, старонняя арганізацыя, якая адгукаецца, дарэчы, на любую нашу просьбу, і, нарэшце, сам «Нафтан». Як правіла, рамонтныя работы застаюцца за «Нафтанам», а арганізацыі пакрываюць нам бягучыя расходы».

Пакоі ёсць розныя. Класічны варыянт — 9 метраў з аплатай каля 40 тысяч рублёў у месяц. Летам падскочыў кошт на мыццё блізіны да 30 тыс. у месяц, і дзяўчаты адмовіліся ад такой паслугі, цяпер самі будуць вырашаць гэта пытанне. «Дзяўчынкі мае — цудоўныя, — знаёміць з насельнікамі інтэрната Галіна Уладзіміраўна. — Галоўным чынам, з Віцебска, Ушацкага, Міёрскага і некаторых іншых раёнаў. Сумаваць па дому ім няма калі. Ёсць у нас гурток мастацкай самадзейнасці «Медуніца», спартклуб «Грацыя», сямейны клуб «Яблынька», фотагурток. Паверце, інтэрнат жыве досыць насычаным культурным жыццём...».

Святлана БАРЫСЕНКА, Віктар ПАЗНЯКОЎ. Фота Алега ЕЛЬКІНА.

Розныя пакаленні «Нафтана»: справавод Людміла КАЗЛОВА, начальнік участка аўтаматызаванай сістэмы ўпраўлення вытворчасцю Павел АЛЬХА і ветэран працы Павел Андрэевіч ТАЧЫЛА.

Майстар Андрэй ТЫЧЫНА і электраманцёр Міхаіл КРЫВАШЭЕЎ правядзяць наладку электраабсталявання.

Інспектар канцылярыі Алёна ЧАПКОЎСКАЯ, машыніст Анжэла ПІМЕНАВА, тэхнік па працы Аксана МОЛІСАВА і намеснік начальніка цэха № 9 Аляксандр КЯЦКО.

У Палацы культуры — 7 «народных» і «ўзорных» калектываў.

P.S. ААТ «Нафтан» перажывае зараз не самы лёгкі час. І тым не менш жыццё падказвае неабходнасць захавання тых жа інтэрнатаў, спартыўных і культурных збудаванняў. Кіраўніцтва прадпрыемства падтрымлівае жаданне калектыву не забывацца на добрыя традыцыі. А ўсё таму, што кожнае новае пакаленне спецыялістаў, безумоўна, лепей за папярэдняе — з большай аддачай працуе, больш старанна вучыцца і хутчэй робіць кар'еру, а значыць, заслугоўвае адпаведных магчымасцяў для ўладкавання свайго асабістага жыцця і баўлення вольнага часу. Немагчыма, зразумела, расказаць пра ўсіх маладых нафтанаўцаў — іх поспехі і дасягненні, але аўтары артыкула жадаюць усяго самага лепшага кожнаму, з кім пазнаёміліся і хто застаўся за кадрам.

Зверавыя лайкі супраць мядзведзя

5-я міжрэгіянальныя спаборніцтвы зверавых лаек на Кубак Рэспубліканскага дзяржаўнага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» прайшлі з 21 па 23 верасня ў Ваўкавыскім лесе. Больш за паўсотню паляўнічых сабак узялі ўдзел у спаборніцтвах. Сабакі выступілі ў адзіночным і парным разрадах. Адным з этапаў спаборніцтваў было паляванне на мядзведзя. Сабака павінен быў знайсці звера па следзе, а затым — напасці на мядзведзя. Суддзі расказалі, што найвышэйшы бал лайка атрымлівае, калі зможа ўхапіць звера за заднія лапы, пры гэтым адхінуцца ад удараў мядзведзя. Час выступлення лайкі жорстка абмежаваны: 15 хвілін. Пяты год у верасні спаборніцтвы збіраюць аматараў палявання з усёй рэспублікі, а таксама блізкага замежжа. Галоўны прыз — Дыплом найвышэйшай ступені, для атрымання якога неабходна набраць 80 балаў мінімум.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

ФЕСТЫВАЛЬ ПРЫГАЖОСЦІ

Фота БЕЛТА.

Прыгажосць выратоўвала свет на працягу чатырох дзён у мінскім Палацы мастацтва. Упершыню ў Беларусі прайшоў Міжнародны фестываль прыгажосці «Белыя росы». У ім удзель-нічалі 230 прафесіяналаў і майстроў-пачаткоўцаў цырульніцкага мастацтва, манікюру, дэкаратыўнай касметыкі і нэйл-дызайну.

На Фестывалі адбылася важнейшая падзея для спецыялістаў-касметолагаў — І Міжнародны касметалагічны кангрэс, у якім узялі ўдзел урачы-касметолагі з Расіі і Беларусі. Таксама была першая міжнародная спецыялізаваная выстаўка парфумерна-касметычнай прадукцыі, абсталявання, найноўшых дасягненняў у індустрыі прыгажосці і аксесуараў для цырульняў, фітнэс-клубаў, салонаў прыгажосці.

Конкурсная праграма ў блоку «Мастацтва прыгажосці» праходзіла ў форме Адкрытага чэмпіянату па цырульніцкаму мастацтву, дэкаратыўнай касметыцы і нэйл-дызайну на Кубак «Садружнасці». Упершыню ў Беларусі Кубак «Садружнасці» склаў 50 кубкаў і каля 240 медалёў, а таксама два Гран-пры для абсалютных пераможцаў у конкурсе цырульнікаў і нэйл-дызайнераў з золата 999-й пробы, якія атрымалі нэйл-дызайнер Ала Лукша і лепшы цырульнік Яўгенія Вішнякова.

Фестываль быў праведзены дзякуючы Фонду садзейнічання развіццю цырульніцкага мастацтва, дэкаратыўнай касметыкі і эстэтыкі «Працвітанне» у супрацоўніцтве з Беларускім Дэльфійскім камітэтам.

Наталля НОВІК.

Спорт-тайм

Дэбютавалі

Жаночая нацыянальная зборная Беларусі па баскетболу правяла першы матч на чэмпіянаце Еўропы. На жаль, наша каманда дэбютавала з паражэння іспанкам (62:76). Аднак шанц выйсці ў чарговы этап ЧЕ ў Італіі выхаванкі Анатоля Буяльскага захоўваюць, бо далей праб'юцца тры наймацнейшыя дружыны групы, а значыць, як мінімум неабходна адна перамога. Саперніцамі беларусак акрамя іспанак з'яўляюцца спартсменкі з Сербіі і Харватыі. Больш за ўсё ачкоў у першым матчы на рахунку беларускі Кацярына Сныцінай (18).

Барацьба за «срэбра» і «бронзу» абвастрылася

За шэсць тураў да фінішу 17-га чэмпіянату Беларусі па футболе барысаўскі БАТЭ лідзіруе з адрывам у 10 ачкоў ад бліжэйшай каманды (мінскі МТЗ-РІПА мае ў сваім актыве 35 ачкоў) і пры гэтым яшчэ мае гульню ў запасе. Менавіта матчам з удзелам падначаленых Ігара Крышэнкі і завяршыўся 20-ы тур. Дзякуючы галявому таленту нападаючага Віталя Радзівонава барысаўчане перамаглі на сваім полі «Гомель» (2:0). Калі футбольнае «золата» гэтага сезона хутчэй за ўсё адправіцца ў Барысаў, то прадказаць, каму дастануцца астатнія ўзнагароды пакуль нельга, бо прэтэндэнты (МТЗ-РІПА, «Шахцёр», «Тарпеда») літаральна дыхаюць адзін другому ў спіну.

Нагадаем вынікі іншых сустрэч 20-га тура: «Днепр» (Магілёў)—«Шахцёр» (Салігорск) — 2:3, «Нёман» (Гродна)—«Тарпеда» (Жодзіна) — 0:1, «Віцебск»—«Дынама» (Брэст) — 3:1, «Дарыда» (Ждановічы)—«Смаргонь» — 1:0, «Мінск»—«Нафтан» (Наваполацк) — 1:2, «Дынама» (Мінск) — МТЗ-РІПА (Мінск) — 0:1.

Не 2013, дык 2014 год

Чэмпіянат свету па хакею з шайбай у 2013 годзе прыме Швецыя. Такое рашэнне было прынята на кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея ў канадскім Ванкуверы. За Швецыю прагаласавала 70 з 96 удзельнікаў, а за Беларусь, якая заняла другое месца, — 15. Венгрыю падтрымала 8 членаў Кангрэса, Чэхію — 3, Латвія наогул зняла сваю кандыдатуру. ЧС-2013 плануецца правесці ў гарадах Стакгольм і Мальме. Швецыя ў дзесяты раз стане гаспадыняй сусветнага лядовага форуму. Цікава, што на хатняй арэне васьміразовыя чэмпіёны свету ніколі не станавіліся наймацнейшай зборнай планеты. Дарэчы, Беларусь заявіла аб сваім намеры прыняць ЧС-2014.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.01	19.00	11.59
Віцебск —	6.51	18.49	11.58
Магілёў —	6.51	18.50	11.59
Гомель —	6.48	18.46	11.58
Гродна —	7.17	19.15	11.58
Брэст —	7.17	19.16	11.59

Месяц

Поўня ў 22.46.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. Аляксандра, Валяр'яна, Ілы, Карнілы, Лук'яна, Мікалая, Пятра, Сцяпана;
К. Люцыі, Тэрэзы, Юстыны, Дамяна, Космы, Ніла, Цыпрыяна.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+19 — +21 °C	МАСКВА	+15 — +17 °C
ВІЛЬНЮС	+17 — +19 °C	РЫГА	+17 — +19 °C
КІЕЎ	+18 — +20 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+15 — +17 °C

26 верасня

Дзве даты

1942 год — фашысты ажыццявілі другі, найбольш масавы ўдар па мінскім падполлі, пачаўшы новую хвалю арыштаў, у час якіх былі схоплены і кінуты ў засценкі СД сотні падпольшчыкаў-патрыётаў. Практычна ўсе яны загінулі.

1968 год — праз месяц пасля трагічных падзей у Празе газета «Правда» абнародавала «дактрыну Брэжнева пра «абмежаваны суверэнітэт» сацыялістычных краін.

Цытата дня:

«Маладосць і сярэдні ўзрост мы павінны прысвяціць радзіме, старасць — сабе».

Пліній Малодшы (62—114), старажытнарымскі грамадскі дзеяч і пісьменнік.

Карані

РАСОНЫ «ПАСТАРЭЛІ»

Археолагі высветлілі, што паселішча на палову тысячагоддзя старэйшае, чым лічылася дагэтуль

У горадзе пракладвалі трасу газаправода, а перад тым будаўнікі выклікалі археолагаў — гэта звычайная практыка, калі населены пункт неабследаваны або абследаваны недастаткова. З Расонамі, паводле слоў навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук Марата Клімава, сітуацыя склалася ўвогуле дзіўная: у раёне археалагічныя помнікі розных эпох навукоўцамі вывучаліся, пачынаючы з 60-х гадоў, а сам гарадскі пасёлак не трапляў у поле зроку ніводнага разу. А ўзрост Расонаў вызначылі згодна з першым упамінаннем у пісьмовых крыніцах — у «Полацкай рэвізіі» 1552 года, апісаннем усіх населеных пунктаў, якія існавалі на Полаччыне ў той час.

— Падчас мэтанакіраванага абследавання быў выяўлены вялікі культурны слой, які назапашваецца стагоддзямі і сведчыць аб жыццядзейнасці людзей, — узгадвае Марат Клімаў. — Знайшлі мы ў асноўным керамічны посуд XVI—XVIII стагоддзяў (у гэты час паселішча актыўна развівалася), а потым... фрагменты посуду X—XII стагоддзяў.

Атрымліваецца, што Расоны прыкладна на 500 гадоў старэйшыя, чым лічылася раней: таўшчыня культурнага слоя дасягае 60-70 см, значыць, населены пункт існаваў на гэтым месцы даволі працяглы час. Прычым месца, дзе былі выяўлены знаходкі — на беразе возера — практычна супадае з цяперашнім цэнтрам Расонаў. Частку матэрыялаў зараз больш дэталёва вывучаюць спецыялісты, частка папоўніць экспазіцыю раённага музея.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАРЦЕСЯ НА ЗДАРОЎЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаспадар гандлёвага пункта рамеснік Андрэй Віктарчык заняўся венікамі нездарма. Былы трэнер па боксе, любіў, як і ўсе яго таварышы па камандзе, папарыцца пасля трэніровак у лазні, а пасля ў арміі яго прыхільнасць да лазні ўбачылі і назначылі начальнікам лазні. «Відаць, лазні — мой лёс, — смяецца Андрэй Мікалаевіч. — Я ўвогуле ў жыцці раблю толькі тое, што мне падабаецца». А гэта і без слоў зразумела. Такое можна прыдумаць толькі тады, калі з любоўю да занятку ставішся. Колькі выдумкі ў здавалася б такой простай рэчы, як венікі! Дык не, калі ласка, на выбар: бярозавы або дубовы з палыном, або з календулай, або з рамонкам. Можна аматарам папарыцца зрабіць падарунак — такі варыянт таксама прадугледжаны: венікі акуратна ўпакаваны ў дэкаратыўную багата расшытую дзяружку — і прыгожа, і надзейна, ні адзін лісцік не ўпадзе.

Здавалася б, ну што яшчэ можна прыдумаць у такім немудрагелістым занятку? Аказваецца, можна, у майго суразмоўцы ідэі нараджаюцца адна за адной. Калі ласка, на наступны сезон (тайну сваю камерцыйную ён не пабаяўся адкрыць) ён ужо задумаў венікі, засоленыя ў вакуумнай упакоўцы. Вядома, што соль добра ачышчае скуру, павялічвае потавыдзяленне, і вось такія засоленыя венікі будуць гатовыя да выкарыстання, іх не трэба будзе распарваць у гарачай вадзе, трэба толькі дастаць з упакоўкі, спаласнуць пад халоднай вадой — і парся на здароўе, лісце ўжо насычана соллю. А вядомы выраз «гэта табе не венікі вязаць» — зусім, маўляў, проста, не адпавядае таму, чым займаецца Андрэй Мікалаевіч. Таму што тут таксама не ўсё проста. Калі я даведалася, што Андрэй Мікалаевіч сам і венікаў нарыхтаваў на ўвесь год (а нарыхтоўкай займаўся ў чэрвені—ліпені), не магла паверыць, што іх так многа, што хопіць на ўсіх ахвотнікаў. Аказваецца, ён прыдумаў спецыяльнае прыстасаванне, з дапамогай якога за дзень вяжа па 300 венікаў — і ўсе яны атрымліваюцца стандартныя, роўныя. А адна з прыдумак з'явілася ўжо прама тут, на рынку — наведвальнікі падказалі: яны прыцэньваліся да ўпрыгожанага плятнём прылаўка і прасілі прадаць, вось ён і задумаў яшчэ адзін напрамак сваёй дзейнасці — вырабляць на заказ дэкаратыўныя плятні для дачных участкаў, цяпер гэта стала моднай дэталлю дызайнерскага афармлення.

Пра карысць лазні мой суразмоўца расказвае пераканаўча, бо прачытаў шмат літаратуры і мае багаты ўласны вопыт. Гаворыць, што цяпер ва ўсім свеце цікавасць з'явілася менавіта да рускай лазні, таму што ўсе азадачаны праблемай пахудзення, а лепш за ўсё рэгуляваць вагу можна менавіта з дапамогай парылкі і веніка. А яшчэ гэта працэдура садзейнічае вывядзенню шлакаў з арганізма. Дарэчы, гэты бізнэс яму падказалі яго сябры, якія эмігравалі за мяжу. Гэта яны прасілі яго прысылаць у падарунак венікі. Іх ацаніла і наша беларуская каманда па спартыўнай саўне.

Яго захапленне лазняй падтрымлівае і сям'я: жонка Валянціна Лойка, прафесійны мастак, і дачка Валерыя, студэнтка мастацкага каледжа. У іх сям'і традыцыя — лазня кожны тыдзень.

Парыцца ў лазні ён раіць і чытачам нашай газеты і паведамляе, што яго венікі каштуюць 3,5—4 тысячы, што значна танней, чым у гандляроў венікамі каля лазняў.

Настасся ВАСІЛЬЕВА.

Магілёву падарылі Баха

Нямецкі горад Айзенах падарыў абласному цэнтру бюст Іагана Себасцьяна Баха. Яго ўсталявалі на пешаходнай вуліцы Ленінскай у абласным цэнтры і ўрачыста адкрылі ў суботу.

Сувязі паміж Магілёвам і Айзенахам пачыналіся з супрацоўніцтва ў стварэнні Тэхналагічнага парка для падтрымкі малога бізнэсу. А 11 гадоў таму беларускі і нямецкі гарады сталі пабрацімамі.

Айзенах вядомы як радзіма Баха, і для яго жыхароў гэта вялікая гордасць. Разам з тым госці з Германіі маюць вялікае ўражанне ад музычных традыцый Беларусі.

«Музыка аб'ядноўвае людзей», — сказаў на адкрыцці бюста кампазітара обер-бургамістр Айзенаха Маціяс Дот. Эканамічнае і культурнае супрацоўніцтва з Магілёвам ён лічыць за прыклад таго, як розныя па менталітэту народы аб'ядноўваюцца. Немец заклікаў беларусаў забыцца на ўсё дрэннае, што было ў мінулым, адкрыта ставіцца адзін да аднаго і глядзець у будучыню.

Бюст Баха ўсталяваны побач з музычным вучылішчам. Маціяс Дот паведаміў моладзі, што нямецкі бок штогод на працягу трох гадоў будзе запрашаць на практыку па два студэнты музвучылішча. Маладыя музыкі атрымаюць магчымасць не толькі вучыцца, але і граць на інструментах эпохі Баха.

Дом-музей Баха прапанаваў магіляўчанам выставу пра жыццё і творчасць вялікага кампазітара, дзе ёсць факсімільныя копіі нотных сшыткаў, лістоў а таксама цікавыя рэчы эпохі Баха — напрыклад, люлька (Бах, між іншым, вельмі любіў курыць), блок-флейта і нават кубак.

Ілона ІВАНОВА.

Старшыню прапанавана звольніць

Старшыня Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір Лакамы павінен быць вызвалены ад займаемай пасады за тое, што на Браслаўшчыне высветлены шматлікія і злосныя парушэнні пры выдзяленні зямельных участкаў ля вадаёмаў. Такое рашэнне прынялі падчас сумеснай калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці і пракуратуры рэгіёна.

«Звязда» ўжо друкавала артыкул на гэтую тэму. І вось вынікі праверкі па пытанню захавання заканадаўства пры выдзяленні зямельных участкаў на тэрыторыях у межах 500 метраў, што прылягаюць да рэчышчаў і акваторый вадаёмаў, збудавання на іх будынкаў, абмеркаваны на калегіі. З вінаватымі чыноўнікамі, якія былі туды запрошаны, не цырымоніліся. У рабоце калегіі ўзялі ўдзел намеснікі кіраўнікоў рэспубліканскага Камітэта дзяржкантролю і генеральнай пракуратуры.

Іх і не толькі, мякка кажучы, здзівілі факты «бязмежных парушэнняў» у Браслаўскім раёне. Вось, напрыклад, устаноўлена, што намеснік старшыні райвыканкама па эканоміцы Ванда Туронак у 2005—2006 гадах атрымала і аформіла ў прыватную ўласнасць на сябе, грамадзянскага мужа і зяця тры зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў. Апошнія два ўчасткі, выдзеленыя з парушэннем заканадаўства ў прыбярэжнай паласе возера Струста, у далейшым былі прададзены жыхарам Мінска па цане за кожны (згодна з дамовай куплі-продажу) 1 мільён рублёў. Далей цытата з афіцыйных вынікаў праверкі: «У той жа час згодна з атрыманым у ходзе праверкі тлумачэннем пакупнікоў за кожны ўчастак было перададзена па 10 млн рублёў. Устаноўлена, што Туронак В.А. уласнаручна былі падпісаны заявы на выдзяленне ўсіх трох участкаў і атрыманы дакументы пасля іх дзяржаўнай рэгістрацыі. У цэлым вынікамі праверкі пацвярджаецца, што Туронак В.А. у парушэнне патрабаванняў артыкула 22 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» скарыстала службовае становішча пры ажыццяўленні дзеянняў па набыццю ў прыватную ўласнасць зямельных участкаў»...

Старшыня Браслаўскага райвыканкама, калі адказваў на пытанні ўдзельнікаў пасяджэння калегіі, толькі адзначаў, што нічога не ведаў пра дзеянні сваёй падначаленай. Не змог ён канкрэтна растлумачыць, чаму не выкананы ў поўным аб'ёме тры прадстаўленні, унесеныя пракуратурай раёна ў 2005—2007 гадах. Больш за тое, з мэтай легалізацыі парушэнняў райвыканкамам праводзілася карэкціроўка прыбярэжнай паласы.

Не ўтульна адчуваў сябе на пасяджэнні і намеснік старшыні Браслаўскага райвыканкама Міхаіл Малаток. «Чаму Вы, як старшыня камісіі па выбару зямельных участкаў для будаўніцтва, не прытрымліваліся законнасці, калі падпісвалі акты аб выбары ўчасткаў?» — цікавіліся ў яго. Зразумелага адказу прысутныя не пачулі. Пракуратура Віцебскай вобласці будзе правяраць факты парушэнняў адказнымі асобамі заканадаўства.

Намеснік генеральнага пракурора Беларусі Аляксандр Іваноўскі, адказваючы на пытанні журналістаў, адзначыў, што вінаватыя чыноўнікі павінны быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці: «Выяўленых фактаў дастаткова, каб пачаць праверку». Больш за тое, ён дадаў: «Адказныя асобы, калі будаўніцтва дамоў вялося з парушэннем заканадаўства, будуць кампенсаваць выдаткі...»

У Міёрскім раёне праверкай былі выяўлены 10 самавольна пабудаваных аб'ектаў, якія трэба было разбурыць. Пракурор раёна афіцыйна папярэдзіў пра гэта старшыню райвыканкама. Але ж зрабіць усё неабходнае ў поўным аб'ёме ў раёне не спяшаюцца. На калегіі вырашылі, што трэба прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасці старшыню райвыканкама. І кіраўніка Полацкага райвыканкама таксама. Тут, у ліку іншага, высветлілі: на землях дзяржаўнага ляснога фонду самавольна агарадзілі 1,6 гектара лесу. За агароджай стаіць 2-павярховы дом. Ёсць і альтанка, нават пірс. Устаноўлена, што жыве тут... 84-гадовая бабулька. Зараз ужо знесена агароджа, а вось дом застаўся на сваім месцы. Пададзена заява ў суд: маўляў, жыць бабульцы няма дзе...

Усяго па выніках праверкі на Віцебшчыне выяўлены 509 фактаў самавольнага заняцця зямельных участкаў, у тым ліку 173 — у прыбярэжных палосах. Выяўлены 533 незаконна пабудаваныя аб'екты.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСМІХНЁМСЯ!

— Што ў цябе новага з Васем, дачушка?

— Спрачаемся па дробязях.

— Па якіх?

— Я хачу быць на вяселлі ў белай адкрытай сукенцы з дэкальтэ, а ён наогул жаніцца не хоча...

☺

Новай двухтомнай кнігай закончылася спроба Дар'і Данцовай распісаць аўтаручку.

☺

— Якія тры словы любіць акула?

— Чалавек за бортам!

☺

Ляжу неяк на канапе, чытаю газету, адным вокам гляджу футбол па тэлевізары, п'ю піва, ем чыпсы, гуляю нагой з сабакам — і тут заходзіць жонка і пачынае крычаць, што я нічога не раблю!

☺

З дыялогаў у Інтэрнэце:

Ён: Любіш спорт?

Яна: Ну так, ёсць трохі. 2 гады на танцах, 3 гады ў басейне, крыху менш за год у цяжкай атлетыцы, 3 гады ў музычнай школе!

Ён: Колькі разоў кантрабас ад грудзей выціскаеш? :)

Трымайце фортку зачыненай!

Некаторыя зладзеі валодаюць такой мініяцюрнай фігурай, што без цяжкасці трапляюць у кватэру праз фортку.

Так, супрацоўнікі міліцыі прыйшлі да высновы, што ў кватэру ў доме № 35 на вуліцы Адоеўскага зламыснік пранік менавіта такім чынам. Здабычай дамушніка сталі тры залатыя ўпрыгажэнні, два камп'ютарныя маніторы, DVD-плеер і фотаапарат. Крадзяжы праз форткі — з'ява не такая ўжо рэдкая. Кожны тыдзень у Мінску іх рэгіструецца ў сярэднім каля дзесяці. Такім чынам зламыснікі пранікаюць у кватэры, размешчаныя як на першых паверхах, так і на апошніх.

Кацярына ГУСЕВА, «Мінск-Навіны».

Здарэнні

У ВЫНІКУ ДТЗ ЗГАРЭЛА МАШЫНА

53-гадовы жыхар Мінска ехаў на аўтамабілі «Фольксваген-Гольф» па дарозе Мінск—Віцебск і ля вёскі Зялёнка ў Лепельскім раёне сутыкнуўся з «Форд-Сіера». А ўсё таму, што на скрыжаванні дарог не уступіў дарогу. Як адзначылі ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, у выніку ДТЗ «Форд», якім кіраваў беспрацоўны жыхар Лепельшчыны, загарэўся, і агонь поўнасцю знішчыў машыну. Ніхто з кіроўцаў не пацярпеў.

СНАРАДЫ Ў ЛЯСНЫМ МАСІВЕ

Недалёка ад вёскі Копці, што пад Віцебскам, знайшлі больш за 40 мінамётных мін рознага калібру, амаль 100 артылерыйскіх снарадаў, 36 ручных гранат... Усяго ў зямлі ляжалі каля 180 выбухованебяспечных прадметаў часоў Вялікай Айчынай вайны. Група размініравання ўсё гэта вывезла і знішчыла. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МАЛАТОК РАССУДЗІЎ

Трыццацігадовы жыхар в. Люсіна пасварыўся са сваім цесцем і падчас разборкі стукнуў таго малатком па галаве. Тры дні ў Ганцавіцкай бальніцы змагаліся за жыццё 56-гадовага мужчыны, але выратаваць яго не ўдалося. Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

36,6°

З капустай раку не дапусцім

Славу эфектыўных проціракавых сродкаў заслужылі такія мікраэлементы, як сера і селен. Тэрапія з прымяненнем прадуктаў і прэпаратаў, узбагачаных серай і селенам, лічыцца сёння адным з самых перспектыўных метадаў барацьбы з развіццём злаякасных пухлін. Аднак наўрад ці будзе дастаткова толькі ўжываць прадукты, багатыя на мікраэлементы — арэхі, садавіну, агародніну, серу і селен давядзецца прымаць у выглядзе біялагічна актыўных дабавак.

Лекавыя сродкі на аснове лісця брусніц, мелісы, насення гарбуза, шалфея і многіх іншых здымаюць болевыя прыступы і лечаць сэксуальныя расстройствы ў мужчын, сцвярджае народная медыцына. У любым выпадку фітатэрапію не варта скідваць з рахунку.

Дзякуючы ўнікальнаму набору харчовых рэчываў, вітамінаў і мікраэлементаў, капуста — самая што ні ёсць традыцыйная гародніна, эфектыўна прымяняецца ў народнай медыцыне ў лячэнні хвароб скуры, страўнікава-кішачнага тракту, печані, органаў дыхання, суставаў і многіх іншых хвароб, у тым ліку з мэтай прафілактыкі анкалогіі.

Эфектыўна раствараць і выводзіць камяні з мачавога пузыра — дзякуючы такой унікальнай вартасці звычайная морква стала адным з любімых сродкаў нетрадыцыйнай медыцыны. Морква не толькі аднаўляе мінеральную і вітамінную раўнавагу арганізма, але і дапамагае змагацца нават з бясплоднасцю, імпатэнцыяй, захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы і цукровым дыябетам. Багатае ўтрыманне бэта-караціну, фітанцыдаў і іншых карысных рэчываў робіць моркву незаменным сродкам у прафілактыцы і лячэнні раку і іншых хвароб, звязаных з аслабленнем імуннай сістэмы.

Большасць навакольных раслін пастаянна вылучаюць у атмасферу лятучыя фітанцыды — спецыяльныя рэчывы, якія вынішчаюць розныя бактэрыі і вірусы. Спіс раслін, здольных дарыць здароўе, даволі працяглы, але мы назавём хоць бы некаторыя з іх — цыбуля, часнок, хрэн, бручка, клубніцы, капуста, тамат.

Свежыя памідоры ўтрымліваюць калій, магній, жалеза, цынк, кальцый, фосфар, вялікую колькасць арганічных кіслот, вітаміны групы В, але больш за ўсё ў іх вітаміну С. Рэчыва лікапін з'яўляецца моцным прыродным антыаксідантам, які пераўзыходзіць такіх лаўцоў свабодных радыкалаў, як вітаміны С і Е. Дзякуючы сератаніну і тыраміну памідоры паляпшаюць настрой і перамагаюць стрэс.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

аўта аматар

Аўтаадказчык

ПАРУШЭННЕ І ПАКАРАННЕ

За парушэнне хуткаснага рэжыму супрацоўнік дарожна-патрульнай службы аштрафаваў мяне на 124 тысячы рублёў. Я прызнаў сваю віну і быў згодзен «разлічыцца за свой грэх» на месцы, але міліцыянер адмовіўся прымаць аплату: склаў пратакол і выдаў копію пастановы з рэквізітамі банка. Няўжо нельга было мяне аштрафаваць на месцы?

Аркадзь РОЎБА, *Смалявічы*

Сапраўды, нельга. Паводле новага Адміністрацыйнага кодэкса, які, нагадаю, дзейнічае з сакавіка гэтага года, аплаціць штраф на месцы парушэння Правілаў дарожнага руху можна толькі ў тых выпадках, калі яго памер не перавышае 2 базавых велічынь (62 тыс. рублёў). У такіх выпадках, дарэчы, супрацоўнік ДАІ не складае адміністрацыйны пратакол. А вось, калі парушэнне ПДР «цягне» на большыя штрафныя санкцыі, то наяўныя грошы «даішнік» не мае права браць. Ён толькі складае пратакол і выдае парушальніку копію пастановы з рэквізітамі банка, дзе неабходна аплаціць штраф. Парушальнік часова пазбаўляецца вадзіцельскага пасведчання. Забраць гэты дакумент можна толькі пасля аплаты штрафу, прад'явіўшы супрацоўніку ДАІ адпаведны квіток. На выплату штрафных санкцый і прад'яўленне квітка аб аплаце ў ДАІ парушальніку адводзіцца 30 дзён. Калі за гэты час ён не паспее разлічыцца за «свае грахі», то давядзецца мець справу з судовымі выканаўцамі, якія будуць у прымусовым парадку спаганяць штраф.

Аўтабяспека

ПРАПУСЦІЦЕ «ХУТКУЮ»!

19 вадзіцеляў былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за стварэнне перашкоды руху машынам хуткай дапамогі.

Такія вынікі спецыяльнага рэйду, праведзенага днямі супрацоўнікамі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі. Некаторыя вадзіцелі наўмысна перашкаджалі праезду «хуткай», іншыя «гора-кіроўцы», як высветлілася, увогуле не ведалі, што трэба саступаць дарогу спецаўтамабілю, калі ён рухаецца з уключанымі проблескавымі маячкамі сіняга колеру.

Між іншым падобнае невуцтва і хамства мае падчас вельмі сумныя наступствы. Толькі ў Мінску, па звестках ДАІ, сёлета адбылося 4 аварыі, у выніку якіх машыны хуткай дапамогі перакуліліся. Праўда, абышлося без ахвяраў. Затое для хворых, як вядома, прамаруджванне «хуткай» да смерці падобна.

Дарэчы, несвядомым вадзіцелям варта памятаць, што за стварэнне перашкоды руху не толькі для «хуткай», але і для іншых спецыяльных транспартных сродкаў, прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 10 базавых велічынь. Пры ўтварэнні аварыйных сітуацый памер штрафу ўзрасце ад 10 да 20 «базавых».

«МАРШРУТНЫ» НЕПАРАДАК

Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, за 8 месяцаў гэтага года адбылося 89 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам вадзіцеляў маршрутных таксі. У выніку гэтых ДТЗ 12 чалавек загінулі і 113 — паранены. Непасрэдна па віне вадзіцеляў «маршрутак» здарылася 28 аварый, у якіх загінулі 3 чалавекі і 23 атрымаўлі траўмы.

Аўтапарк

МАШЫНЫ І МІНЧАНЕ

Паводле звестак упраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, за 8 месяцаў гэтага года ў сталіцы зарэгістравана больш за 30 тысяч аўтамабіляў. Для параўнання, летась за ўвесь год на ўлік было пастаўлена 33 тысячы машын. Прычым, той год быў рэкордным. Няма сумнення, што сёлета «аўтарэкорд» будзе «пабіты». Усяго ж зараз у Мінску зарэгістравана 580 тысяч аўтамабіляў.

Аўтапрам

ІДЭАЛЬНАЯ ЖАНОЧАЯ МАШЫНА

Кітайскі аўтавытворца «Shanghai Maple» вырашыў наладзіць выраб машын выключна для жанчын. Маркетолагі прадпрыемства прыйшлі да высновы, што жанчын больш за ўсё цікавіць дызайн аўтамабіля, яго колер і наяўнасць розных скрынак. Таму аўто для жанчын будуць фарбавацца ў іх любімыя колеры: жоўты, чырвоны, ружовы, зялёны, аранжавы, сіні і белы. У жаночай машыне таксама будзе скрынка для сурвэтак, для грашовай дробязі, дзіцячае крэсла, вешалка для адзення, а ў дзверцах — спецыяльная ніша для пантофляў.

Аўтадаследаванне

СОННАЕ ЦАРСТВА НА ДАРОЗЕ

Кожны чацвёрты нямецкі вадзіцель кіруе аўтамабілем у стане моцнай стомленасці.

Да такой высновы прыйшлі даследчыкі-афтальмолагі з Цюбінгенскага ўніверсітэта, якія пратэсціравалі 63 выпадкова выбраных вадзіцеляў-добраахвотнікаў. Некаторыя з «паддоследных» былі настолькі стомленыя, што заснулі падчас тэстаў.

Аўтакур'ёз

УСЕ З-ЗА АДНАГО

У японскім горадзе Осака арыштавана гаспадыня піўнога бара, якая прадала піва вадзіцелю аўтамабіля. Паліцыя высветліла, што жанчына рэалізавала вадзіцелю некалькі куфляў бурштынавага напою, хоць ён і паведаміў, што збіраецца ехаць дамоў за рулём аўтамабіля.

Дарэчы, крыху больш за тыдзень таму ў Японіі ўступіла ў сілу новае антыалкагольнае заканадаўства, якое прадугледжвае вельмі жорсткія меры пакарання за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане. Больш таго, паліцыя мае права прыцягваць да адказнасці і пасажыраў, якія селі ў салон разам з п'яным вадзіцелем: памер штрафу дасягае 3 тысяч долараў. Выключэння няма нават для пасажыраў маршрутных і турыстычных аўтобусаў.

Аўтажарт

Учора на скрыжаванні двух маскоўскіх вуліц сутыкнуліся дзве «крутыя» іншамаркі. Вадзіцелі і пасажыры абодвух аўтамабіляў атрымалі лёгкія агнястрэльныя раненні.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.376 Індэкс 63850. Зак. № 5239. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12